Занатоўкі кантрабандыста

Віктар Сазонаў

# Занатоўкі кантрабандыста

або аповеды
Сымона Нальшанскага

Праграмная рада Тыднёвіка „Ніва”
Беласток 2005

Мастацкі рэдактар
Аляксандр Максімюк

Падборка тэкстаў і рэдакцыя
Яўген Вапа

Карэктура
Аляксандр Вярбіцкі
Віталь Луба
Уладзімір Хільмановіч

Wydanie zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

ISBN 83-917349-3-4

Copyright © 2005 by Rada Programowa Tygodnika „Niwa”

Друкарня
„Offset-Print”, ul. Broniewskiego 14, Białystok



# Ад аўтара

*Смех я падняў на ўзровень святыняў,*
*Вы, вялікія гэтага свету,*
*А паспрабуйце смяяцца.*
*(так казаў Заратустра)*

Час — адзінае, над чым ніколі не будзе ўладарыць чалавек. Ён цячэ ў прасторы па сваіх, невядомых нам законах, і ніхто не можа вярнуць яго назад. Ні адзін чалавек не здольны патрапіць ні ў мінулае, ні ў будучыню. Хіба толькі ў марах, або ўспамінах.

Канец васьмідзесятых і пачатак дзевяностых гадоў дваццатага стагоддзя для беларусаў прынёс вялікія змены. Разваліўся Савецкі Саюз, Рэспубліка Беларусь стала незалежнай суверэннай Дзяржавай. Адчыніліся яшчэ нядаўна замкнутыя на сем замкоў межы. Знік страх. Паветра напоўнілася вольнасцю, рамантызмам і надзеямі. Узнікла невядомае дагэтуль заманлівае пачуццё — ты можаш нешта зрабіць сам, нават здольны змяніць сваё жыццё. І не толькі сваё... Такі прыйшоў час.

Для гродзенцаў, якія жывуць у непасрэднай блізкасці з заходняй мяжой, гэты час прынёс і свае эканамічныя перспектывы. Многія людзі марылі адчыніць фірмы, стаць бізнесоўцамі, будаваць будучыню сабе, сваім дзецям і сваёй Краіне. Пошук першапачатковага капіталу прымусіў

іх ехаць на захад, за мяжу. Штосьці прадаць, штосьці набыць. Толькі потым яны даведаліся, што іх называюць кантрабандыстамі. А яшчэ пазней сталі так называць самі сябе, укладаючы ў гэтае слова толькі добры сэнс. Сэнс, за якім стаіць рызыка, руплівасць, працавітасць і адвага. Рысы, здаўна ўласцівыя беларусам. І ў віры тагачаснага жыцця, ходзячы на дзяржаўную працу і супрацьдзяржаўныя мітынгі, займаючыся хатняй гаспадаркай і палітыкай, людзі спрабавалі зрэалізаваць і свае эканамічныя мары. І не тое, што ім так моцна хацелася разбагацець — хацелася проста быць фінансава незалежнымі. І не самае галоўнае, што на Захадзе іх тавар куплялі. Проста хацелася ўбачыць гэты Захад. Маладыя, загарэлыя, працавітыя, адважныя і рамантычныя хлопцы паехалі ўбачыць свет. Гэта быў іх час.

Амаль штомесячныя змены мытных правілаў змушалі людзей не звяртаць на іх увагі. Чалавек быў упэўнены, што, перавёзшы нелегальна праз мяжу тое, што забаранялася сёння, але было можна ўчора і будзе дазволена заўтра, ён нікому не робіць шкоды. Галоўнае — не парушаць агульнапрызнаных нормаў чалавечнасці. Людзі ў гэта верылі. Такі быў час.

Час змяніўся. Другая палова дзевяностых гадоў разбурыла мары гэтых людзей, памяняла іх погляды. Нелегальным перавозам тавару праз мяжу сталі займацца буйныя фірмы. Часцей расійскія. Для беларускага кантрабандыста ў гэтым „бізнесе” не засталося месца. Але, калі час ад часу заходзіш у шапік да старога знаёмага, які зараз ужо не ездзіць за мяжу з гарэлкай, а працуе дробным прадпрымальнікам, або перасякаеш мяжу ў машыне былога кантрабандыста і чуеш з яго вуснаў вясёлы аповед тых часоў, задумваешся — які гэта быў час, бо пра другую палову дзевяностых гадоў „кантрабандысты” расказваюць толькі сумнае. А пра першую... Хіба было б няправільна не занатаваць тыя аповеды і не паспрабаваць зафіксаваць у творчасці той час.

# Хабар для паліцыянтаў

На пачатку дзевяностых гадоў польскі ўрад нарэшце зразумеў эканамічную мэтнасць абароны свайго рынку. Ён забараніў масава ўвозіць на сваю тэрыторыю спірт і цыгарэты, а таксама вывозіць адтуль валюту. Беларускія разумнікі адрэагавалі „адэкватна” і зрабілі тое ж самае з дакладнасцю наадварот. Дыпламаваныя эканамісты з міністэрстваў забаранілі вывозіць з Беларусі спірт і прывозіць да нас валюту. Недыпламаваная грамадскасць была ў шоку. І не толькі ад таго, што прападаў іх асабісты, набываемы цяжкім потам ад нелегальнага гандлю законны заробак. Вельмі было крыўдна за дзяржаву.

Простага мытніка, які трос торбы кантрабандыстаў, зразумець было можна. Яму пасля цяжкой працы, як і ўсім нармальным людзям, таксама хацелася зняць фуражку, дый жахнуць пляшку. А гледзячы на аб'ёмы спіртнога, якое перацягвалі суайчыннікі за мяжу, ён баяўся, што да канца ягонай змены вывезуць усё, і давядзецца класціся спаць цвярозым. А вось у чым была логіка дзядзькоў з міністэрстваў, па сённяшні дзень вялікая таямніца.

Здавалася, што польскі рынак стаў самым абароненым у свеце. Пра яго дбалі як палякі, так і беларусы. Праца кантрабандыста стала як ніколі цяжкой, жыццё невыносным.

Гэтая кепская навіна заспела нас на гайнаўскім рынку. Мой калега быў у адчаі. Напіўся спірту, як травеньскі кот валяр'янкі, і ні з кім не хацеў размаўляць. Чалавек ён быў надзвычай скупы. Галоўным яго заняткам было па сто разоў пералічваць нагандляваныя златоўкі. Я яму за гэта даў мянушку Гольдэн, спалучыўшы ангельскае слова gold (золата), з беларускім голь. Гольдэн сваёй мянушкай вельмі ганарыўся, бо не ведаў крыніцаў яе паходжання. Ён, як чалавек практычны, добра ўцяміў, што на адзін заробак пражыць цяжка. Таму акрамя асноўнай працы, гандлю спіртам, падпрацоўваў яшчэ кантрабандай цыгарэтаў „Гольдэн Амерыкан". З таго і лічыў, што мянушка да яго прыклеілася па „прафесійнай" прыкмеце. Мяне гэта вельмі цешыла.

Працверазеўшы, Гольдэн заявіў, што нам трэба ў гэтых цяжкіх умовах мяняць кваліфікацыю і прапанаваў, каб не рызыкаваць на мяжы, скупляць спірт з цягніка ў Кузніцы, ды валачы яго на яшчэ не „абжытыя" польскія тэрыторыі. Там ён значна даражэйшы. Я пагадзіўся, бо каб у мяне на мяжы сканфіскавалі бутэльку спірту, то я з тае бяды выпіў бы ўвесь астатні. А ён мог бы і рукі на сябе накласці.

Маю машыну ласкава называлі „жабай". Яна была зялёнай і ад цяжару наладаванага ў ёй спірту заўсёды паўзла трыбухом па асфальце. На гэты раз „жаба" цягнулася ў бок Астралэнкі. Цямнела. Мы, аб'ехаўшы лясны шлагбаум, і збіўшы бамперам знак, які забараняў уезд у лес, скіраваліся на паляну пераначаваць. Замаскаваўшы машыну гальлём, мы распалілі невялічкі агеньчык і адкаркавалі першую літроўку спірту. Ноч была цёплая, ласкавая, як вясковая печ. Спірту ў бутэльцы ўсё меншала. Агеньчык разгараўся і непрыкметна вырас вышэй лесу. Я неяк стараўся давесці свайму кампаньёну, што ў такой сушы можа загарэцца лес. Але ён пярэчыў, сказаўшы, што за дровы плаціць не трэба, а вогнішча ў разе чаго спецыяльныя службы патушаць з неба шрубалётамі.

Усё было б добра, каб праз нейкі час за плячамі Гольдэна не выраслі з цемры дзве постаці ў мундзірах польскай паліцыі. Адна постаць нагадвала доктара Уотсана, але паводзіла сябе як Шэрлак Холмс. Другая таксама мела падабенства з Уотсанам, але на лаўры Холмса не прэтэндавала. Я пастараўся папярэдзіць кампаньёна, што да нас падыходзяць паліцыянты. Але ён, думаючы, што я жартую, гучна крыкнуў:

— Пердоліў я фшысткіх паліцыянтаў!

— Каго пан пердоліў?! — зароў першы Уотсан і дастаў пісталет.

Гольдэн падскочыў як апечаны. Першая думка, якая прыйшла ў п’яную галаву, нашэптвала яму, што нас пакараюць за злоўжыванне алкаголем. Што зробіш — савецкае выхаванне. Ён хапіў на вачах аслупянелых паліцыянтаў недапітую бутэльку і шпурлянуў  яе ў кусты, пры гэтым цвёрда заявіўшы, што мы не п’ем.

— То можа вы і вогнішча не паліце? — закрычаў паліцыянт. — Ваш агонь бачны нават з Балтыйскага мора. А ў нас не толькі агонь паліць, у лес заходзіць нельга.

— Ну, знайшлі праблему, — пастараўся аджартавацца я. — Упэўнены, што балтыйскі флот мае добрых лоцманаў, якія ніколі не зблытаюць наш агеньчык з маяком і не адхіляцца ад курсу.

Уотсаны жарту не зразумелі і мне, каб не зацягваць канфлікт,  давялося перайсці да канкрэтыкі.

— Мы з калегам трохі грошай угандлявалі, хочам падзяліцца з вамі, — і я палез у кішэнь.

— Ты што, нам хабар прапаноўваеш?!

— Не маю іншага выйсця! — развёў рукамі я.

— Я таксама, — ажывіўся другі Уотсан, схаваў пісталет і стаў лічыць мае грошы.

Вочы ў паліцыянтаў загарэліся ярчэй нашага вогнішча. Праўда, яны падкрэслілі, што гэта толькі першая залічка, а канчатковую суму скажуць, як праверац што ў нас у машыне.

Ні ў якім разе нельга было, каб да гэтага дайшло. Там жа, роўненька як снарады, бутэлечка ў бутэлечку быў складзены спірт. Я з усяе сілы павярнуў ключ багажніка ў адваротны бок і наўмысна зламаў яго.

— Ну вось, — кажу, — цяпер машыну не адчыніць. Можа, пакуль я адрамантую замок, вы трохі з намі вып'еце.

— Хіба толькі каб праверыць, што за паскудства вы нам возіце.

„Паскудства" Уотсанам прыйшлося вельмі даспадобы. Пасля першага ж кілішка яны бліжэй падселі да вогнішча і сталі нахвальваць нашае сала, хоць елі толькі каўбасу. Пасля трэцяй чаркі яны ўжо дапамагалі нам збіраць дровы для вогнішча, якое разгарэлася яшчэ больш. Але спірт, які Гольдэн дастаў з кустоў, нечакана для ўсіх, скончыўся хутка. Паліцыянты хітра глянулі на мяне і засумняваліся, што гэта была апошняя бутэлька. Я дастаў другі ключ і падняў крышку багажніку. Бутэлечкі ў святле вогнішча заблішчалі ўсімі колерамі вясёлкі. Адзін з паліцыянтаў выдыхнуў: „О, курча!". Другі выкрыкнуў тое самае, толькі замяніў апошнія літары „ча" на „ва".

Як спірт ужо не лез у горла, вясёлыя Уотсаны, шчыра расцалаваўшы нас на развітанне, пайшлі ў гушчар шукаць сваю машыну. Але не паспелі мы паверыць, што ўсё няблага скончылася, як адзін з іх вярнуўся.

— Паліцыянты хабар не бяруць, — ганарова заявіў ён, сунуў назад нашыя грошы і то галавой, то тулавам спрабуючы на трываласць сосны, знік у цемры. А мы ракам папаўзлі да машыны па чарговую бутэльку, каб адсвяткаваць нечаканы „прыбытак".

Можна сказаць, што гэтая гісторыя закончылася не так ужо і кепска, каб не адна акалічнасць. Колькі мы не начавалі пазней па лясах, Гольдэн, нават зімой, больш не распальваў вялікага вогнішча. Дровы па-ранейшаму заставаліся дармовымі, а нам даводзілася мерзнуць.

# Добры ўчынак

Было гэта якраз тады, калі Васька Садоўскі і Сяргей Манюк пастанавілі, як яны казалі самі, гуляць у адну руку. На нармальнай чалавечай мове гэта азначала, што два кантрабандысты дамовіліся перавозіць і прадаваць тавар не паасобку, а разам. Раней яны прадавалі алкаголь у адных і тых жа месцах, значыць, канкуравалі. А зараз канкурэнцыя скончылася. Ды і сілы падвоіліся.

Хлопцы, трошкі пакрывіўшы мордамі, скінуліся і купілі грузавы бус. Упаялі другое днішча, каб хаваць там ёмістасці са спіртам, зрабілі яшчэ некаторыя, непрадугледжаныя заводам-вытворцам машыны змены і рушылі ў свой першы сумесны працоўны шлях.

Кожны ведае, што першы раз вельмі важны. Па старым кантрабандысцкім забабоне лічыцца, што калі першы раз усё ідзе гладка, то далей можна чакаць поспеху. І жыхары суседняй краіны будуць піць толькі беларускі спірт з прыгожымі галандскімі наклейкамі, ды будуць лічыць яго сапраўды галандскім. І пры гэтым ім і ў галаву не стрэльне спытацца, чаму спірт з Нідэрландаў завозяць праз Польшчу ў Беларусь, а потым кантрабандным шляхам цягнуць назад у Польшчу. Праўда, у жыцці Васіля быў такі выпадак, калі падпіты паляк, які пнуў

з сябе інтэлектуала, аднойчы задаў такое пытанне. Васька, не маргнуўшы вокам, адразу адказаў, што Еўропа вельмі занепакоеная цяжкім эканамічным становішчам Беларусі і таму, каб узмацніць беларуска-польскія эканамічныя стасункі, свой спірт перапраўляе адразу ў Беларусь. А Манюк распавёў, што еўрапейцы не хочуць з-за кантрабанды спіртам сапсаваць стасункі з Польшчай. А з беларусамі, маўляў, з-за алкаголю палякі ніколі не пасварацца. Ну і, каб сапраўды пашанцавала, хлопцы прысягнулі, што калі ўсё пойдзе ўдала, то абавязкова зробяць які-небудзь добры ўчынак.

Ці то прысяга падзейнічала, ці мытнікі не звярнулі ўвагі на новую машыну, усё сапраўды пайшло як па масле. Мяжу пераехалі без непатрэбных прыгодаў і вельмі хутка.

Ад той радасці, канчаткова паверыўшы ў поспех, хлопцы пастанавілі ехаць аж у Варшаву, дзе іх вадкі тавар каштаваў шмат даражэй, чым на Беласточчыне. А тут і нагода для добрага ўчынку падвярнулася. Адразу за Саколкай, пасярод дарогі, валяўся п’яны чалавек. Ён салодка спаў, накрыўшыся старэнькім роварам і нават не здагадваўся, што яго амаль што не пераехала машына.

— Завязем яго дахаты, — радасна гаворыць Манюк.

— Ага, — пагаджаецца Садоўскі. — Зробім добры ўчынак і з лёсам разлічымся.

У кішэні п’янога знайшлі пашпарт, высветлілі, што ён жыве зусім недалёка, загрузілі яго разам з роварам ў кузаў, ды рушылі далей. Але заўсёды, калі ўсё ідзе добра, то чакай нейкай бяды. За вясёлай размовай аматары добрых учынкаў зусім забыліся пра п’янага небараку. Успомнілі толькі ў Варшаве, калі палезлі ў кузаў па спірт. Што было рабіць? Хлопцы, доўга не думаючы, дасталі п’янога, пасадзілі на лаўку, падперлі роварам і пайшлі па справах.

Праз некалькі дзён, вяртаючыся, Манюк з жахам заўважыў у бардачку пашпарт таго небаракі. Спалохаў-

шыся помсты лёсу, кантрабандысты пастанавілі вярнуць яго гаспадару. Яны заехалі ў Васількаў, знайшлі патрэбную хату і запыталі ў жанчыны, якая ўвіхалася па гаспадарцы.

— Ці можам мы ўбачыцца з панам Юзікам?

— Не, — адказвае жанчына. — Ён зараз з людзьмі не размаўляе. Некалькі дзён таму так напіўся, што сам не ведае як заехаў на ровары аж у Варшаву. Ні грошай не меў з сабой, ні знаёмых там. Давялося на ровары ехаць назад. Але самае дзіўнае, туды п'яны заехаў за адзін дзень, а назад, цвярозы, ехаў амаль тыдзень.

— Мы яго пашпарт знайшлі на дарозе, — пачаў тлумачыць Манюк. — Хочам вярнуць. А скажыце, як сябе гаспадар адчувае?

— Вялікі вам дзякуй за пашпарт, — узрадавалася гаспадыня. — Які добры ўчынак вы зрабілі. Зараз у нас усё наладжваецца. Мой алкаголік без гарэлкі ўжо жыць не мог. А зараз, пасля вяртання з Варшавы, так напалохаўся сваіх п'яных прыгодаў, што зарокся не піць зусім. Такое шчасце. І я, і дзеці нацешыцца не можам.

Ужо пераехаўшы мяжу, Манюк, пасля доўгага роздуму, цвёрда заявіў.

— Усё ж добры ўчынак мы зрабілі. Мужык піць перастаў. Уся радня цешыцца з таго. Толькі шкада, што мы згубілі патэнцыйнага кліента на наш тавар. Затое прысягу не парушылі.

# Гонар кантрабандыста

Ад гэтай прапановы Слава хацеў адмовіцца адразу. Куды гэта варта. Усяго за тыдзень перавезці праз мяжу сто пяцьдзесят літраў гарэлкі. Ды не абы-якой. Абавязкова ў шкляных бутэльках і з прыгожымі этыкеткамі. Ды яшчэ на смак добрай. Каб пілася як мёд.

— Дзе ты раней быў? — наракаў Славік на паляка, які зрабіў заказ. — Здаецца і ад бальшавікоў вы пазбавіліся, а бальшавізму з галоў так і не выбілі. Усё ў апошнюю хвіліну робіце, як тыя саветы. Як зіма, дык сена косяць.

— А што рабіць? — апраўдваўся паляк. — Дзеткі ў мяне такія. Яны цяпер хуткія ўсе сталі, як хвароба. Прыйшла дачка дахаты і пытае, ці ведаем мы, што ў яе вяселле праз тыдзень. Матка адразу самлела. А я вось лётаю як венік. Грошы пазычаю, людзей запрашаю. Прывязі ты гэтай гарэлкі таннейшай. Я табе аддзячу, на вяселле запрашу як самага пачэснага госця. Там і начальнік мясцовай паліцыі будзе, і суддзя, і солтыс. Пазнаёмішся з уладай. З такой працай як у цябе гэтыя знаёмствы не зашкодзяць.

Што праўда, то праўда, падумаў Слава і ўзяўся за работу. У Гродне яму нечакана пашанцавала. З'явіўся ней-

кі новы гандляр гарэлкай. Ды і прадаваў нядорага. Слава паглядзеў на яе. Чыстая, як слёзы святых. І на смак спадабалася. Купіў адразу ўсю партыю ды давай цягаць праз мяжу. Абы ў час паспець. І хоць гэтыя турботы яму пасавалі як кулак да вока, мажлівасць пазнаёміцца з прадстаўнікамі ўлады там, дзе ён збываў кантрабанду, пераважвала ўсе адмоўныя бакі. А іх было безліч. Як кажуць, конь не валяўся. Бяссонныя ночы, рызыка, хабар... Хіба ўсё пералічыш. Але тавар прывёз своечасова. Акурат на вяселле.

Гаспадар слова датрымаў. Прадставіў Славіка гасцям як самага пачэснага. Падкрэсліў, загадкава падміргнуўшы правым вокам, што тыя прыгожыя бутэлечкі, што стаяць на стале, гэта праца Славы. А гасцей як чорт круціў хутчэй паспрабаваць кантрабанднай вадкасці. Але як толькі яе сталі разліваць па шклянках, у Славікавай душы стала неспакойна. Неяк не так яна булькала. Ён хутчэй хапіў бутэльку, наліў сабе, паспрабаваў і збялеў. Там была вада. Звычайная, з крана, нават не падсоленая. Госці таксама ўжо яе пакаштавалі і ўсе да аднога ўтаропіліся на беларускага кантрабандыста як бараны на новы плот. У хаце сціхла нават вясельная музыка. Славік хацеў скочыць у акно, ды было позна. Моцная рука гаспадара ўжо сціскала яго горла.

— Ты, што гэта, пся крэў?! — прастагнаў той у твар пачэснаму госцю. — Здзекуешся.

— Цягні яго на вуліцу! — зараўлі госці. — Забіць гада!

Першым даў у морду солтыс. Пасля ўдару начальніка паліцыі кантрабандыст ляснуўся ў лужыну перад хатай і стаў як апошняга паратунку шукаць вачыма суддзю. А суддзя ўжо тоўк Славіка нагамі. Што пачалося! Кожны лічыў абавязкам адзначыцца на Славікавай мордзе. Нават маладая. А як спрытнаму беларусу ўдалося вырвацца, усё вяселле кінулася даганяць. Але Славіка і сабакі ўжо не дагналі б. Збіты і напалоханы ён прыляцеў на мясцовы рынак і кінуўся да сяброў-кантра-

бандыстаў. Так і так — тлумачыць ім. Падманулі з гарэлкай. І што цяпер рабіць?

У кантрабандыстаў тых часоў было вострае пачуццё гонару і сваіх прафесійных абавязкаў. Пачалі несці ўсё, што гарыць, акрамя дроў. Хто спірт, хто гарэлку, іншыя самагонку цягнулі. Далі пабітаму сябру машыну, напхалі алкаголю ў багажнік і пажадалі поспехаў.

Як Слава зноў з'явіўся каля хаты, дзе яго нядаўна амаль не забілі, усе аслупянелі. Некаторыя нават падумалі, што ён вярнуўся, каб кінуць у іх бомбу. Самы адважны быў солтыс. Ён, выставіўшы наперад круглы як гарбуз трыбух і пакручваючы пальцамі правы вус, падышоў да Славіка. А той спакойна адчыніў багажнік і хітнуў на бліскучыя бутэлькі.

— Памылка выйшла. Вось вярнуўся выправіць.

Солтыс недаверліва ўзяў адну з бутэлек, здзёр зубамі закрутку і зрабіў з гарла некалькі глыткоў.

— Добрая гарэлка, — заявіў ён праз момант прысутным і ўсё вяселле радасна залямантавала.

Пілі ўсю ноч. Кожны папрасіў у Славы прабачэння. А суддзя аж пяць разоў. Кожны лічыў за гонар выпіць з беларускім кантрабандыстам. І ўсе, а найперш начальнік мясцовай паліцыі, захапляліся тым, што беларускія кантрабандысты аж настолькі людзі гонару. Начальнік паліцыі сказаў, што Слава на яго тэрыторыі можа прадаваць усё, што толькі хоча. Суддзя публічна заявіў, што калі гэтага кантрабандыста хто прывалачэ ў суд, то ён пасадзіць таго, хто прыцягнуў. Солтыс на каленях прасіў пагасцяваць у яго колькі дзён. Ды Слава адмовіўся. Трэба, сказаў, найперш разабрацца з тымі, хто падсунуў яму тую „гарэлку".

Як сказаў, так і зрабіў, бо на тым, найперш, і палягае гонар кантрабандыста, каб сам нікога не ашукаць і не спусціць тым, хто ашукаў цябе. Шукалі тых ашуканцаў, з вадой замест гарэлкі, даволі доўга. Знайшлі іх гродзенскія кантрабандысты недзе ажно ў Расіі. Што

з імі зрабілі, казаць не буду. Але пабіты палякамі Славік выглядаў у параўнанні з імі як эстрадны спявак. Шмат каго тыя дурні ашукалі. Ды за сваё і дасталі. Гонар кантрабандыста менавіта палягае на тым, каб датрымаць сваё слова і ніколі не спусціць таму, хто яго не датрымаў.

# У кожнага свой хлеб

— Як цяжка на гэтым сабачым свеце чалавеку даецца хлеб, — развражаў ля ляснога вогнішча Сяржук. — Вы возіце ў Польшчу гарэлку ды цыгарэты, каб неяк зарабіць на сям'ю. Мытнікі вас ловяць, каб захаваць працу. Выйграе спрытнейшы ды разумнейшы.

— Ды не бывае мытніка разумнейшага за кантрабандыста, — даводзіў новаму знаёмаму Юрка. — Сам падумай. У іх працоўны дзень восем гадзінаў. А мы, каб іх „накалоць", дваццаць чатыры гадзіны думаем, як гэта зрабіць. Таму заўсёды будзем на некалькі крокаў наперадзе. Гэтыя вялікагаловыя дурні з курынымі мазгамі ніколі нас не раскусяць. У нас хлеб цяжкі і даводзіцца ўвесь час штосьці камбінаваць. А ў іх — лёгкі. Прыходзяць на працу толькі час адбыць ды атрымаць свой заробак.

— Але пры кепскай працы яе можна згубіць, — не пагаджаўся Сяржук. — Яны маюць свае планы, павышэнні па службе за добрую работу, прэміі. Там таксама даводзіцца круціцца. Кваліфікацыя мытніка залежыць ад таго, ці ведае лазейкі кантрабандыстаў. Не знойдзе кантрабанды — паляціць з працы.

Нашая бадзёрая кампанія весела рассмяялася. Ну што з яго ўзяць. Маладзенькі сціплы хлопчык, які першы

раз прыехаў у Польшчу і прывёз толькі дзве пляшкі гарэлкі. Сказаў, што больш праз мяжу не прапускаюць. Шкода яго стала. З такой працай нават на паліва не заробіць. Вось і ўзялі яго з сабой начаваць у лес. Каб навучыць таму-сяму.

У кантрабандыстаў, калі пачынаецца размова пра недасведчанасць мытнікаў, аповеды могуць цягнуцца цэлую ноч. Ну, а калі ў кампаніі смаркаты навічок, яны набываюць асаблівы каларыт. Мы Сержука так і празвалі — смаркач. Не са зла. Проста хацелася пахваліцца сваім спрытам у справе абдурвання мытнай службы. Ён у нас адразу выклікаў шчырае захапленне: вельмі хацеў усяму навучыцца, з павагай успрымаў парады, да канца выслухваў кожнага. Нават тое-сёе занатоўваў.

— Вучыся, смаркач, пакуль я жыву, — не супакойваўся Юрка. — Гэтыя таўстапузыя дзеці гарадскіх гультаёў ніколі не дадумаюцца дзе я хаваю цыгарэты.

І ён, хітра глянуўшы на новага знаёмага, адкруціў другое днішча ў сваёй машыне. Там, у адмыслова зробленых сховах, ляжала каля трыццаці блокаў „Марлбары".

Сяржук не крыўдзіўся на тое, што яго называюць смаркач. Наадварот. Быў шчыра ўсім удзячны за навуку, называў нас каралямі вынаходніцтваў, эйнштэйнамі і дактарамі кантрабандных навук.

— А зараз глянь на сапраўдны палёт думкі, — улучыўся ў размову Мікола з-пад Мастоў і адкруціў дно ў газавым балоне. — Тут у мяне змяшчаецца дзевяноста літраў разліўнога спірту. А для некаторых, надта выслужлівых правяральнікаў у мундзірах, інтэлект якіх набліжаецца да сярэдняга, я яшчэ ў сярэдзіну ўпаяў маленькі газавы балончык. На ім можна праехаць кіламетраў дваццаць. Як набліжаюся да мытні, пераключаю машыну на газ. Датчыкі паказваюць поўны балон. Машына працуе на газе. Скажы, ці дапетрыць хто-небудзь з гэтых тугадумаў, што там у мяне спірт?

Кожны хацеў чамусьці навучыць маладога калегу. Хтось паказаў як хаваць цыгарэты ў дзвярах, каб пры гэтым адчыняліся шыбы. Хтосьці распавёў як прывязваць бутэлькі да трубы пад машынай так, каб тыя не награваліся ад яе і не пачыналі страляць. Сержуку толькі не падабалася, што ўсе смяяліся з прымітыўнасці мытнікаў. Але мы гэта спісалі на ягоную маладосць. А з ранку, развітваючыся, Юрка сказаў, што цяпер поспех у працы залежыць толькі ад яго стараннасці. Усё, чаму маглі, таму навучылі.

Праз дзень я зноў выбраўся ў Польшчу. Ля самай мытні заўважыў сваіх знаёмых. Пад'ехаў да іх. Хлопцы былі злыя, як шалёныя сабакі. Спрачаліся, пляваліся, махалі рукамі. Я спытаўся, што здарылася.

— На мытню не сунься, — хмура адказаў мне Мікола. — У нас увесь тавар сканфіскавалі, усё пазнаходзілі. Нават мой газавы балон раскруцілі. А наш знаёмы Сяржук сёння хіба будзе ў рэстаране на атрыманую прэмію святкаваць павышэнне па службе. Гэта табе не жарты. За адну змену раскрыў ажно пяць кантрабандных сховаў.

Я абліўся халодным потам.

— Дык што, — пытаю, — гэты смаркач — інспектар мытні?

— Сёння ўжо інспектар, — гнеўна плюнуў на зямлю Юрка. — А яшчэ ўчора быў смаркатым стажорам, з якога ўся мытня смяялася, бо за цэлы год не змог выявіць аніводнай кантрабанды і амаль не страціў працу. Мытнікі, паміж сабой, за няўмеласць называлі яго „смаркач".

# Вясёлая забава

Ночка па ўсіх прыкметах мусіла выдацца цёплай. Расклаўшы невялічкі агеньчык, кантрабандысты, пасля цяжкой працы, валяліся на зямлі, як свінні ў балоце. Такія летнія вечары заўсёды праходзяць пад аповеды. Найцікавей, калі знаходзіцца весялун, у якога безліч цікавых гісторый. Тады ў размовы ўцягваюцца нават такія людзі, якія спярша падаюцца маўчунамі. Сцёпка з-пад Свіслачы выглядаў на такога. Таму, як ён пачынаў гаварыць, усе з цікавасцю замаўкалі, бо той мог расказаць штосьці такое, пра што іншыя не адважваліся. У кантрабандыстаў ёсць некалькі забабонаў. Прыкладам, не гаварыць пра сваіх жанчын. Кантрабандысты вечна за мяжой. А што ў гэты час робяць іх жанчыны? Адным словам, лепш памаўчаць, каб не накаркаць якой бяды, бо хтосьці кахае сваю жанчыну, іншы пакутуе, што ягоная транжырыць заробленыя непасільнай працай грошы. У кожнага свая прычына. А для Сцёпкі ніякіх табу не існавала. Яго першае каханне закончылася катастрофай і з тае пары ён узненавідзеў усіх жанчын разам і кожную асобна. Нават сваю жонку. Маліў лёс толькі пра адно — каб у яго былі толькі сыны. Лёс яго не слухаў: падарыў трох прыгожых дачок. Та-

ды Сцёпка цалкам прысвяціў сябе працы. Увесь час штосьці камбінаваў, быў аўтарам некалькіх грандыёзных праектаў. Адзін з іх — пракапаць тунель пад польска-беларускай мяжой. Не ўдалося. Забракла аднадумцаў. Тады ён падняўся вышэй. Вырашыў пералятаць мяжу на дэльтаплане. Ды першая ж спроба скончылася паламанымі касцямі, пасля чаго Сцёпка зацікавіўся воднымі шляхамі. Стаў у пластыкавых пакетах сплаўляць спірт па Нёмане ў Літву. Там яго кампаньён вылоўліваў тавар з ракі. Але мясцовыя алкаголікі хутка пранюхалі пра гэта і цэлымі днямі сядзелі ў вадзе, чакаючы, калі з Беларусі прыплыве што выпіць. Радасці ад гэтага было толькі жонкам тых алкаголікаў. Яны думалі што іх мужыкі нарэшце кінулі піць і заняліся плаваннем. А для Сцёпкі гэта была трагедыя. Ды не збіраўся ён здавацца. Пачуў неяк, што Аўгустоўскі канал адновяць. Сабраў матэрыялы пра гэты канал, разлічыў хуткасць цячэння, прыдумаў як спірт будзе пераплываць праз шлюзы. Нават напісаў просьбу на трыццаці сямі лістах у парламент Беларусі, каб хутчэй Аўгустоўскі канал адчынілі. Маўляў, гэта мае неверагодна вялікае значэнне для культурных сувязяў. Ды ці ліст не дайшоў, ці сродкаў забракла, бо канал так і не запрацаваў. А Сцёпку зноўку прыйшлося карыстацца старымі дзедаўскімі метадамі, хаваючы спірт дзе папала. З тае прычыны ён яшчэ мацней палюбіў сваю працу і спірт і, чамусці, яшчэ мацней узненавідзеў жанчын. Невядома чаму лічыў іх прычынай усіх сваіх паразаў.

— Неяк піў я тры дні ў Саколцы, у Чэслава Вароніча, — распачаў сваю гісторыю Сцёпка. — На чацвёрты сабраў што не паспелі праглынуць і паехаў у Беласток. Надвор’е было — нібы жыд застрэліўся. Мокры снег, галалёд, вецер. А тут нейкая баба махае рукамі, просіць каб падвёз. Хлопцы, вы ж ведаеце як я іх ненавіджу, гэтых баб. Ды з бабай у дарозе — як з бараной у лесе. А ў той яшчэ боты на высокіх абцасах, як

у дзяўчыны, якую я кахаў. Такія боты цярпець не магу. Дай, думаю, напалохаю яе чым. Спыніўся. Падвязу, кажу, але пры ўмове, што пазабаўляюся табой прама на снезе. Думаю, хай спалохаецца што я маньяк.

— На снезе? — перапытвае яна. — Як цікава! Ніколі ў жыцці такога не мела. Трэба паспрабаваць, — і шась да мяне ў машыну.

Я еду паціху, маўчу. Пра што мне гаварыць з бабай? А яна пытае:

— Як мы доўга будзем забаўляцца на снезе?

— Пакуль не замерзнеш.

— Ну то значыць доўга. Тады едзь хутчэй, каб усё паспець. А то мне праз чатыры гадзіны трэба быць на вакзале ў Беластоку. Мужа сустракаю з камандзіроўкі.

Ну, думаю, гадзюка, паеду так хутка, што з цябе дух выскачыць. Ды вось бяда. Перада мной два аўтобусы сутыкнуліся. Усю дарогу загарадзілі. Яшчэ і паліцыя прыехала. Націснуў я на тармазы і пачало круціць маю машыну. Памятаю толькі як з-пад бампера польскі паліцыянт ныркануў у кювет, галавой у снег. А машына праляцела над ім у поле і ляснулася аб зямлю так, што ўсе бутэлькі са спіртам пабіліся. Паліцыянт ускочыў, ляціць звар’яцеўшы да мяне. Шапку поўную снегу надзябурыў на башку і раве каб я выходзіў. А я па калена ў спірце, ды яшчэ п’яны. Як я выйду? Зачыніў усе дзверы і раблю выгляд, што не бачу нікога. А дзеўка не шавеліцца, сядзіць, белая як смерць. Я падумаў, што яна дала дуба. Можа сэрца разарвалася ад перапалоху. Вельмі стала мне шкода сябе. Пасадзяць жа ў турму. Адна радасць — там баб не будзе. А больш за ўсё шкода было разлітага спірту.

Як толькі паліцыянт заняўся аўтобусамі, я ўпрасіў людзей выпіхнуць мяне на дарогу і ходу адтуль. І тут ажыла гэтая дзеўка. Стала раўці, лямантаваць, адчыніла дзверы і хоча выскачыць. Але пас не пускае. Заклініла яго, не адшпіляецца. А як я ўзяў нож, каб перарэзаць той

пас — зноў самлела. Я паляпаў ёй па твары. Гляджу ажыла. Жывучыя яны. Выйшла з машыны і кажа:

— Ну і падвёз ты мяне!

— Затое як добра пазабаўляліся, — весела адказаў я і паехаў назад вельмі задаволены, што ўрэшце атрымалася яе напалохаць. І халера з ім, з тым паразліваным спіртам.

# Добры знаёмы

Было гэта акурат перад Вялікаднем. Для кантрабандыста сама працоўны час. Кожны чалавечак хоча назапасіць алкаголю на свята, а попыт вызначае прапанову. Галоўны закон бізнесу! Вось і кінуліся ўсе са сваімі прапановамі ў Польшчу. Адна бяда — польскія мытныя службы таксама пра гэта ведаюць. Так пачалі трэсці бутлегераў, што алкаголь стала мажлівым перавезці толькі ў страўніку. Людзі, у якіх забралі тавар, былі ў роспачы і стане пошуку новых метадаў. Працоўныя няўдачы заўсёды актывізоўваюць мазгі. У такім працоўным пошуку я заспеў Аліка Гартанюка, беларуса з Беласточчыны, на гродзенскім вакзале.

— Слухай мяне ўважліва, — пачаў ён так таямніча, нібы прапаноўваў мне стаць сябрам тайнай масонскай арганізацыі. — У мяне ўжо два разы запар сканфіскавалі тавар. Як так пойдзе далей, то застанемся без порткаў. Збанкрутуем зусім. Трэба штосьці мяняць. Лепш усяго знайсці добрага знаёмага ў польскіх службах, які будзе намі апекавацца. Я маю такога на воку. Шалёна любіць выпіць. Гэта адзіны чалавек у Беластоку, які можа мяне перапіць. Мы яго будзем паіць, а ён дапамагаць нам у перавозе спірту. Калі так пойдзе, то справы

скочаць угару. Грошай будзе як у жыдоў. Ты мне вельмі патрэбны, бо ты беларус. Сваіх яны баяцца, думаюць, падстава. А разам усё пойдзе гладка.

У цягніку да Беластока, які народ ласкава называў спіртавозам, я па складзенаму сцэнару падышоў да памежніка і папрасіў яго хутчэй праверыць пашпарт. Маўляў, нічога не вязу, але вельмі спяшаюся. А тут, нібы выпадкова, падышоў Алік.

— Якая сустрэча! — радасна закрычаў ён. — Гэта ж трэба так. Сустрэў разам двух сваіх лепшых сяброў. Трэба нам гэта замачыць. Маю трошачкі спірту. Адмыслова важу для такіх выпадкаў.

Памежнік, як даведаўся, што ён лепшы сябра Аліка, трошкі здзівіўся. Але паведамленне пра спірт пераканала яго.

— Мне на працы піць нельга, — задумліва прашаптаў ён. — Пачакайце мяне ў Кузніцы. Як скончу працу, паедзем у Беласток разам. А зараз пасяджу з вамі, каб мытнікі не лезлі ў торбы.

Мытнікі, убачыўшы, што мы размаўляем з памежнікам, нават не падышлі да нас. Алік быў шчаслівы. На вакзале ў Кузніцы ён не змаўкаў. Тлумачыў, што калі мы сёння добра напоім Казіка (так звалі памежніка), то ўсе нашыя праблемы скончацца адразу і назаўсёды. А як змена памежніка закончылася, мы паехалі разам у Беласток. Алік дастаў пляшку, проста з бутэлькі адпіў каля паловы і падаў яе Казіку.

— Ну ты і п’еш! — сказаў той, і нагбом дапіў што засталося. Спытаўся толькі, чым можна закусіць.

— Якая закуска? — падміргнуў яму Гартанюк. — У нас столькі гарэлкі, што мы можам яе піць і ёй закусваць.

Пры гэтых словах ён раскрыў сваю торбу і паказаў што там ляжыць. Вочы ў памежніка блісканулі як ядзерны выбух. Ён моўчкі залез у торбу і дастаў кожнаму па пляшцы. На беластоцкі перон мы ледзьве выпаўзлі. Шапка памежніка была чамусьці на галаве ў Аліка, а я цягнуў па зямлі за рукаво памежніцкую куртку. Куды мы

ідзём, ніхто не ведаў, але неяк незразумелым чынам апынуліся ў Алікавай хаце. Пасля таго, як Гартанюк сказаў сваёй жонцы, што гэты памежнік цяпер будзе рабіць усё, што скажам, нават есці з нашых рук, яна маланкай паляцела збіраць на стол.

Прачнуўся я сярод ночы ад моцнага крыку. Нада мной у трусах і службовай шапцы стаяў Казік і патрабаваў пашпарт.

— У яго ад выпітага на халяву спірту пачаліся праблемы з мазгамі, — патлумачыў Алік. — Але ж упіўся, брыда! Думае, што ён на працы ў цягніку. Лазіць з пакою ў пакой, як па вагонах, і патрабуе пашпарты. Ты яму хаця б далонь выцягні.

Я так і зрабіў. Казік ляпнуў па ёй кулаком, нібы паставіў пячатку ў пашпарце і пасунуўся ў другія „вагоны”. У кватэры ніхто не спаў. Памежнік хадзіў па пакоях і пляскаў кулаком па выцягнутых далонях, спраўна выконваючы свае працоўныя абавязкі. Не даваў прадыхнуць нікому: ні мне, ні Аліку, ні ягоным маленькім дзецям, якія ўвогуле яшчэ не дараслі да пашпартоў, ні яго старым бацькам, якія ўжо забыліся, што такое пашпарт. Дзеці плакалі, старыя пачалі маліцца, каб той памежнік здох. А той насіўся па „вагонах” як шалёны і патрабаваў паважаць законы пераезду мяжы. Нарэшце хтось пачуў малітвы старых. Казік зачапіўся за крэсла, грымнуўся на зямлю і захроп. Усе астатнія, падзякаваўшы лёсу, таксама ўляглiся.

Раніцай я пабудзіў Аліка, каб ісці на рынак прадаваць спірт.

— Спі далей, — сумна адказаў той. — Няма аніякага спірту. Наш добры знаёмы выпіў увесь. Апошнія дзве бутэлькі забраў з сабой. Лепш бы гэты спірт у нас забралі на мяжы. Хоць галава не балела б. А як праспімся, падумаем наконт таго, каб знайсці якога-небудзь іншага знаёмага. З гэтым нічога не заробіш, каб яго халера забрала!

# Стрэльба ці малітва?

Як толькі я ўбачыў у машыне Мішы Гарэля жанчыну, адразу зразумеў — будуць праблемы.

— Міша, — кажу яму, — на якую халеру ты валачэш яе праз мяжу? З бабай у дарозе, як з бараной у лесе.

— Пацерпім, — тлумачыць Міша. — Нам у калгас нержавейку прыслалі на рамонт машын. Вельмі дарагі метал. А сусед мой токар. Нарабіў з гэтага металу пяцьсот нажоў і паслаў жонку прадаваць. Па долару за нож. Грошы, кажа, невялікія, ды мы столькі ніколі не бачылі. Ну як я мог адмовіць? Такога металу ў наш калгас ніколі не давалі, баяліся, што параскрадаюць. Ты ведаеш, колькі сілы згубіў сусед, каб пераканаць кіраўніцтва, што ў нашым калгасе злодзеяў няма. Хай ягоныя намаганні аплацяцца. Заробяць свае пяцьсот долараў. А мне з суседзямі жыць трэба. Гэтая жанчына, Янька, кладаўшчыца. Ад яе шмат залежыць, што я вязу за мяжу.

Аргументы мяне пераканалі. Сапраўды Міша вазіў тое, што ў калгасе кепска ляжыць. Лемяхі да плугоў, шнур для цюкавання саломы, нават хімічную атруту ад палявых шкоднікаў. Кантрабандысты жартавалі, што яму трэба ўзначаліць партыю зялёных, таму што гэтая хімія не трапляе на нашыя палеткі і ў выніку экалагіч-

ная сітуацыя ў Беларусі значна палепшылася. Міша сам пасмейваўся, што возіць заходнім суседзям толькі атруту — хімію, цыгарэты і самагонку. Жартаваў, што беларускі ўрад мусіць яго ўзнагародзіць ордэнам за ачышчэнне Радзімы ад шкоднага.

У тым, што ўдасца перавезці такую колькасць нажоў праз мяжу, я не сумняваўся. Міша так умеў хаваць рэчы, што, часам здавалася, можа ў сваёй маленькай машыне схаваць і танк. Але і прадчуванні, што будуць праблемы, мяне не падманулі. Пачаліся яны на рынку ў Цеханаве, калі да нас падышлі польскія паліцыянты. Тыя вельмі доўга вымяралі лінейкай нажы, узважвалі іх, ніяк не маглі пастанавіць ці можна такімі рэчамі гандляваць. Пасля з'явіўся бандыт і запатрабаваў грошы. Я ляснуў яму лемехам па мордзе так, што ён валяўся пасярод рынку каля гадзіны, пакуль яго за ногі не адцягнулі некуды сябры. Затым зноў прыйшлі паліцыянты. Але, даведаўшыся, што на рынку бандыты, хутка скочылі ў машыну і зніклі. Пасля зноў з'явіліся бандыты. Дачакаўшыся, калі мы скончым гандаль і паедзем, яны рушылі ўслед. Дарога цягнулася праз лес. Мы пачалі нервавацца.

— Жывымі не здамося, — пажартаваў заўсёды вясёлы Міша. І дарма. Пасля такіх словаў Янька завыла ваўчыцай, укленчыла ў машыне і пачала маліцца ўголас. Бандыты крычалі са сваёй машыны і патрабавалі, каб мы спыніліся.

— Колькі ты, дурная, будзеш лямантаваць, — звярнуўся да жанчыны Міша. — Даставай хутчэй свае нажы. Трэба ж нам бараніцца.

Ды Янька яго ўжо не чула. Яна ўкленчыла на торбе з нажамі, канчаткова пазбавіўшы нас надзеі далезці хоць да нейкай зброі, і раўла што дурная. Ні то малілася за ўратаванне нашых жыццяў, ні то душаў.

— З гэтай дурной да толку не дойдзеш, — расчаравана кажа Міша. — Тут недалёка ў лесе жыве мой знаёмы. Можа там знойдзем паратунак.

Мы куляй заляцелі да ляснога хутара і спынілі машыну пад вялікім плотам. Бандыты спыніліся побач. Міша пераскочыў праз плот, але праз хвіліну пераляцеў назад з падзёртымі порткамі. За ім праз плот скочылі тры вялізныя сабакі. Што было рабіць. Я хапіў хімічную атруту і плюхнуў на морды сабак. Тыя заскавыталі як п'яныя кентаўры і паляцелі хто куды. Адзін нават ляснуўся з разгону ў машыну бандытаў. А мы, выбіўшы нагамі дзверы, заляцелі ў хату.

— Ратуйце, нас бандыты забіваюць, — зараўла гаспадарам Янька, павалілася на калені перад абразамі і зноў пачала маліцца.

— Дзед, хутчэй давай стрэльбу, ведаю, у цябе ёсць, — закрычаў Міша.

Але гаспадар паваліўся на калені побач з Янькай і маліўся, каб хоць хто — ці мы, ці бандыты з'ехалі з яго хаты. Гаспадыня стала шукаць стрэльбу, але не знаходзіла.

— Што ж, вы ў лесе жывяце, а дзе стрэльба ляжыць, не ведаеце, — занерваваўся я. — У такім бязлюддзі як на вайне.

Нарэшце гаспадыня знайшла патрэбнае. Праўда, быў толькі адзін патрон. Мы выйшлі з Мішам на двор. Ён дэманстратыўна падкінуў бутэльку, а я стрэліў па ёй. Патрапіў. Бандыты адразу ўцяклі. А мы за сталом, адкаркоўваючы чарговую пляшку, доўга спрачаліся, што нас уратавала — малітва Янькі, ці стрэльба.

Назаўтра, прадаўшы тавар, па дарозе дахаты мы вырашылі заехаць на хутар, каб яшчэ раз падзякаваць гаспадарам. У хаце было ўсё як заўсёды. Толькі адна змена. На самым бачным месцы, у куце пад абразамі стаяла стрэльба. Побач ляжаў пачак навюткіх патронаў.

# „Калека”

Хто не стаяў у доўгіх нудных чэргах на беларуска-польскай мяжы на пачатку дзевяностых гадоў, таму цяжка зразумець, які бясконцы патэнцыял цярпення маюць беларусы. Нярэдка трэба было выстаяць, вылупіўшы вочы, тыдні два, каб твая машына дапаўзла да доўгачаканага шлагбаума з белым арлом. Здаралася і так, што гаспадар гэтай шчаслівай машыны паварочваў назад, не перасекшы запаветнай рысы, да якой так імкнуўся. Ён перад самой мяжой нечакана для сябе выяўляў факт, што за гэтыя два тыдні ўвесь падрыхтаваны для продажу спірт ужо выпіты. Прычым ім самім. Ну, а калі гэта зіма, то яшчэ спалены ўвесь бензін. Для абагрэву. Таму, дзеля змяншэння такіх выпадкаў, трэба было пільна сачыць, каб ніхто не праехаў без чаргі. Тыя нячэсныя машыны, кіроўцы якіх усё ж спрабавалі прыкінуцца дурнаватымі і неяк абысці няпісаныя памежныя правілы, нават пераварочвалі коламі ўгору, білі ім шыбы, а іх гаспадарам — морды. Асабліва жорстка білі ўладальнікі тых машын, якія раскіраваліся перад самім шлагбаумам, пасля двухтыднёвага стаяння, з-за факту знікнення аб’екта гандлю. Нават савецкія памежнікі часоў халоднай вайны не маглі пахваліцца такім пільным нагля-

дам за мяжой, які арганізавалі кантрабандысты дзевяностых гадоў. Мыш не магла прапаўзці без дазволу. Але быў адзін чалавек, якога заўсёды прапускалі без чаргі.

Называлі яго Сцёпа. Што з ім здарылася, ніхто не ведаў, але выглядаў так, нібы дасталі яго з гіганцкага міксера. Паламаны ўвесь, перакошаны. Глянеш на яго — жыць не хочацца. Ездзіў гэты небарака на дабітым старым „запарожцы”. З машыны амаль не выходзіў. Ну, а калі ўсё ж даводзілася выйсці, то толькі на мыліцах і з дапамогаю іншых людзей. Ногі зусім не трымалі. Ды і так нейкі крывы быў. Твар спакутаваны. Рукі трасуцца. Шкада яго было. Што не кажы, а ў наш час здароваму цяжка выжыць. А як калеку? Ды яшчэ на такой цяжкой працы. Кантрабандыстам.

Як мы маглі не пашкадаваць такога чалавека? Ды і паслуга нашая яму — дрэнь не вартая ўвагі. Раз на дзень прапусціць без чаргі машыну. Што мы, не людзі? Яго нават гродзенскія жабракі-пабіракі як бачылі, то адразу падыходзілі, каб аддаць напрошанае. Так жаласліва выглядаў гэты калека. Адзін раз я на свае вочы бачыў, як мясцовыя алкаголікі з жалю аддалі яму бутэльку гарэлкі. Кажуць, потым памёр адзін. Сэрца разарвалася ад такога ўчынку. Але не пра яго зараз.

Да Сцёпы і мытнікі не чапляліся. Ні беларускія, ні польскія. Ёсць, як бачыце, і ў іх сумленне. Прапускалі, не правяраючы. Хай, маўляў, зарабіць няшчасны, пакрыўджаны лёсам чалавечак сабе на жыццё. А мо самі сабе даказаць хацелі, што не звяры яны, таму і не крыўдзілі калеку. Ды знайшоўся адзін нелюдзь. Зусім малады мытнік. Спыніў ён Сцёпаву машыну і кажа, што не прапусціць, пакуль не праверыць. Людзі мытніка сароміць сталі. Нельга, маўляў, крыўдзіць нямоглых. А той упёрся як ражон і нікога не слухае. Стаіць як сцяна. Гадзіны тры так прайшло. Сцёпа з машыны не вылазіць, мытнік кажа, што не прапусціць, пакуль той не вылезе, а людзі нервуюцца і лаюцца. Зразуме-

ла, што на мытніка. І так столькі ў чарзе выстаялі, а тут такая затрымка.

Першым не вытрымаў мытнік. Падышоў да калекі ды кажа:

— Ну хопіць! Не прапушчу я цябе. І машыну канфіскую. На гэты раз ты папаўся, бо бачыў я цябе ўчора ў лазні з бабай. І хадзіў ты сам. І нават не кульгаў.

Сцёпа збялеў. Хвіліны дзве сядзеў моўчкі. Пасля адкінуў мыліцы, вылез з машыны і шпарка, лёгкім жвавым крокам падаўся ад чаргі, вылаяўшыся пры тым такім матам, што я не толькі згадаць яго, а нават паўтарыць у думках баюся.

Мы, уражаныя пабачаным, яшчэ з паўгадзіны не маглі рухацца. Маўчалі. Дух заняло. Некаторыя курылі. Пасля патроху раз’ехаліся. Пра „калеку” стараліся не ўспамінаць. Каму прыемна гаварыць пра тое, што з цябе гадамі рабілі дурня.

Сцёпа на гэтай мяжы больш не з’явіўся. Неяк, можа праз год часу, дайшлі да нас чуткі, што хтосьці бачыў яго, зноў на мыліцах, на ўкраінскай мяжы. Праз гады два нехта расказваў, што бачыў Сцёпу ў Бельгіі. Цягнуўся ён у нейкую мясцовую адміністрацыю па справах грашовай дапамогі калекам-эмігрантам. Але ён гэта быў, ці хто на яго падобны, так і засталося невядомым. Хто гэта можа праверыць. Не ехаць жа з-за гэтага ў Бельгію.

# Парабак

Толькі прыдурак мог сцвярджаць, што эксплуатацыя чалавека чалавекам прыдуманая пануючымі класамі. Алік Гартанюк ніколі да такіх класаў не належаў. Ён быў самым звычайным кантрабандыстам. Як вядома з тэорыі класавай барацьбы, кантрабандысты ўвогуле ні да якіх класаў не належаць, а слова эксплуатацыя калі недзе і чулі, то даўно забыліся што яно азначае. Алік, як і ўсе двухногія на гэтым свеце, што цяжка зарабляюць сабе на хлеб, проста марыў трошкі адпачыць. Але каб пры гэтым заставаўся ўсё той жа стабільны прыбытак, які і дае ўпэўненасць у заўтрашнім дні, вырашыў наняць працаўніка. Кніжак з разумнымі тэорыямі ён не чытаў, таму нават зялёнага разумення не меў пра сістэму наёмнай працы, легальны бізнес і абарону правоў працоўных. Дый навошта яму гэта было. Якія ў працоўнага чалавека правы, ён добра спазнаў, калі першы раз перасякаў беларуска-польскую мяжу, каб купіць у Беларусі тэлевізар „Гарызонт” з пультам. Іх тады толькі сталі рабіць і прадавалі толькі па талонах. Адзін на пяць гадоў. Гартанюк вельмі марыў набыць такую рэч. У думках ужо бачыў сваіх шчаслівых дзетак каля новенькага каляровага экрана. Ды вось не пашанцавала.

Мытнікі сканфіскавалі ўсе грошы, якія зарабляў цэлае жыццё, цяжка працуючы на заводзе. Валюту тады забаранялі перавозіць. А адкуль гэта мог ведаць няшчасны беластоцкі беларус. З тае пары Алік кінуў завод і пайшоў у кантрабандысты. Каб зарабіць на ўсё той жа тэлевізар. Праз дзень ужо ведаў, што калі перавозіш грошы, то іх трэба хаваць. Праз два дні ведаў дзе хаваць. А праз год у кожным пакоі ягонай чатырохпакаёвай кватэры ў Беластоку стаяла па тэлевізары. Ды не „Гарызонты", а „Соні" ды „Філіпсы". І ўсе з пультамі.

— Што мы ўсё гарбы сабе нажываем? — пытае ён у мяне. — Круцімся на гэтай мяжы як вошы на грэбені. Нават паглядзець тэлевізар няма калі. Як я працаваў на заводзе, кожны вечар быў вольны. Але не было тэлевізара. Зараз тэлевізараў цэлая куча, а няма часу іх глядзець. Таму і надумаўся наняць парабка. У мяне дзед быў. Меў ля Саколкі колькі гектараў зямлі. Дык ён, каб мажлівасць здабыць на кірмаш з'ездзіць, ці яшчэ якога ражна ў жыцці пашукаць, наняў парабка. Той гаспадарку дагледжваў, пакуль дзед адсутнічаў. І пагаварыць з кім было дзеду па прыездзе. Хіба і нам трэба яго досведу трымацца. А то зусім здэградуем ад такой працы.

— Каго тут знойдзеш? — кажу яму. — Цяпер усе хітрыя сталі. Абдзяруць нас як ліпу, ды наўцёкі. Я не ведаю такога чалавека, якому свой бізнэс раскрыў бы.

— Я ведаю, — угаворвае мяне Алік. — Да мяне даўно напрошваецца адзін паляк. Янак. Ён надумаўся жаніцца, а грошай на вяселле няма. Кажа, дай зарабіць. Не пашкадуеш, маўляў. У самога грошай на спірт няма, то хай возіць наш. А мы яму трохі заплацім. Хопіць нам, беларусам, вечна на пана працаваць. Хай цяпер паляк на беларусаў папрацуе.

Я пагадзіўся. І нават, як упершыню пабачыў Янака, не адчуў небяспекі. Хлопец малады, з выгляду сумленны і працавіты. Чаму такога не ўзяць у парабкі.

Алік наладаваў машыну спіртам, дзе толькі было магчыма — у дзверках, пад капотам і нават у запасным коле. Гартанюк парабку паставіў канкрэтную задачу — давезці тавар да Беластока, раскруціць машыну, дастаць спірт, аддаць яго і ўзяць у Алікавай жонкі грошы, на закупку наступнай партыі кантрабанднага спірту. Адну бутэльку даў у рукі. Маўляў, яе можна перавезці легальна. Вось гэта і была галоўная памылка. Праз гадзінаў сем вярнуўся Янак. П'яны як дзіравы бот з левай нагі. Лыка не вяжа. Толькі просіць прабачэння за тое, што літруху выпіў. Але сцвярджае, што пастаўленае заданне выканаў. Прывёз ад Алікавай жонкі грошы.

— А спірт аддаў маёй жонцы? — пытае Алік.

— Які спірт? — перапытвае Янак.

Гартанюк, нічога не кажучы, раскруціў дзверкі машыны, а там, блішчаць бутэлечкі са спіртам. Янак на машыне, за якую была заплачана страхоўка і ўсе астатнія кошты для пераезду праз мяжу, завёз кантрабандны тавар у Польшчу і прывёз яго назад. Пры гэтым двойчы, нашым коштам, рызыкаваў канфіскацыяй машыны.

— Ну што, — кажу, — Алік. Дапамог нам твой парабак, як некалі дапамагаў твайму дзеду?

— Вінаваты я перад табой, — кажа ён. — Я галоўнага табе не сказаў, што дзед распавядаў пра парабкаў. Чужымі рукамі, казаў ён, толькі жар заграбаць.

Мы пасмяяліся і з той пары больш не спрабавалі наймаць парабкаў. Працавалі сваім гарбом.

# У памежнай пастцы

Кожная дзяржава мае свае межы, сваё мытнае заканадаўства і свае абмежаванні на ўвоз і вываз пэўных відаў тавараў. Для кантрабандыста з гэтых трох рэчаў падыходзяць дзве. Межы і тавары, якія забаронена праз межы перавозіць. Мытнае заканадаўства кантрабандыста цікавіць зусім з іншага боку. Якое б дэбільнае яно не было, яго ўсё адно трэба абысці. Але бываюць выпадкі, калі права напісана настолькі тупым чыноўнікам, што, сутыкнуўшыся з ім, сам тупець пачынаеш. А выйсця з вар'яцкай сітуацыі не могуць знайсці ні самыя разумныя парушальнікі права, ні самыя дурныя яго ахоўнікі.

Здарылася гэта тады, калі лёсу чарговы раз удалося мяне ашукаць. Я з уласнай дурноты паверыў, што сама кепскія часы майго жыцця мінулі. Пакінуў ненармаваную кантрабандную працу і займаўся зусім іншымі справамі. А за мяжу разам з Лявонам Камінскім паехаў, каб сустрэцца з сябрамі. Да ўсяго вельмі цікава было паглядзець, што змянілася ў жыцці кантрабандыстаў.

— А ні халеры не памянялася, — весела даводзіў нам Ваня, шафёр бусіка, у які мы падселі па дарозе назад.

— Гэта праўда, — пацвердзіла яго сяброўка. — У нас няма зменаў. Толькі памежныя інструкцыі мяняюцца.

Ды мы іх абыходзім. Вось, прыкладам, з сённяшняга дня абмежавалі ўвоз польскага мяса. Нейкую там норму на чалавека прыдумалі. А мы пасажыраў узялі. І на кожнага з вас узялі дазволеную норму мяса. Ды яшчэ па дзве недазволеныя параскідалі па машыне. І не сумняваемся, што перавязем.

Нас усцешыла такая ўпэўненасць. Але беларускі мытнік не падзяліў нашай радасці. Ён накіраваў машыну туды, дзе гэтае мяса куплялася — у Польшчу. Пераехаць мяжу з другой і трэцяй спробы таксама не ўдалося. Людзі ў шэрых мундзірах з гербам на плячы з задавальненнем ставілі нам у пашпарты штамп „анулявана", і з каменнымі тварамі раскіроўвалі машыну назад. Што было рабіць. Вырашылі мы адвезці частку мяса назад у Польшчу. Але на гэты раз запратэставаў польскі мытнік.

— Вы што, зусім звар'яцелі! На халеру нам вашае мяса. У нас свайго поўна. Разварочвайцеся назад.

— Дык гэта вашае мяса, — паспрабаваў выправіць сітуацыю Ваня.

— Што?! — зароў мытнік. — А вось за гэта я вас у турму адпраўлю. Ашуканцы. Вы грошы за ВАТ атрымалі, што мяса з Польшчы вывезлі. А цяпер яго назад везяце.

Ваню стала не да жартаў. Польскіх турмаў ён для сваёй біяграфіі не планаваў. Мы трохі ад'ехалі і сталі думаць, што рабіць далей. Але перад намі як з-пад зямлі вырасла постаць польскага памежніка.

— Тут стаяць нельга, — рашуча заявіў ён. — Едзьце на сваю тэрыторыю.

На сваёй тэрыторыі ўжо беларускі памежнік амаль даслоўна паўтарыў тое самае. Мы спачатку нават пасмяяліся. Ды пасля стала не да смеху. Беларускія мытнікі не пускалі машыну ў Беларусь, польскія не пускалі яе ў Польшчу, а памежнікі абедзвюх дзяржаў забаранялі стаяць на нейтральнай тэрыторыі. Машыну ганялі як сабакі чужую курыцу са свайго агарода. Паліва канча-

лася, пашпарты заштампоўваліся ўсё новымі пячаткамі „анулявана” і ў перспектыве месца ў іх таксама мусіла хутка скончыцца. А мы ўсё працягвалі ездзіць туды-сюды, пад брэхі мытных службаў абедзвюх краін.

— Паслухайце, — прасіўся ў адчаі Ваня. — Я за гэтае мяса заплачу, колькі скажаце. Толькі прапусціце.

Але мытнікі паціскалі плячамі і казалі, што гэта не прадугледжана інструкцыямі. На просьбу выкінуць гэтае мяса куды-небудзь ужо памежнікі праінструктавалі нас, што такое пазбаўленне ад тавару не дазваляецца.

— Дык што нам рабіць? — усё дапытваўся Ваня. — У Беларусь нас з гэтым мясам не пускаюць нават за грошы. У Польшчу таксама. Стаяць пасярод межаў не даюць. Мяса выкінуць таксама нельга. Скажыце што нам рабіць? Ці ёсць у вас якая-небудзь інструкцыя, якая дазваляе нам трапіць хоць у якую-небудзь краіну?

Але работнікі мытных службаў сцвярджалі, што менавіта інструкцыі яны выконваюць і раскіроўвалі машыну ў другі бок. Ваню ахапіў жах. Ён стаў хапаць мяса, сунуць яго людзям у чужыя машыны, кідаць памежным сабакам, выкідваць направа і налева. Абы далей ад сваёй машыны. І не спыніўся, пакуль не засталася маленькая торба. Нават значна менш дазволенай нормы. Пасля гэтага ўскочыў у машыну са словамі „ну хай цяпер глядзяць, хоць у іх вочы папэнкаюць” пад’ехаў да мытні. З будкі выйшаў нейкі заспалы мытнік, якога цэлую змену не было відаць. Ён нават не глядзеў на тое, што ў машыне. Нават не спытаў. Толькі пажадаў нам шчаслівай дарогі, прапусціў машыну ў Беларусь і зноў знік у сваёй будзе. Напэўна, гэта быў адзіны чалавек на мяжы ў той дзень, які не трымаўся інструкцый.

# Правільны падыход

Ужо цэлы тыдзень кантрабандысты чакалі бяды. Ніхто толкам не ведаў, якая яна будзе і адкуль возьмецца. Проста Віцька з-пад Ваўкавыска неяк сказаў:

— Нюхам чую, што нешта здарыцца.

Яму нельга было не верыць. Нюх на такія рэчы ў яго насамрэч быў востры. Калі скажа каму, каб не ехаў праз мяжу тады і тады, а той яго не паслухае, то потым вельмі шкадуе. Ці мытнікі кантрабанду знойдуць, ці бандыты абрабуюць, ці проста машына сапсуецца. Таму і мянушку яму далі — Варажбіт.

— Бярыце хлопцы адпачынак на які месяц, — кажа Варажбіт, — бо і так нічога не заробіце. Толькі праблем сабе нажывеце. Вам гэта толькі здаецца, што рызыкуеце сваёй задніцай. Галавой рызыкуеце. Мая інтуіцыя мяне яшчэ ніколі не падманвала.

Далей мы яго на мытні не бачылі цэлы месяц. Працавалі ў звычайным рэжыме і ўвесь час чакалі як яго словы спраўдзяцца.

Доўга чакаць не давялося. З'явіўся з польскага боку новы мытнік. І так, сабака, стаў трэсці машыны, торбы ды кішэні, што мы ваўкамі завылі. Нічога не схаваеш. Усё знаходзіў. І палохалі яго, і падкупіць спрабавалі.

А той паганы такі нахабны як кныр. Ні на якія саступкі не ідзе. Паводзіў сябе так, як нават крымінальныя аўтарытэты сабе не дазвалялі. Забіраў тавар, канфіскоўваў машыны, затрымліваў людзей. Зусім жыцця не стала.

Доўга мы думалі што рабіць. Няўжо, мяркуем, ніякага паратунку няма. Дамовіліся сачыць за ім і ўсё пра яго даведацца. Нехта заўважыў, што той шалёны мытнік вельмі лаяльна ставіцца да тых, хто сельскагаспадарчыя тавары возіць. Іншы даведаўся, што гэты вар'ят з сялянскай сям'і і яго бацькі самі купляюць у нашых розныя рэчы для сваёй гаспадаркі. Лемяхі, гачкі, шнурок для цюкавання саломы. Нехта нават стаў прадаваць ім салярку і паведаміў нам цікавую навіну. Бацька гэтага мытнага пудзілы неяк напіўся нашага спірту. І так яму мазгі перавярнула, што падпаліў хату. З тае пары гэты мытнік адчувае сёмым пачуццём дзе алкаголь ляжыць. Адзінае што, калі бачыць усялякія сельскагаспадарчыя рэчы, яго інтуіцыя згасае. Хіба ад прыемных успамінаў пра дзяцінства, калі яго бацька працаваў у полі, а ён, лежачы ў траве, назіраў за паўраспранутымі жняяркамі.

Што тут пачалося на мытні. Складвалася ўражанне, што беларусы паставілі мэту засыпаць усю Польшчу сельскагаспадарчымі рэчамі. Кантрабандысты пачалі засыпаць бутэлькі са спіртам косамі, хаваць іх у цвікі. Некаторыя нават, каб паказаць сваю прыхільнасць да сялянскай працы, насыпалі ў машыну салому.

Варажбіт таксама зрабіў вынаходніцтва. Шкада, што такія не патэнтуюцца. Разбагацеў бы як Ракфелер. Купіў з дзесятак пластыкавых вёдраў з накрыўкамі, абматаў іх шнурком і сталі яны падобныя на буксы для цюкавання саломы. Ні адзін эксперт не адрозніць ад сапраўдных. Крышку адшпіляе, накладвае туды алкаголь, перавозіць праз мяжу, прадае і пустыя вязе назад. Каб зноў наладаваць спіртам.

Злосны мытнік яго зразу запаважаў. Бывала, нават не правяраў машыну зусім. А аднойчы завёў размову.

— Чаму толькі шнурок возіш? — пытае.

— Шкода мне вашых сялянаў, — адказвае Варажбіт. — Цяжкая ў іх праца. А шнурок у Польшчы дарагі. Вось і дапамагаю чым магу. Прывожу таннейшы. Я і сам з вёскі. Таму ведаю як важна памагаць сялянам.

У мытніка аж сляза пацякла па шчацэ. Расчуліўся ён вельмі.

— А чаму назад вязеш яго? Што, не купляюць?

— Ага, не бяруць, — тлумачыць з болем у голасе Віцька. — Вельмі шмат зараз нашыя возяць такіх рэчаў. Канкурэнцыя вялікая. Паспрабуй прадай. Амаль задарма аддаю, абы дарога аплацілася. Усё адно не бяруць.

Мытнік зусім расперажываўся.

— Ведаеш што, — кажа ён, — ты, бачу, вельмі добры чалавек. Можаш трохі цыгарэт перавозіць. Калі ты дапамагаеш сялянам, то і я табе дапамагу. Буду прапускаць. Толькі спірт не вазі.

Добрыя часы надышлі. Праца кантрабандыстаў зноў наладзілася. Гэтага мытніка ўсе палюбілі як роднага бацьку. І калі яго з пераезда перавялі працаваць на нейкую кабінетную пасаду, мы вельмі маркоціліся, бо да яго ўжо знайшлі правільны падыход. Не такі як да іншых. Да іншых у тыя часы быў толькі адзін правільны падыход: шнурок ты вязеш, ці гарэлку, а дзяліцца прыбыткам было трэба.

# Ашуканцы

— Каб жыць у радасці і шчасці, трэба красці, красці і красці, — рашуча заявіў, седзячы ля цёплага ляснога вогнішча, Мікола. — Большых ашуканцаў чым мы, беларускія кантрабандысты, няма на свеце. Ніхто так не ўмее падмануць і мытніка, і паліцыянта. Таму нас саміх ужо ніхто не ашукае. Мы найвялікшыя на зямлі майстры гэтай справы.

Але гэтая заява выклікала абурэнне ў рэшты п'янай кампаніі, што спынілася пераначаваць у лесе ля Белавежы. Як размова заходзіла пра чэснасць нашай прафесіі, кантрабандысты маглі спрачацца бясконца. Аргументаў было безліч. Хтосьці сцвярджаў, што менавіта кантрабандны рух тавару ёсць рухавіком эканомікі, хтосьці даводзіў, што без нашай працы найбяднейшыя колы грамадства не будуць у змозе знайсці грошы на штодзённую пахмелку. А Васіль нават дадумаўся заявіць, што дзяржаўныя чыноўнікі наўмысна нас правакуюць нелегальна перавозіць праз мяжу спірт і цыгарэты, каб уладкаваць на цёплыя мытныя і памежныя пасады сваіх сваякоў. Аргументы на карысць неабходнасці кантрабанднай прафесіі сыпаліся як лісты ўвосень. Жарсці так распаліліся, што ўжо ніхто нікога не слу-

хаў, толькі даводзіў сваё. Хіба спрэчкі зацягнуліся б на тыдзень, калі б заўсёды маўклівы, няголены, нямыты і ўвесь час п'яны Юрка, вывярнуўшы свае налітыя спіртам шалёныя вочы, не папрасіў усіх на пару хвілінаў заткнуцца. Прычым зрабіў ён гэта такім гучным голасам, што анямелі не толькі ўсе прысутныя там паплечнікі цёмнай кантрабанднай справы, але нават ранішнія шпакі, што залівалі лясок сваімі птушынымі пералівамі, змоўклі. Нехта потым жартаваў, што гэтыя лясныя пеюны ажно цэлы месяц баяліся раскрыць дзюбы. Толькі адзін сабака з Белавежы адважыўся падаць голас пасля таго, як перагрымеў гарматны бас двухметровага пузатага Юркі. І то чамусьці завыў ваўком.

— Не, хлопцы, не мы найвялікшыя ашуканцы на свеце, — рэзка заявіў Юрка. — Найвялікшыя ашуканцы — гэта хахлы. Нават мяне аднойчы ашукалі. Да мяне людзі ўвогуле баяцца падыходзіць. Выгляд у мяне нейкі занадта жахлівы. Нават п'яныя пакупнікі абыходзяць. Таму ў мяне заўсёды спірт самы танны. Прывабліваю людзей цаной. А ўсё адно купляюць толькі тыя, у каго на даражэйшую літроўку ўжо не стае. І то, калі моцна нап'юцца і страх губляюць.

Неяк гандляваў я на беластоцкім рынку. Іншыя гандляры, як заўсёды, далей ад мяне адсунуліся. І раптам падлятае маладая прыгожая хахлушка і пытае, ці можа размясціцца каля мяне. Я вельмі ўзрадаваўся. Нарэшце, думаю, знайшоўся чалавек, які не на знешнасць глядзіць, а на душу. А душа ў мяне добрая вельмі, чулая. Расклала дзяўчына нейкія радыёдэталі і адразу пакупнік да яе. Узрадаваўся, што знайшоў гэты тавар, кажа, што цэлы месяц шукаў. Толькі вось грошай няма з сабой. Просіць дзяўчыну, каб не прадавала нікому. Злётае, маўляў, за грашыма і ўвесь тавар забярэ. І суму называе такую, што я за год не зарабляю. Толькі ён адышоўся, як прылятае нейкі ўкраінец і кажа, каб дзеўка збіралася, бо аўтобус ад'язджае. А дзяўчо ў плач,

просіць, каб пачакалі трошкі. А той нават слухаць не хоча. Крычыць, што ён адказны за парадак у групе і ўсе адну чакаць не будуць. Дзяўчына стала збірацца, разраўлася зусім. Слёзы як боб па шчаках коцяцца. Шкода мне яе стала. Я як крыкнуў на таго кіраўніка групы, аж ён прысеў. Што, кажу, зусім сэрца не маеш?! Дай чалавеку зарабіць! А ён мне адказвае, што калі я такі добры, то няхай сам і купляю ў дзеўкі тавар. Дзяўчына адразу за гэтую ідэю ўхапілася. Просіць, каб хоць за палову цаны купіў. Маўляў, хутка прыйдзе той пакупнік — і я зараблю, а ёй назад на Украіну не везці гэтыя рэчы. Заплаціў я ёй і стаў чакаць пакупніка. Гадзіну чакаю, другую, а яго няма і няма. Ужо і людзі разышліся, і рынак зачыняюць, а маім дэфіцытным таварам ніхто і не зацікавіўся.

Не ведаю колькі я яшчэ стаяў бы, каб не дырэктар рынку. Падышоў ён да мяне, спачувальна пакруціў галавой ды кажа:

— Ва ўкраінкі купіў?

— Ага, — адказваю.

— Ну то выкінь гэтую дрэнь, ды едзь сабе адпачывай. Тая ўкраінка кожны дзень такому дурню як ты нешта падсоўвае. Абрыдла мне ўжо глядзець, як вы кожны дзень да ночы чакаеце нейкага пакупніка. Той пакупнік разам з гэтай дзеўкай і так званым кіраўніком групы зараз недзе твае грошы прапіваюць і з цябе, дурня, смяюцца.

Вось я і кажу, хлопцы, каб не хваліліся вы адзін перад другім, што мы добра ўмеем абдурваць. Далёка нам да сапраўдных ашуканцаў.

# Браты-акрабаты

Хто больш усіх цешыўся, што Літва здабыла незалежнасць, дык гэта ашмянскія кантрабандысты. Цешыліся больш, чым літоўскія палітыкі. І не дзіва. На карце з'явілася новая мяжа, якой у рэчаіснасці пакуль што не было. На дарозе Ашмяны — Вільня ўжо стаялі мытныя пасты, але па лясных дарогах можна было вазіць што хочаш. Толькі паспявай збываць тавар ды лічыць прыбытак. Цягам года амаль усе жыхары Ашмяншчыны сталі кантрабандыстамі. Вывозілі ў Вільню матэрыяльныя каштоўнасці чым толькі маглі. Хтосьці сунуўся роварам, а іншыя набылі нават фуры. Лясная дарога стала шырэйшай чым амерыканскія магістралі. Нават траса Ашмяны — Вільня здавалася ў параўнанні з ёй вузенькай сцяжынкай. Ды гэта мела і адмоўны бок. Кошты на беларускую прадукцыю ў Літве з часам так знізіліся, што губляўся сэнс нешта вазіць.

Першымі над гэтай праблемай сталі ламаць галаву браты Садоўскія. Яны заўсёды ў сваім нелегальным бізнесе прыдумвалі штосьці новае. За гэта калегі называлі іх акрабатамі. Акрабаты сядзелі неяк за пляшкай гарэлкі і думалі як ім жыць далей.

— Ведаеш, браце, — кажа Вінцук Толіку, — тут цяпер разгуляешся як цяля на вяроўцы. З такімі прыбыт-

камі старасць ва ўласным замку не сустрэнеш. Таму надумаўся я змяніць прафесію. Давай станем мытнікамі. Тыя зарабляюць больш. Збяры хабар з кожнага кантрабандыста хоць па долару, ведаеш колькі атрымаецца?! Шалёныя грошы.

— Хто ж цябе возьме на дзяржаўную працу? — смяецца Толік. — Там адукацыя патрэбная. А цябе за двойкі з сярэдняй школы выгналі. Хацелі ў школу для дурных аддаць. Дык ты спалохаўся, што і там не справішся, ды ўцёк. Увогуле ніякай паперы пра адукацыю не маеш.

— А навошта мець адукацыю, — не пагаджаецца Вінцук. — Галоўнае мець розум. Слухай мяне ўважліва. Кожны мытнік марыць прыватызаваць хоць метр мяжы. Ды хто ж яму дазволіць?! А мы ні ў каго не будзем дазволу пытацца. Прыватызуем тую лясную дарогу, па якой найбольш людзей соўгаецца. Набудзем мытныя мундзіры, паставім шлагбаум і будзем браць хабар. Усё як сапраўдныя мытнікі. Нікому ў галаву не прыйдзе, што мы ашуканцы. Зараз гэтыя мытныя пасты растуць як грыбы пасля дажджу. Цяпер на мяжы такі бардэль, што пакуль разбяруцца, мы ўжо свой банк адчынім у Бразіліі.

Ідэя брату спадабалася і хлопцы ўзяліся за яе рэалізацыю. Паставілі нейкую буду, пачапілі на яе дзяржаўныя герб і сцяг, набылі бланкі мытных дэкларацый, парабілі пячаткі і сталі „працаваць” мытнікамі. Новы мытны пераход нікога не здзівіў. Людзі ведалі, што некалі ён будзе. А браты паводзілі сябе як звычайныя мытнікі. Збіралі дзяржаўныя мытныя зборы, бралі на лапу. Напачатку кантрабандысты іх нават палюбілі. Акрабаты бралі меншы хабар чым іншыя. Але чым далей, тым горш. Хлопцы пачалі нахабнічаць. Разышліся як свінні на дождж. Здзіралі з людзей вялікія грошы, раскручвалі машыны, сканфіскоўвалі тавар. Аднойчы аднаго небараку нават арыштавалі і надзелі наручнікі. Склалі на яго пратакол, які пагражалі перадаць у суд. Той так напалохаўся, што выклікаў сваякоў, каб яго выкупілі.

Толік увесь час чапляў на пагоны ўсё новыя зоркі. Іх было ажно сем. Вінцук быў крыху сціплейшы. У яго было толькі пяць зорак, але ўсё адно ні на адной мытні Беларусі такой вялікай пасады ніхто не меў. А аднаго разу ім давялося прапускаць праз свой пераход нейкага міністра. Браты зрабілі выгляд, што звязаліся з кіраўніцтвам і прапусцілі міністра без чаргі і дагляду. Той быў вельмі задаволены. Яму і ў галаву не прыйшло, што перад ім былі ашуканцы.

Невядома колькі яшчэ гэтае ашуканства існавала б, каб не бандыты. Падалося тым вельмі дзіўным, што на гэтым мытным пераходзе і дзень, і ноч працуюць усё тыя ж два чалавекі. Пасачылі за імі крыху і дапетрылі ў чым тут справа. Прыехалі неяк уначы, павесілі акрабатаў за ногі на іхным жа шлагбауме і сядзяць сабе ў будзе. У карты гуляюць. Потым выйдзе які, чарговы раз запатрабуе, каб сказалі дзе грошы, дасць „мытнікам" пару разоў чым-небудзь цяжкім па галаве і зноў у буду гуляць у карты.

Браты доўга не прызнаваліся. Моцныя былі ў іх галовы. Ды пад раніцу не вытрымалі. Аддалі ўсё заробленае цяжкой „мытнай" працай. Бандыты грошы забралі і паехалі, пакінуўшы акрабатаў вісець на шлагбауме дагары нагамі.

Там бы яны і аддалі Богу душы. Ды ехаў нейкі немец. Напалохаўся вельмі. Паздымаў „мытнікаў". А тыя здзерлі з яго мытны збор, семсот долараў — усё, што ў таго было — і прапалі. Больш іх ніхто не бачыў. Можа дзе паставілі пераход на мяжы ЗША з Мексікай, прапускаюць нелегальных рабочых з Лацінскай Амерыкі. А можа дзе ў іншым месцы. Іхная цётка, якая бачыла братоў апошняя, расказвала, што акрабаты перад ад'ездам сказалі, што іх за добрую працу перавялі працаваць на нейкую мытню за мяжу. Наўрад ці яны памянялі прафесію. Хто ж па сваёй волі зрачэцца такой працы?

# Рэкламная драма

Можаце смела плюнуць у вочы таму, хто скажа, што першымі сталі карыстацца рэкламай у былых сацыялістычных краінах банкіры, бізнесоўцы ці палітыкі. Я сцвярджаю, што першымі былі кантрабандысты. Ды нават ведаю імя і прозвішча гэтага чалавека. Першым быў беластоцкі беларус Алік Гартанюк.

У той час, калі заходнееўрапейскі тэлеглядач выў ваўком ад засілля рэкламы на яго любімых тэлевізійных каналах, грамадзяне сацыялістычных краін марылі хоць адным вокам убачыць што гэта такое. Рэклама для іх была нечым незразумелым, нязведаным і магічным. Уцяміць абываацелю, які нічога не можа знайсці ў краме, для чаго існуе прыдуманая капіталістамі прапаганда іх прадукцыі, было практычна немажліва. Але кемлівыя беларусы, як толькі пазнаёміліся з гэтай з'явай, адразу зразумелі, што справа перспектыўная.

— Каб пайшлі большыя прыбыткі, — гаворыць мне неяк наранку Алік, прыклаўшы да скроняў кавалкі з лёдам, — трэба даць рэкламу нашаму тавару.

Няшчасны Алік! Ён так моршчыў лоб і сціскаў зубы ад пакутаў пасля ўчарашняй замочкі няўдалай спробы прадаць тавар, што яго пашкадавала нават жонка. Яна

купіла яму піва. Гэта было вельмі дарэчы, бо кожная спроба нешта сказаць выклікала жудасны боль у Алікавай галаве. І было вельмі нечакана. Ягоная жонка ўвесь час перажывала, што яе муж жыве вельмі весела і заўсёды скарыстоўвала нагоду, каб гэтае жыццё трошкі папсаваць.

Я пачакаў пакуль ён дап’е піва і ўлучыўся ў размову:

— Хіба звар’яцеў? Ты яшчэ на ілбе напішы, што кантрабандыст і гандлюеш нелегальным алкаголем ды цыгарэтамі. У нашай справе трэба сядзець ціха і не падымаць непатрэбнага пылу. Ці хочаш, каб кожны паліцыянт цябе ў твар ведаў?

— А то не ведаюць?! — не пагадзіўся Гартанюк. — Нас не толькі паліцыянты, але нават сабакі ўсёй Беласточчыны пазнаюць. Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць. Лепш не пляці дурноты, а паслухай, што я надумаў.

І распавёў мне пра свае планы:

— Мы ўвесь час хаваемся ад паліцыі. Таму нашыя кліенты не заўсёды нас знаходзяць. А на беластоцкім рынку ёсць паляк, які робіць фотаздымкі. Трэба яго ўпрасіць, каб сфатаграфаваў наш тавар і павесіў фота ў сябе ў атэлье. Людзі будуць звяртаць увагу, пытацца, а ён ім гаварыць, дзе нас знайсці. Нам застанецца толькі сядзець у ціхім месцы і піва папіваць. Кліенты самі нас знойдуць. А фатографу за гэта ў канцы дня нальем шклянку.

— Не будзе ён з намі звязвацца за шклянку, — запярэчыў я. — А большых выдаткаў мы не пацягнем.

— Не ведаеш ты палякаў, — буркнуў Гартанюк. — Для паляка-гандляра дармовая шклянка, што для камуніста сусветная рэвалюцыя. Менш трапячы, хадзем скарыстаем з мажлівасцей рэкламы.

Ён не памыліўся. Фатограф з радасцю прыняў нашу прапанову. І ўжо назаўтра мы чакалі вынікаў рэкламнай кампаніі, седзячы недалёка ад фотаатэлье і папіваючы халоднае беластоцкае піва. Доўга чакаць не давяло-

ся. Толькі гэта было не тое, чаго мы хацелі. Кліентаў з'явілася адразу ажно пяцёх. Былі яны адзетыя ў паліцэйскія мундзіры і прыехалі на паліцэйскай машыне. Тавар купілі адразу ўвесь. Праўда, забыліся заплаціць. І з намі не цырымоніліся. Закінулі як дровы ў паліцэйскую машыну, завезлі ў пастарунак і выпісалі кару. Дзесьці ў пяць разоў большую, чым каштаваў увесь наш спірт. Ды гэта была не апошняя неспадзяванка. У пастарунку нас яшчэ раз пазнаёмілі з фатографам. Небарака плакаў, выціраючы рукавом смаркачы, і нешта расказваў паліцыянтам пра вялікую колькасць дзяцей і цяжкое жыццё чалавека мастацтва. Яго таксама аштрафавалі за дапамогу ў продажы неакцызнага алкаголю. Добра, што ліцэнзію на фотасправы не забралі. Дапамагла вялікая колькасць галодных дзяцей.

— Ну што, — пытаюся ў Аліка, як нас выпусцілі з пастарунка, — дапамагла нам рэклама?

— Халера яе бяры, — адказвае ў роспачы Гартанюк. — Але ж на памылках вучацца. Будзем працаваць пастарому, як нашыя дзяды і прадзеды. Ды і сапраўды добры тавар, як у нас, рэкламы не патрабуе.

— Шкада толькі, што гэта да цябе позна дайшло, — усміхнуўся я і мы пайшлі па бурлівай беластоцкай вуліцы дахаты, мінаючы рэкламныя шчыты, якія тады ў Беластоку яшчэ толькі-толькі пачыналі ўсталёўваць банкіры і бізнесоўцы.

# „Ашчадны" Сяржук

Скупы плаціць двойчы. Гэтую прымаўку ведае кожны. Але не кожны жыве паводле яе. Сяржук з-пад Іўя ніколі не задумваўся пра філасофію нейкіх там прымавак. Для яго важныя былі толькі канкрэктныя факты. І калі ён сёння зарабіў тры долары, то лічыў сябе на пяцьдзесят працэнтаў разумнейшым за таго, хто зарабіў толькі паўтары. Людзі на Івейшчыне не ўсе такія. Большасць жыве паводле старадаўняга ліцвінскага светагляду. Для іх важнасць маюць не ўдзёртыя аднекуль грошы, а рэчы больш высакародныя. Прыкладам, ці паважае чалавек радню сваёй жонкі. Або ці не здурэў настолькі, што стаў выпіваць налібоцкай гарэлкі, якая вядомая па ўсёй Беларусі як бакштанская, больш, чым яго старая матуля магла выгнаць.

Сяржук мог выпіць мора, але чужым коштам. За свае грошы нават не хацеў есці. Пра такіх кажуць, што ён за капейку жабу ў Вільню пагоніць. Апошні раз я сустрэў яго ля выбарчай дзяльніцы на прэзідэнцкіх выбарах 2001 года. Спытаў за каго галасаваў.

— Супраць усіх, — адказаў ён хмура. — Няма там нармальных. Лукашэнка мяжу з Расіяй знішчыў, апазіцыянеры хочуць знішчыць мяжу з Еўропай. А як

жыць простаму чалавеку? Межы для таго, каб чалавеку было зручна. Без межаў ён загіне.

Я ледзь не памёр ад смеху. Успомніў адну старую гісторыю. А было так. Неяк надумалася група кантрабандыстаў памяняць свае машыны на лепшыя. Старыя прадалі і накіраваліся ў Нямеччыну купіць новыя. Быў у гэтай групе і Сяржук. Клопатаў з ім было больш, чым з немаўлём. Як усе ўжо прадалі свой спірт і цыгарэты, ён яшчэ лётаў па рынках і шукаў, дзе гэты тавар каштуе даражэй. Іншыя мусілі чакаць яго два дні. А таму шанцавала. Нават у нейкага выпівохі, што не меў грошай, за кілішак спірту выменяў новенькія пантофлі. Еў ён асобна ад іншых, каб не скідвацца грашамі. Так яму было танней. І ў Нямеччыне, калі ўсе ўжо купілі машыны, Сяржук усё шукаў таннейшую. Мы яму дапамагалі, бо ўжо хацелася дахаты. А раз прыехалі разам, то разам трэба і вяртацца. І знайшлі яму лепшую чым сабе. І таннейшую. А калі мы пачулі, што Сяржук хоча застацца яшчэ на дзень, каб пагандлявацца і выгадаць яшчэ колькі марак, паўскоквалі з зямлі як жабы з балота, у якім бухнуў дынаміт.

— Каб яго зямля завярнула, — зароў, што вар'ят, Юрась. — Каб яму гэтыя грошы на лекі пайшлі. Не будзем яго чакаць. Хай сам сабе радзіць.

— А я нікога ні пра што не прашу, — спакойна адказвае Сяржук, нібыта ён ужо не скраў у іншых час, нервы і сродкі. — Вы мне толькі растлумачце як ехаць дахаты.

Мы так і зрабілі. Паказалі шлях да аўтабана. Растлумачылі, што па ім ён даедзе аж да Польшчы. А там хай у людзей пытаецца.

Сяржук зрабіў так, як яму раілі. Вось толькі на аўтабане скіраваў не ў той бок. Ехаў ён доўга, пакуль не скончылася паліва і грошы на яго. І спыніўся недзе пасярод хуткаснай трасы, каля знака, які не дазваляў ехаць менш ста кіламетраў у гадзіну, блізка каля са-

май заходняй часткі Еўропы. Залез на дах сваёй машыны, сеў і заплакаў.

Першымі яго заўважылі партугальскія паліцыянты. Як толькі высветлілася, што ў Сержука няма грошай каб заплаціць за буксіроўку машыны, памаглі яму скаціць яе ўбок і хутка ўцяклі. Потым з'явіліся бандыты, якія размаўлялі па-расійску. Доўга білі небараку і як зразумелі, што грошай няма, вырвалі з машыны магнітолу і паздымалі колы. Потым не так шпарка як паліцыянты, але дастаткова хутка, зніклі за далягглядам. Затым прыехалі яшчэ нейкія расійскамоўныя. Гэтыя, убачыўшы пабіты Сержуковы твар, усё зразумелі адразу. Нічога не пыталіся, толькі забралі пантофлі і прапалі.

Чым гэта ўсё скончылася б, каб не адзін дальнабойшчык — невядома. Той прапанаваў Сержука давезці да Беларусі, але за гэта запатрабаваў аддаць яму машыну. Сяржук і плакаў, і на каленях стаяў, але на гэты раз нічога не выгандляваў. Так і даехаў да Беларусі. Без машыны, без грошай, пабіты і босы, праклінаючы тых, хто паздымаў у Еўропе нармальныя памежныя кардоны. Бо каб яны былі, то яго яшчэ на французскай мяжы завярнулі б назад. А як я заўважыў, што ён пацярпеў з-за сваёй скупасці, Сяржук адказаў:

— Не скупы я, а ашчадны. І ніколі не прагаласую за тых, хто нішчыць межы.

# Манія вялікасці

Шкада, што ніхто з навукоўцаў не вывучае псіхалогію адносінаў мытнікаў і кантрабандыстаў. Неблагая атрымалася б навуковая праца. Перш усяго, абедзве гэтыя катэгорыі людзей ведаюць, што не могуць існаваць адны без другіх. Не было б кантрабандыстаў, то навошта тады мытнікі. А не было б мытнікаў, то кантрабандыстаў таксама не стала б. Яны ператварыліся б у звычайных гандляроў-канкурэнтаў.

Такі стан рэчаў не задавальняе ні тых, ні гэтых. І таму на нейкай падсвядомасці жывуць гэтыя людзі як ваўкі адной зграі. Грызуцца паміж сабой, ды не да смерці. Але калі зойдзе паміж імі сапраўдны канфлікт, то літасці няма ні да кога.

Усё пачалося з дробнага непаразумення. Захацеў неяк мытнік, прозвішча якога Баран, закурыць. А цыгарэты скончыліся. Тут, як на бяду, на машыне наладаванай цыгарэтамі праязджаў мяжу Васіль Кароткі. Баран нават машыну не правяраў. Паставіў пячатку, што ўсё ў норме і папрасіў закурыць.

— Не куру, і нікому не раю, нават табе, — жартаўлівым голасам адказаў Васіль. І хацеў дадаць, што хоць ён і не курыць, але для работнікаў мытні ў яго заўсёды

ёсць пушка добрых цыгарэтаў. Ды вось бяда, не паспеў. Мытнік успрыняў ягоныя словы як здзек. Пачырванеў як рак і закрычаў такім пісклявым голасам, як парасё ў плоце засеўшы.

— А хто табе даў права са мной на ты размаўляць?! Ты што, лічыш сябе ўладаром усіх памежных пераходаў? У цябе што, манія вялікасці? Зараз паглядзім, курыш ты ці не. А ну гані машыну на эстакаду.

Як не стараўся давесці Кароткі, што ніякой маніі вялікасці ў яго няма, што проста няўдалы жарт атрымаўся, нічога на дапамагло. Мытнік раскруціў усю яго машыну. І дзе ні даткнецца, адусюль цыгарэты сыплюцца. Сканфіскаваў усю кантрабанду, ды яшчэ пратакол склаў, каб машыну забраць. Васіль і дахаты да яго хадзіў з торбай каньяку і перад працай чакаў з прабачэннямі. А той упёрся як бык, хоць ты кол на галаве чашы. Не ідзе на кантакт і ўсё тут.

Стаў тады Кароткі думаць, як адпомсціць. Прыйшоў да таго ў кабінет, калі Баран складаў пратакол, седзячы за камп'ютэрам, дачакаўся, калі мытнік выйдзе на хвіліну па нейкай патрэбе, залез ў камп'ютэр і за подпісам „Інспектар А. К. Баран" паставіў працяжнік і дапісаў „уладар усіх памежных пераходаў". Ды юрк у кабінет да начальніка. І давай скардзіцца на Барана. Маўляў, у Барана прозвішча брыдкае, дык ён з-за гэтага звар'яцеў. Захварэў на манію вялікасці і забірае машыны ў людзей з прыгожымі прозвішчамі. Начальнік доўга смяяўся, прагнаў Кароткага, сказаўшы: „На якія прыдумкі толькі не ідуць кантрабандысты, каб сумленнага працаўніка мытні зняславіць". Але калі інспектар Баран паклаў на стол пратакол, які быў падпісаны „А. К. Баран — уладар усіх памежных пераходаў", начальніку стала не да смеху. Спачатку ён кінуўся тэлефанаваць у шпіталь, мяркуючы, што Баран звар'яцеў. Пасля ўспомніў словы Кароткага і зароў як абкураная канаплёй сірэна.

— Ты што, баран, з глузду з'ехаў? Зусім рэпу адпіў! У цябе што, страху знесла? Я чаго цябе на работу ўзяў? Каб ты Напалеона з сябе строіў?

А Баран не разумее, чаму за адну хвіліну начальнік задаў яму больш пытанняў, чым за пяць гадоў сумеснай працы. Хацеў нешта сказаць, ды толькі горш зрабіў. Начальнік яшчэ больш раз'юшыўся і крычыць ужо да сакратаркі.

— Зінаіда Львоўна, пішы загад. Барана звольніць. Кароткаму машыну вярнуць. Але давядзіце да кожнага мытніка: як яшчэ хоць раз убачаць Кароткага на мяжы, хай трасуць яго як грушу, каб нават блахі не перавёз. І калі знойдуць хоць вош у валасах, хай афармляюць як кантрабанду.

Выйшаў няшчасны Баран ад начальніка, сеў на лаўку побач з Кароткім. Хлопцы пагаварылі, разабраліся ва ўсім, цяжка ўздыхнулі.

— Можа цыгарэтай пачаставаць? — спытаў Васіль.

— Не, — адказаў былы мытнік. — Маю свае. Можа я табе лепш піва пастаўлю.

— Якое піва, — сумна ўздыхнуў былы кантрабандыст. — Мы цяпер з табой беспрацоўныя. Трэба грошы эканоміць ды працу шукаць.

— Так, — пагадзіўся Баран. — Толькі б начальнік добры папаўся, не такі як гэты. Што ён сабе дазваляе. Аднаго звольніў. Другога загадаў блізка да мяжы не пускаць. Пасля такіх словаў, што ён казаў, сорамна жыць далей. Хворы нейкі.

— Так, хворы, — пацвердзіў Васіь. — На манію вялікасці хворы.

І хлопцы разышліся ў розныя бакі, не маючы прэтэнзій адзін да аднаго, а толькі да начальніка мытні і ягонай маніі вялікасці.

# Добрыя немцы

Я сустрэў Вадзіма Гіруця на гродзенскім рынку. У гэтым тоўстым павольным чалавеку цяжка было распазнаць былога моцнага, рухавага кантрабандыста, які мог не спаць трое сутак запар і выпіць бутэльку гарэлкі нагбом не закусваючы і не запіваючы. Цяпер Вадзім на запрашэнне прысесці за куфлем піва паказаў рукой на сэрца і з выразам моцнага шкадавання на твары паведаміў, што калі ён гэта зробіць, то дактарам дабавіцца работы. Мы проста паразмаўлялі. Вадзім, цяпер ужо сумленны прыватны прадпрымальнік, наракаў на цяжкасці сваёй прафесіі, на тое, што падатковая інспекцыя зусім звар'яцела, што санстанцыя і пажарнікі не даюць спакою, і што нават самы задрыпаны міліцыянт лічыць сваім абавязкам праверыць, як працуюць прадпрымальнікі.

— Ад гэтых міліцыянтаў спакою няма, — скардзіўся былы кантрабандыст. — Лезуць ва ўсе дзіры. Душу досталі, гады. І чаму ў нас такая паганая міліцыя? Вось у немцаў — людзі. Памятаеш, як для мяне нямецкія паліцыянты, каб не пасадзіць у астрог, рызыкавалі сваёй кар'ерай. Нелегальна пераправілі праз мяжу. Таму, што людзі. Мой лёс для іх не быў абыякавы. Не тое, што нашы, звяры.

Я амаль не задушыўся ад смеху. Толькі адвярнуўся, каб Гіруць не заўважыў гэтага. Успомніў даўнюю гісторыю. А было ўсё так.

Перацягнулі аднаго разу мы вялікую партыю спірту аж пад нямецкую мяжу. Маладыя яшчэ былі. Нічога не баяліся. Ды і час быў нейкі весялейшы. Камунізм ляснуўся. Мы, маладыя тады беларусы, толькі пачыналі вывучаць той свет, які быў на захад ад нас. Вось і занесла нас так далёка. Не таму, што там спірт даражэйшы, а больш таму, што хацелася пабачыць што там на захадзе. Усё было б добра, каб Вадзім Гіруць не „залез у бутэльку”. Піў бязбожна. Ды каб толькі піў. Увесь час у нейкія дурныя гісторыі трапляў п’яны. То разаб’е нос каму ў польскім бары, то з паліцыянтаў пачне здзекавацца. Маўляў, не дагоняць. Яго і сапраўды дагнаць было цяжка. Але ж лепш не выпрабоўваць лёс. І прасілі мы яго, каб супакоіўся, і палохалі. Усё без толку. Ну, думаем, накліча на нас бяду. А аднаго дня прапаў Вадзім. Дзе падзеўся, невядома. Знік, як трусы з плоту. Давай мы яго шукаць, людзей пытацца, ці бачылі яны здаровага п’янага беларуса. Нарэшце знайшлі. Валяўся Гіруць пасярод паліцэйскага пастарунка непрытомны. Без грошай і дакументаў. Паліцыянты як даведаліся, што мы прыйшлі па яго, вельмі ўсцешыліся, бо не ведалі, што з Вадзімам рабіць. Але хабар усё адно загадалі даваць. Мы трохі пагандляваліся з імі наконт гэтага непрытомнага цела, а пасля Толіку прыйшла ў галаву цікавая думка. Ён і кажа паліцыянтам, што грошы дамо колькі скажуць, але хай толькі папалохаюць Гіруцея. І сказаў як. Тым самім цікава стала. Яны і пагадзіліся.

Толькі Вадзім пачаў прыходзіць да сябе, адзін з паліцыянтаў стаў нешта яму гіргатаць, нібы па-нямецку. Другі паліцыянт прыкінуўся перакладнікам і на ламанай польскай мове са страшным нямецкім акцэнтам перакладае што кажа начальнік:

— З якой краіны прыехаў? Дзе аўсвайс? Дзе віза? Ты ў Нямеччыне. Хэндэ хох!

Гіруць так напалохаўся, што амаль не сказаў „Гітлер капут”. Але словы заселі ў горле.

— Як трапіў у Дойчланд? Дзе нелегальна перайшоў мяжу? За гэта турма. Мы перадамо цябе ў рукі спецслужбаў. Ты шпіён. І не прыкідвайся п’яным.

Вадзім імгненна працверазеў. Ён і, праўда, паверыў, што трапіў да немцаў. У яго мутных ад доўгіх перапояў вачах сталі мроіцца жахі нямецкіх турмаў. Прыйшлі на памяць убачаныя ў дзяцінстве кінастужкі пра фашысцкія канцлагеры.

— Хлопцы! — зароў ён як рэзаны. — Родненькія вы мае. Мой дзед за вас быў. Як я да вас трапіў, не ведаю. Мяне п’янага хіба палякі наўмысна праз мяжу перакінулі. Вы ж ведаеце гэтых палякаў. Ім абы чалавеку нашкодзіць. Пусціце вы мяне дахаты.

— Палякі сапраўды гэта маглі зрабіць, — пагадзіўся з Вадзімам „перакладнік”. — Мы добра ведаем іх паганую натуру. Але як табе дапамагчы? Будзеш ісці назад праз мяжу, напорашся на памежнікаў. Яны цябе застрэляць, а пасля і нас у суд пацягнуць. Гэта ж табе не жарты, нелегальна мяжу перайсці.

— Мяне не зловяць, — угаворвае іх Гіруць. — Я ж кантрабандыст. Для мяне межы — хата родная. Барсук так не ведае сваёй нары, як я мяжу. А каб і злавілі, то вас не выдам.

— Добра, — пагадзіўся „перакладнік”. — Мы самі цябе перавязем. Ведаем тут адну патаемную сцяжынку. Шкада нам цябе стала. А мы, немцы, людзі добрыя. Асабліва паліцыя. Але нікому не расказвай.

Пасадзілі яго ў паліцэйскую машыну, вывезлі кіламетраў дзесяць за горад, сказалі, што ўжо прывезлі ў Польшчу і паехалі. А п’яны Вадзім так і не зразумеў, што гэта былі польскія паліцыянты. Усё расказвае людзям, якія ў немцаў паліцыянты добрыя. А людзі рагочуць.

# Скупасць і зайздрасць

Кожны ведае, што скупасць ды зайздрасць — кепскія якасці. Але калі яны яшчэ і перасякаюцца, то церпяць ад гэтага ўсе навакольныя. А найперш носьбіты гэтых якасцей.

Калі нам паведамілі, што Мікола Разумны звар'яцеў, мы спярша не паверылі. Але пасля подленькая чалавечая натура пачала ў многіх браць верх. Чалавек схільны верыць у тое, у што хочацца. А Міколу далі мянушку „Разумны" якраз за тое, што ён быў адным з сама вынаходлівых і сама шанцавальных кантрабандыстаў. Каб можна было запатэнтаваць тыя вынаходніцтвы па нелегальнай перавозцы алкаголю праз мяжу, якія прыдумаў Разумны, ён стаў бы багацейшы за Біла Гейтса. Але Мікола ад скупасці стараўся трымаць свае лёсаносныя для чалавецтва вынаходніцтвы ў сакрэце. Таму яго і не любілі зайздроснікі. А зайздроснікаў, як вядома, нашмат больш, чым публікі зычлівай.

Я знайшоў Разумнага ў лесе недалёка ад Гайнаўкі. Ён сядзеў на сырой зямлі і размаўляў са сваёй машынай.

— Цяжка стала жыць, — скардзіўся Разумны. — У нас алкаголь падаражэў. У Польшчы хочуць плаціць усё танней. Працаваць стала невыносна.

Машына нічога не адказвала. Але, мяркуючы па сумным выглядзе яе тупой морды з надпісам „москвич”, было бачна, што яна цалкам пагаджаецца са сваім гаспадаром.

— Таму няма ніякага выйсця, акрамя як браць танную няякасную прадукцыю, разліваць у прыгожыя бутэлькі і выдаваць за фірмовы тавар, — працягваў дыялог з машынай Мікола. — І не глядзі на мяне так. Сам ведаю, што гэта дрэнна. Але табе гэты бруд у бак заліваць не буду. А маёй кліентуры ўсё адно што піць. Абы танней.

Хлопцы чакалі майго прыходу як манны нябеснай. Яны ведалі, што я шанаваў Разумнага. І таму, як убачылі мой сумны твар, усё зразумелі. А калі я паставіў дыягназ „паехаў мазгамі”, пачаліся „народныя гулянні”. Добрая палова прысутных заўсёды зайздросціла кемлівасці і вынаходлівасці Разумнаму. І таму, ад радасці, што пазбыліся самага моцнага канкурэнта ў сваім нелегальным бізнесе, пачалі піць бязбожна. Нават Гольдэн, у якога напярэдадні адкрылася язва страўніка, і які быў намнога скупейшы, чым Разумны, не зважаючы што лекар забараніў яму і думаць пра гарэлку, ад радасці выпіў цэлую літроўку. Ад гэтага Гольдэн амаль не даў дуба. Каб не даць яму мажлівасці працягваць гэты банкет ужо са Святым Пятром, давялося нават выклікаць лекара.

Карацей, зайздрасць цешылася з таго, што скупасць здурнела ад скупасці. Але калі назаўтра ўбачылі Разумнага жывым і здаровым, ды яшчэ з самым танным на свеце спіртам, зайздрасць амаль не задыхнулася ад зайздрасці. Зайздроснікі пачалі сачыць за кожным крокам Разумнага, каб хоць неяк яму нашкодзіць.

Я ведаў адкуль узяўся самы танны алкаголь, але маўчаў. Мікола так навучыўся яго закаркоўваць у бутэлькі з прыгожымі наклейкамі, што ні адзін эксперт не здолеў бы адрозніць гэты напой ад сапраўднага. Але калегаў-кантрабандыстаў падмануць нашмат цяжэй, чым нейкіх там экспертаў. Яны вельмі хутка ўцямілі, што тут

робіцца і толькі чакалі моманту, каб усунуць Разумнаму палку ў колы.

Доўга чакаць не давялося. Нехта падказаў нам, што недалёка ад Саколкі будзе вялікае вяселле. Гандляры алкаголем адразу кінуліся туды, каб збыць сваю прадукцыю. А самая танная была ў Разумнага. Ды не паспеў ён і двума словамі перакінуцца з пакупніком, як у размову ўлез Раман з Бераставіцы.

— Танны алкаголь — гэта добра, — робячы заклапочаны выгляд заявіў ён пакупніку. — Але ж трэба думаць і пра здароўе гасцей. А маладым гэтага піць увогуле не дазваляйце, бо вяселле можа плаўна перайсці ў паховіны.

— Ты што вярзеш, — стаў бараніцца Разумны. — Я сам і ўся мая радня толькі гэта і п’ем. І нічога не стала.

— Твая радня, — бяздомныя бамжы са сметніка, — не здаваўся Раман. — Ім усё адно што піць. А тут збяруцца людзі непрывыклыя да дэнатуратаў. Добрая палова адыдзе ў лепшы свет. Калі хочаш давесці іншае, сам выпі пры нас пляшку. А мы пачакаем, калі акалееш.

— Так, так, — стаў настойваць напалоханы да смерці пакупнік. Ён, ад усяго што пачуў, ужо ўяўляў усё вяселле, гасцей, маладых, і нават святара, які тут ніколі не адмаўляўся ад выпіўкі, ляжачымі ў адной вялікай труне. — Паспрабуй спачатку сам.

Што было рабіць. Разумны ўпэўненым рухам хапіў літроўку, зубамі здзёр корак і, прысмактаўшыся да гарляка, зрабіў некалькі глыткоў. І тут здарылася непрадбачанае. Ці то сапраўды гарэлка была кепскай, ці хлопец проста папярхнуўся, але неяк хутка пасінеў і паваліўся на зямлю. Праз хвілінку падняўся як бы нічога і не было. Але пакупнік ужо ляцеў ад нас так хутка, нібы за ім гналася сама смерць. А ў гэтай вёсцы з тае пары людзі не купілі ў кантрабандыстаў ні адной бутэлькі. Пацярпелі ўсе. І скупыя, і зайздросныя. Ды і самі людзі. Недзе праз год пасля гэтага здарэння іх пакарала паліцыя. Амаль у кожнай хаце знайшлі апарат для вырабу самагонкі.

# Як пан, то і прапаў

Праца — гэта рынак, а адпачынак — гэта пушча. Так было заўсёды для кантрабандыста, які абіраў для гандлю тэрыторыю Гайнаўскага павета. Тут свае адметнасці цяжкой працы па дастаўцы алкаголю туды, дзе яго ўмеюць рабіць самі жыхары. Могуць накачаць цябе ім па гарляк і задарма, ды яшчэ закускі нарэжуць такой, якой ты ніколі не сустрэнеш ні ў адной польскай краме. Тут, каб прадаць свае дваццаць літраў за дзень, трэба добра ведаць менталітэт мясцовага пакупніка. А вось Лявон Зінкевіч з Ваўкавыска гэтага не ведаў.

Я пазнаёміўся з ім у некалькіх метрах ад рынкавай сметніцы. Ён прыкладваў халодную бутэльку да падбітага вока, і з хмурым, як чарназём, тварам праклінаў сваю нялёгкую долю. Сіняк быў такі наліты, што здавалася Лявон зваліўся з самага высокага дуба і ляснуўся чэрапам аб камень, прычым некалькі разоў запар і тым самым месцам.

Мне якраз не было кампаніі пераначаваць у лесе. Аднаму даволі небяспечна. То бандыты па лясах блукаюць, то паліцыянты. Ды і сумна аднаму. А тут такі нечаканы падарунак лёсу — чалавек, на морду якога прыклеілася цэлая, не прададзеная і нават не пачатая літроўка спірту.

Мы распалілі агеньчык. На яго, як восы на мёд, пасунуліся яшчэ колькі гандляроў-адзінотнікаў. Усе разам павячэралі, склаўшы каля дзесятка тостаў, ды сталі абменьвацца ўражаннямі пра мінулы дзень.

— Кепскі ў мяне быў дзень, — распачаў Лявон, — ніяк не магу зразумець за што дастаў па смаркачах. А было так. Гандлюю я ў Гайнаўцы, нікога не чапаю. Наадварот, хаваюся ад усіх, каб не патрапіць у цеплыню і ўтульнасць паліцэйскай машыны. Гандаль ішоў кепскавата. І тут, раптам, падлятае да мяне адзін мужык. Пытае, ці маю гарэлку. А я толькі яе, родненькую, і маю.

— Давай чатыры, — кажа дзядзька.

Я вельмі ўзрадаваўся. „Дзенькуе пану!" — кажу. А ён мне на тое:

— Ты, прыдурак, каго панам называеш!? Яшчэ раз так скажаш, можаш ехаць гандляваць за Варшаву. А завітаеш сюды, то вып'еш сваю гарэлку сам.

Вельмі я на яго пакрыўдзіўся за гэтыя словы, але праўда, як кажуць, заўсёды на баку кліента. Прадаў яму чатыры бутэлькі і думаю сабе: „Ідзі ты дзядзька, пі, і не дуры мне больш галавы". Але ён хутка вярнуўся. На гэты раз добра падпіты.

— Давай яшчэ дзве.

— Пан, — мой найлепшы кліент, — узрадаваўся я.

А ён спахмурнеў, стаў ад злосці чорны, як зямелька.

— Ці не казаў табе не называць мяне панам. Я з Белавежы. Мы тут усе беларусы. Я дзяцей сваіх лупцую, каб гаварылі па-нашаму. А цябе зараз закапаю за такое. Зразумеў, ці не?

Я сказаў, што зразумеў, а сам стаў прыпамінаць дзе я: у Польшчы, ці пераехаў. Калі пераехаў, то куды. А ён забраў гарэлку і на развітанне па-прыяцельску ляпнуў мяне па плячы. Гэта быў першы раз, калі я адчуў моц яго шырокай жылістай лапы. Плячо і зараз ные. У мяне мільганула думка — не дай Бог злавіць яго кулак сваёй мордай. Сумаваць без яго мне не давялося. Дзесь-

ці праз гадзіну перада мной вырасла знаёмая, толькі ўжо добра падпітая постаць.

— Гэта зноў пан! — шчыра ўзрадаваўся я і сунуў яму бутэльку. — У мяне якраз апошняя засталася, толькі для пана.

І тут я другі раз адчуў моц яго рукі. Рэзануў ён мне хутка, прыцэльна, нібы калоў парсюка. У вачах зразу пацямнела. А як трошачкі стала яснець, я, лежачы пасярод гайнаўскага рынка, убачыў над сабой цьмяныя абрысы чалавека.

— Забірай сваю гарэлку і прыкладзі яе да вока, — гнеўна выдыхнула постаць, — а то праз мяжу не прапусцяць, бо ты зараз вельмі істотна адрозніваешся ад фотаздымка ў пашпарце.

Я так і зрабіў. Толькі ніяк не ўцямлю, што ад мяне хацеў гэты пан. Праўда, іншыя, здаецца, зразумелі, бо назаўтра ніхто з гандляроў, нават мясцовых, кліентаў панамі не называў.

# Сіла братэрства

Як толькі высокі брытагаловы бандыт заскочыў у наш бусік, адразу ж дастаў моцным кулаком у нос. Выціраючы кроў, ён з матамі і пагрозамі вываліўся з машыны як адстрэленая гільза з пісталета. Вакол буса скучыліся яго калегі. Выгляд у іх быў агрэсіўны. Яны зноў паспрабавалі залезці ў бус, але як мой брат дастаў доўгі бліскучы нож, вырашылі не рызыкаваць і змянілі тактыку. Сталі псіхалагічна душыць шафёра.

— Давайце нам па сто марак з кожнага і можаце ехаць, — крычалі яны ў адзін голас. — А як не, то спалім машыну. Або навядзем на вас чачэнскіх бандытаў. Тыя цырымоніцца не стануць. Пераб'юць усіх. А ты, вадзіла, аддавай ключы. А то горш будзе.

Шафёр у нас быў баязлівы і скупы. Ён так спалохаўся за сваё жыццё, а яшчэ больш за машыну, што адразу стаў падпарадкоўвацца. Давялося ўмяшацца мне. Я вырваў у яго з рук ключы, выпхнуў белага ад страху кіроўцу на заднюю сядушку і сам усеўся за руль. Дарогу машыне перагарадзіў маладзенькі блакітнавокі бандыт.

— Душы яго! — Зароў мой брат такім гучным басам, што вочы ў бандыта сталі як у савы. Адно толькі адроз-

ненне: не міргалі. Ён ледзьве паспеў ухіліцца ад буса, які нёсся проста на яго з хуткасцю ракеты.

Бандыты кінуліся на сваёй „БМВ” наўздагон. Машына ў іх была такой, нібыта нехта наўмысна мясіў яе малатком адразу як яна зышла з канвеера. І так гадоў дзесяць. Што гэта быў „БМВ”, выдавала адзінае непабітае месца на якім зіхацела эмблема гэтай фірмы.

Я выехаў на вузкую вулічку з аднабаковым рухам і, як бандыты наблізіліся да нас, даў задні ход. Наш бус прабіў сваім фаркопам радыятар „БМВ”, знёс фірмовую эмблему, а мы ірванулі наперад. Бандыты толькі махалі наўздагон рукамі.

Было гэта ў Слубіцах, на самай мяжы з Нямеччынай. Мы паехалі туды прадаць партыю спірту. А мой брат надумаўся купіць сабе машыну. Гэта ён даў у нос першаму бандыту і напалохаў астатніх нажом. Трэба сказаць, што нож у яго быў больш падобны на шаблю. Вялікі такі, бліскучы. Мала ў каго валасы не падняліся б ад страху, убачыўшы гэткі нож у здаровых лапах такога хлопца як мой брат. Я і сам, па-праўдзе сказаўшы, перапужаўся. Думаю, калі махане ім, то адляцяць галовы не толькі ў тых у каго трэба, але і ўва ўсіх, хто знаходзіцца бліжэй двух метраў ад яго. Добра, што абышлося.

Вяртацца назад было занадта рызыкоўна і мы вырашылі пашукаць шчасця ў Шчэціне. Пакуль даехалі, сцямнела. Давялося заехаць у лес на начоўку. Там, пры вогнішчы, скруціўшы шапку літроўцы спірту, хлопцы супакоіліся і пачалі разважаць як будзем начаваць.

— Трэба паставіць варту, — кажа Раман. — А то раптам бандыты яшчэ нас шукаюць. Будзем пільнымі. Зробім графік, хто калі спіць і калі вартуе.

А мне так спаць хацелася. Дай, думаю, ухілюся ад вартавання.

— Мне з братам, — кажу, — хіба вартаваць не прыйдзецца. Гэта ж мы ратавалі вашыя кішэні і скуры, па-

куль вы ад страху смаркачы жавалі. Трэба, каб астатнія гэта зацанілі.

Але тыя не пагадзіліся. Маўляў, усе вартаваць мусяць па чарзе. А хто калі, будзем цягнуць лёсы. Як я не спрачаўся, усё марна.

— Ты не нервуйся і не хвалюйся, — шэпча мне брат, схіліўшыся да вуха. — Лепш гучна, каб усе чулі, спытайся ў мяне, што нам было б рабіць, калі б якога бандыта прыкончылі. А я дам такі адказ, што спаць будзем толькі мы з табой. Рэшта будзе ўся на варце.

Я так і зрабіў. Усе прысутныя адразу перасталі спрачацца і ўважліва слухаюць.

— Ну што было б рабіць, — задумліва адказвае брат, з вялікімі намаганнямі стрымліваючы смех. — Калі б прыйшлося збіць якога бандыта машынай, ці галаву якому адарваць, то на гэтым не скончылася б. Трэба было б думаць, што рабіць з нашымі спадарожнікамі. Мы то з табой браты, адзін за аднаго гарой. Ведаем, што брат брата не выдасць. А ўсе астатнія нам чужыя. Выдалі б нас, або паліцыі прагаварыліся б, або бандытам нас здалі б. Цяжкая сітуацыя. Давялося б нам з табой, браце, і іх тут усіх закапаць, каб інфармацыя не даляцела да непатрэбных вушэй. Ды і зараз не ведаю, як з імі быць. Ці можна ім верыць. Можа, ратуючы свае скуры, данясуць на нас бандытам. Маўляў, яны ні пры чым. Скажуць, гэта вось гэтыя два браты вам машыну і морду пабілі.

Брат мне падміргнуў і зрабіў выгляд, што моцна задумаўся. Усе астатнія так збялелі, што ў лесе стала светла і без вогнішча. А месяц і зоркі здаваліся толькі бляклымі пародыямі чыстага белага святла хлопцавых твараў.

— Ну добра, сябры, — звярнуўся брат праз некалькі хвілін да аслупянелых кантрабандыстаў. Вырашайце, калі там наша чарга вартаваць. Пабудзіце мяне з братам як прыйдзе час. А зараз мы крыху паспім.

У лесе стала так ціха, што было чутна як лісты падаюць з дрэў на зямлю. Раман нават праглынуў непатушаную цыгарэту. Астатнія толькі глядзелі адзін на аднаго, але нічога не маглі вымавіць. Штосьці з голасам стала. А мы з братам улегліся ля вогнішча і спакойна праспалі ўсю ночку. Ніхто нас не будзіў вартаваць. І акрамя нас ніхто не спаў. Усе вартавалі. Толькі невядома каго ад каго. Ці то нас ад бандытаў, ці сябе ад нас.

# Навуковец-гандляр

Толькі гультай на пачатку дзевяностых гадоў не з'ездіў прадаць пару ганучаў ці бутэльку гарэлкі ў Польшчу і зарабіць за раз два, а то і пяць тагачасных беларускіх месячных заробкаў. Цягнікі на захад не маглі змясціць усіх ахвотных папоўніць свой сямейны бюджэт. Хто толькі не ціснуўся ў вузенькія дзверы польскага дызеля. Сціплыя хатнія гаспадыні і расфуфыраныя канторскія дамачкі, шустрыя студэнты і настырныя пенсіянеры, загарэлыя вяскоўцы і бледныя навукоўцы. Кожны марыў хоць трошкі зарабіць на свае сціплыя патрэбы. Жыццё было такое. А магчымасці адкрываліся вялікія. Савецкі Саюз разваліўся, межы адкрылі. Воля.

Ладзік Нікановіч, нядаўні выпускнік гродзенскага гістфака і вельмі перспектыўны малады навуковец, гледзячы як яго калегі, што з'ездзілі за мяжу, могуць дазволіць узяць за абедам лішнюю катлету, таксама захацеў хоць раз у жыцці наесціся чаго хоча і колькі хоча. Праўда, Нікановіч усімі сваімі вантробамі ненавідзеў гандлярства. Яму больш даспадобы было капацца ў архівах. Але той час быў дзіўным. З'ездзіць з таварам за мяжу было не толькі прыбытковай справай, не толькі

данінай модзе, але і пэўным абавязкам. Прынамсі, так лічылі ў Гродне.

Выйсця не было. Ладзік распытаў спрактыкаваных кантрабандыстаў, што лепш везці на беластоцкі рынак, пазычыў грошы, накупляў тавару і рушыў на захад у суцэльным патоку гродзенскіх гандляроў. Ад пачатку яму было ніякавата. Ужо на гродзенскім вакзале Ладзік зразумеў, што ўзяўся не за сваё. Усё тут было нязвыклым і незнаёмым. Калі ў агульнай мітусні і тузаніне выпадкова наступіўшы камусьці на нагу ці штурхануўшы плячом якую жанчыну, ён прасіў прабачэння, на яго глядзелі як на вар'ята. А як ён з'явіўся на беластоцкім рынку ў белай кашулі і адпрасаваных портках, мясцовыя кантрабандысты пачалі ставіцца да яго з павышанай падазронасцю і насцярогай. Але кульмінацыяй яго гандлярскай дзейнасці стала размова з пакупнікамі. Ладзік ведаў колькі замежных моваў, у тым ліку і польскую. Але загаварыў чамусьці па-англійску (пасля ён тлумачыў сябрам, маўляў, за мяжой усе ведаюць англійскую мову і так прасцей будзе паразумецца з пакупнікамі). Гандляры беластоцкага рынку сталі рагатаць і круціць пальцамі ля скроні. Казалі, што будзе ў гэтага „ангельца" гандаль, як мокрае гарыць. Павязе, маўляў, ён дахаты ўсё, што прывёз. Ды якое было іх здзіўленне, калі пакупнікі пацягнуліся да Ладзіка. Ніхто не мог растлумачыць гэтага феномена. А ў Ладзіка тавар разыходзіўся як пясок скрозь пальцы. Дзіва было на ўвесь Беласток. А Ладзік быў шчаслівы. Яму так нялёмка было стаяць з ганучамі, а яшчэ больш сорамна гандляваць гарэлкай і цыгарэтамі, што аддаваў свой тавар не гандлюючыся. Колькі прапаноўвалі грошай, за столькі і прадаваў. Абы хутчэй з рук збыць.

Гандляры спярша не маглі ўцяміць, чаму да Ладзіка чарга, а да іх аніводнага пакупніка. Некаторыя пачалі рабіць высновы, што той зачараваў свой тавар у нейкай бабкі-шаптухі. Іншыя пачалі такое шанцаванне атаясам-

ляць з валоданнем англійскай мовай. Найбольш практычныя пайшлі паглядзець на свае вочы, што там робіцца. І тут іх абурэнню не было межаў.

— Ты што кошты збіваеш!? — зараўлі яны ў адзін голас. — Зусім страху знесла? Не ведаеш што цану трымаць трэба?

— А скуль мне ведаць вашыя цэны? — адказвае Ладзік, і яшчэ хутчэй пачаў прадаваць, і яшчэ танней, каб толькі закончыць ненавісны яму занятак.

Гандляры паглядзелі, што дамовіцца з гэтым чалавекам у гальштуку немажліва, параіліся паміж сабой і самі купілі ў Ладзіка ўсё, што засталося. Паразбіралі тавар і пачалі прадаваць удвая даражэй. Чарга пакупнікоў таксама разышлася па ўсім рынку і пачаўся звычайны, як заўсёды, гандаль на зразумелых усім, і палякам, і беларусам, мовах. Аніякай англійшчыны і аніякіх танных рэчаў. А Ладзік ледзьве не самлеў ад шчасця, што менш чым праз гадзіну гандлю ў яго не засталося аніводнай рэчы. Праўда, настрой трошкі сапсаваў той факт, што грошай за прададзены тавар было менш чым да яго закупкі. Нават не ўлічваючы выдаткаў на дарогу. Але Ладзік усё адно быў задаволены. Па-першае, яму ўдалося зрабіць нешта акрамя навукі. Па-другое, гэты ненавісны для яго занятак скончыўся хутчэй, чым ён меркаваў. А сама галоўнае — ён з’ездзіў на беластоцкі рынак і гандляваў там. Як усе гродзенцы. Цяпер было што расказаць і з гонарам сядзець у кожнай гродзенскай кампаніі.

# Каханне кантрабандыста

Першым прапанаваў сустрэць Новы год сем'ямі Віталік Клімовіч. Маўляў, мы, кантрабандысты, добра ведаем кожны кожнага. Работа такая. Час ад часу патрабуе яна супольных высілкаў ды абмену інфармацыяй. Дапамагаем адзін аднаму, падстрахоўваем. Амаль радня. А вось сем'ямі так ніколі і не збіраліся. Паколькі ўся нашая тусоўка была ўжо някепска пад шафэ, то прысутным ідэя спадабалася. У такім стане кожная ідэя падабаецца. Неяк, напіўшыся, нават падтрымалі аднагалосна прапанову вылучэння са сваіх колаў кандыдатуру на пасаду прэзідэнта, каб той легалізаваў кантрабандную дзейнасць і каб плацілі нам пенсію за нашую цяжкую працу, як састарэем. Тады пра гэтую добрую ідэю як праспаліся, так і забыліся. На гэты раз знайшліся супрацоўнікі адразу.

— А як быць з нежанатымі? — паставіў у тупік усю кампанію Юрка. — З кім яны прыйдуць?

— У нас халасцяк толькі Валерка Загорскі, — паспрабаваў знайсці выйсце з тупіковай сітуацыі Янка. — Можа ён да Новага года ажэніцца? Ну, дзеля нас. Яшчэ амаль тыдзень застаўся. Паспее як захоча. Прызнавайся, Валерка, маеш якую лярву? Як не, то падкі-

нем пару-другую на выбар. І ўвогуле, ці кахаў ты калінебудзь? Прызнавайся. Цябе, такога моцнага двухметровага бугая наўрад ці каханнем праб'еш.

— Давай, расказвай, — загаласіла п'яная кампанія. Як людзі выпіваюць у цёплай хаце, то ўсе гавораць, а ніхто не слухае. А як зімой, у лесе, у чужой краіне, ды яшчэ з багажом кантрабанднага тавару, то ўсё наадварот. Хочацца паслухаць.

Валерка спахмурнеў. Сеў бліжэй да вогнішча, выпіў шклянку спірту. Закурыў. У заснежаным начным лесе стаяла ціш, як у куратніку без пеўня. Толькі вогнішча зрэдку патрэсквала.

— Жаніцца я, хлопцы, не буду. Нават дзеля вас, — распачаў свой аповед Загорскі. — А што да кахання, то аднойчы было. Тут няважна, двухметровага ты росту, ці метр з шапкай на абцасах у скачку. На тонкі доўгі жаночы волас слана злавіць можна, не тое што чалавека. Так я быў моцна закаханы, што больш ужо не паўторыцца. Памятаеце, як пераход на „Бабры" пасля рамонту адчынілі? Наважыўся я тады паглядзець, можа там справы лепш пойдуць. А то на нашым пераходзе мяне ўжо кожны сабака ведае. Паехаў я туды, наладзіў сувязі з мясцовымі кантрабандыстамі. Даведаўся ўсё як мае быць. І каб аддзячыць хлопцам, якія мяне інструктавалі, захацеў для іх закаціць баль у Свіслачы. Гулялі мы добра. А пасля мяне як чорт штурхануў. Пайшлі, кажу, куды на танцы. Тут якраз высветлілася, што непадалёку вяселле спраўляюць. Мы туды і пасунуліся. А там яна. Прыгожая такая. Ніколі не забудуся. А паходка — не ідзе, а піша. Правай нагой піша, а левай закрэслівае. Так хораша хадзіла. Закахаўся адразу. Ды і яна мяне ўвагай не абдзяляла. Я ад такога шчасця нават не заўважыў, што хлопцы на мяне неяк коса глядзець сталі. Дзе там тады было да хлопцаў. Душа спявала. Нарэшце я парадую сваіх старых бацькоў, паказаўшы ім Лену. А то ўжо даўно мяне душылі. Жаніся, кажуць, аглобля

ты доўгая. У каго толькі пайшоў, прыдурак. Рабіць не хочаш. Толькі па замежжах катаешся. А бульбу капаць няма каму. Можа як ажэнішся, паразумнееш.

Што са старых возьмеш? Прывыклі з баразны не вылазіць. І хочуць каб я так жыў. А ў мяне душа лятаць просіцца. Ну добра, не пра гэта зараз. Парадую, думаю, старых. На такой прыгажуні ажанюся. На яе не тое, што мужыкі, сабакі аглядваліся як ішла па вуліцы. Я нават думаў, што як прапаную выйсці за мяне, адмовіцца. Але ж не. Узрадавалася, цешылася, прызналася ў каханні. Я такой мілай, бяскрыўднай, добрай істоты на свеце не бачыў. Здавалася, гэтае бездапаможнае дзяўчо мухі не зможа скрыўдзіць.

Бацькі мае, як убачылі Лену, палюбілі яе нават больш чым мяне. Усё казалі, што цяжка ёй будзе са мной. Надта ж яна слабенькая і падатлівая. Не хапае ёй злосці. Замяккая. А я шалеў ад гэтага імгненнага ўзаемнага кахання з першага позірку. Знаёмыя менш тыдня, а ўжо пра вяселле думаем. Жыць не можам адзін без другога. Я нават нічога пра яе не спытаў. Ні дзе жыве, ні дзе працуе. Стан быў такі. Цэлы тыдзень нерэальнага ўспрымання свету.

Неяк у панядзелак яна сказала, што ў яе скончыўся адпачынак і трэба ісці на працу. Я таксама падумаў, што пара зарабляць грошы на вяселле, наладаваў машыну спіртам і рушыў за мяжу. Ужо перад памежным пастом зразумеў, што дзень будзе няўдалы. Кантрабандысты, з якімі я нядаўна пазнаёміўся, не тое што гаварыць — вітацца са мной не хацелі. Адзін толькі праз зубы са злосцю вымавіў, што я небяспечны чалавек і здраднік. Прыехаў, маўляў, і ўлез у давер да ўсіх. І да кантрабандыстаў, і да мытні. Я нічога не мог зразумець, пакуль не ўбачыў Лену. Яна была апранутая ў мундзір супрацоўніка мытні і правярала машыны. Куды толькі падзелася такая мілая майму сэрцу лагоднасць. Голас яе быў рэзкі, каманды кароткія. У маіх вушах і зараз

гучыць, як яна размаўляла з людзьмі. „Адкінь сядушку, раскруці дзверы, што вязеш, не прапушчу, машыну на яму!”. Гэта было нешта жахлівае. Я ўбачыў зусім іншую жанчыну. Агрэсіўную, бязлітасную, жорсткую. Раскіраваўшы машыну, я кінуўся да хлопцаў.

— Што ж вы не папярэдзілі? — пытаю.

— А ты не ведаў? Гэтая сцерва ў нас ужо не адну машыну сканфіскавала. А хабар як бярэ. Толькі давай. А ты нас кінуў і да яе. Выбірай, Валерка, кім ты будзеш заўтра. Ці паважаным усімі людзьмі кантрабандыстам, ці мужам гэтай.

Так скончылася маё каханне. Я доўга не думаў. Развязаўся адразу. Вось і сяджу зараз з вамі ў холадзе. Але не шкадую. У нашым жыцці свой смак.

Валерка змоўк. Толькі Янка парушыў цішыню:

— Ведаеце што, хлопцы. Адсвяткуем Новы год самі, без жонак. Так будзе лепш.

# Бельска-Падляшскія жарсці

Мне толькі гэтага не ставала. Не паспеў я, стомлены як калгасны конь, пасля чарговай паездкі ў Польшчу, заплюшчыць вочы і хвілінку адпачыць, як у хату з бадзёрымі воклічамі ўварваўся Міша Гарэль:

— Едучы па галоўнай трасе нашай планеты Баруны — Бельск-Падляшскі, у галаву стрэліла думка ўзяць цябе. Падымайся. Няма калі спаць — трэба працаваць.

Я зрабіў выгляд, што не чую. Але пасля таго, як Міша працягваў крычаць пра тое, што хто не працуе, той не есць, і хто рана ўстае, таму Бог дае, ды многа чаго іншага, зразумеў, што прыкінуцца нябожчыкам не атрымаецца. Перакінуўшы праз плячо торбу спірту, мне давялося пасунуцца да яго машыны. Яна, пад цяжарам цвікоў, лемяхоў ды іншых жалязякаў аж распляскалася на дарозе, як манета на рэйках, пераеханая цягніком. Але перад самой мытняй Міша запхнуў у пружыны па драўлянай калодцы. Машына паднялася, нібы ў ёй не толькі тавару, а нават шафёра ніколі не было.

Часы тады для кантрабандыстаў былі цудоўныя. Мытнікі чапляліся толькі да алкаголю і цыгарэтаў. Усё астатняе іх мала цікавіла. Таму на пытанне, што мы вязём

у шасці дваццацілітровых каністрах, Міша, не маргнуўшы вокам адказаў:

— Паліва. Едзем да радні на самы захад Польшчы. Там купляць дарага, вязём сваё.

Мытніку нават у галаву не прыйшло, што там можа быць самагонка. А вось кульгавы дзядок на рынку Бельска-Падляшскага зразу ўцяміў, што там тое, па што ён і прыцягнуўся.

Не паспелі мы напоўніць дзеду яго алюміневы кубак, як каля машыны выцягнулася доўгая чарга. Хто стаяў з пустой бутэлькай ад напою, хто з імбрыкам, а хто ўвогуле з пластыковым пакетам. Людзі кідалі грошы ў Мішаву шапку і настойвалі, каб мы працавалі хутчэй. Мы і так стараліся. Нават не было калі грошы лічыць. Міша наліваў з каністры ў посуд розных памераў і формаў, а я стараўся неяк упарадкаваць чаргу, бо некаторыя ўжо падыходзілі па некалькі разоў і, як сталыя кліенты, патрабавалі для сябе ільготаў. Неўзабаве з'явіліся і паліцыянты.

— Ну што, гарэлачку прадаем? — суровым голасам спытаў старэйшы.

— Ды вы што, — кажу, — якая гарэлка. Людзі выпіць хочуць, а ў нас выпадкова з сабой самагонка была, беларуская. Заканадаўства ж не забараняе людзей частаваць.

На пачатку ад такога нахабства ў паліцыянтаў заняло дух. Але пасля таго, як мы ім прапанавалі ўзяць на праверку літр нашай прадукцыі, а чарга настойвала, каб яны не перашкаджалі нам выконваць свае абавязкі, старэйшы ўзяў з сабой паўтаралітровік і сказаў:

— Я ведаю, што гнаць самагонку ў Польшчы забаронена. Ды вось сумняваюся наконт таго, ці можна частаваць людзей прывезенай з Беларусі.

Такі адказ задаволіў усіх. Гандаль пайшоў яшчэ жвавей. Чарга расла і калі праз нейкі час павесялеўшыя паліцыянты вярнуліся, п'яныя кліенты сталі настойваць,

каб яны навялі парадак у чарзе. Маўляў, многія лезуць без парадку. Адзін з паліцыянтаў, які ўжо ледзь стаяў на нагах, папярэдзіў нас, што калі не будзем трымацца справядлівасці, прагоніць нас з рынку.

Усё ішло як па масле. П'яныя былі ўсе: гандляры, пакупнікі, мы з Мішам, паліцыянты, работнікі рынку... Сам рынак нагадваў адно вялікае вяселле, на якім шлюбяцца не менш дзесятку параў. Здавалася, нішто ўжо нам не пагражае, ды вось падвёў кульгавы дзед. Ён, шахнуў чарговы кубак гарэлкі і нечакана, схапіўшыся за сэрца, зваліўся на зямлю, выбіўшы прытым галавой з рук нейкага небаракі слоік самагонкі. Мы з Мішам пачалі падымаць старога, які ўжо амаль не дыхаў. Небарака настойваў, каб яму вярнулі тры літры самагонкі. З чаргі гучалі настойлівыя патрабаванні, каб мы кінулі абодвух і вярнуліся да справы.

Дапамаглі паліцыянты. Яны дадумаліся выклікаць карэтку. Лекары кінулі старога ў машыну і праз хвіліну падышлі з нейкімі медычнымі посудамі, каб купіць таннае „паліва". Але п'яная чарга стала сцяной.

— Станьце ў хвост, як усе людзі, — запатрабаваў здаравенны мужык, — без чаргі не пусцім.

— Але ж мы на працы, — сталі прасіцца дактары. — У нас чалавек у машыне памірае.

Ды ніхто не хацеў слухаць. Некаторыя нават казалі, што хай той дзед лепш здохне, бо з-за яго была затрымка амаль на паўгадзіны. Нават на паліцыянтаў, якія заступіліся за дактароў, ніхто не зважаў. Ім сказалі, што яны гарэлку бралі задарма і цяпер хай маўчаць. Мы ўжо баяліся, што дойдзе да бойкі, і тады каму-каму, а нам лычы начысцяць.

На шчасце канфлікт суцішыў сам кульгавы дзед. Ён, як нічога і не было, выйшаў з лекарскай машыны са сваім кубкам і стаў у хвост чаргі. Лекары паслухмяна сталі за ім...

# Майстэрства хабару

— Нам, кантрабандыстам, грэх скардзіцца на лёс, — пераехаўшы мяжу, заявіў свайму калегу загарэлы парушальнік мытнага права з дзесяцігадовым стажам гэтай небяспечнай прафесіі. — Тым, хто нас правярае, стала жыць яшчэ больш невыносна, чым нам. Мне іх часам бывае нават шкада. Нарабілі зараз усялякіх спецслужбаў, якія цікуюць за супрацоўнікамі мытні, як воўк за авечкамі. Яны цяпер як сапёры — могуць памыліцца толькі адзін раз. Жывуць на адну зарплату. Хабар браць баяцца. Жах!

— Як ёсць галава, то сам чорт табе не брат. Заўсёды можна штосьці прыдумаць, — не пагадзіўся непаголены сонны калега. — Галоўнае — трошкі мазгамі варочаць. Памятаеш Толіка Загорскага?

— Былога кантрабандыста, які ўладкаваўся ў міліцыю, што пасецца на дарозе Гродна — Беласток, як цялушка ў лубіне? Памятаю. Нешта чуў, што яго праваахоўныя органы цягалі за хабар.

— Ну дык слухай. Стукнула неяк Толіку ў башку, што займацца нелегальшчынай для яго занадта клопатна. Саскочыў ён з кантрабанды і нейкім чынам уладкаваўся ў міліцыю. І дамогся, каб яго пры мяжы

паставілі. Як кажуць — пусцілі казла ў агарод. Ён жа ўсе сакрэты кантрабандыстаў ведае. Сам такі быў. Ну і пачаў душыць былых калегаў. Пераправярае машыны, здзекуецца. Зусім азвярэў, жывёла. Хабар браў не саромеючыся. Не вытрымалі хлопцы такой абразы. Данеслі на гэтую паскуду спецслужбам. Маўляў, убіўся як карова ў бульбу і толькі кішэні сабе набівае. Ніякага сораму.

Ну а кадэбэшнікам толькі гэта і трэба. Паслухалі яны, што могуць узяць хабарніка без напругі, як кажуць „голымі рукамі", ды і задумалі спецаперацыю па выяўленні несумленнага міліцыянта. Узялі машыну на расійскіх нумарах, бо ведалі, што Загорскі найбольш прыкалупваўся да расійцаў, наклалі, не хаваючы, тавару і давай парушаць на дарозе ўсё, што можна парушыць.

Спыніў іх Загорскі, праверыў дакументы ды кажа:

— Рыхтуйце, маскалі, грошы. Вы столькі зараз напарушалі, што штрафы будуць большыя, чам машына з усім вашым таварам каштуе.

— Можа як дамовімся, — пачаў прыдурвацца кіраўнік спецаперацыі. — Мы не скупыя. І бабла ў нас хопіць, каб купіць усю гродзенскую міліцыю.

— Я заўсёды гатовы пайсці людзям насустрач, — не саромеючыся пагаджаецца міліцыянт. — Толькі хабару я не бяру. Хадземце лепш у буфет. Нальеце мне шклянку добрага каньяку, бо галава баліць, на гэтым і разыдземся.

У буфеце Толік паказаў пальцам на самы дарагі каньяк, які сабе нават Ракфелер піць не дазваляе. Нібыта парушальнікі плацілі, а буфетчыца толькі паспявала наліваць. Як Загорскі выжлукціў другую бутэльку, кадэбэшнікі дастаюць пасведчанні і тыкаюць імі Толіку ў нос:

— Ну што, казёл, папаўся. Цяпер за хабарніцтва давядзецца пыхцець.

— Пра які хабар размова? — здзіўлена пытаецца Толік.

— Каньяк піў?

— Не.

— Як не. Буфетчыца бачыла.

— Нічога я не бачыла, — закрычала буфетчыца, паказаўшы свае гнілыя зубы, ад чаго і супрацоўнікі спецслужбаў, і нават Загорскі з агідай адвярнуліся.

— Ага! — узрадаваўся кіраўнік спецаперацыі. — Ды мы ў дадатак да хабарніцтва раскрылі яшчэ і змову. Дзіраўце хлопцы пагоны для новых зорачак! А Загорскага на экспертызу. Там скажуць, піў ён ці не.

Пасля таго, як доктар, праверыўшы кроў, мачу і сліну міліцыянта, паставіў дыягназ, што Толік ужо як мінімум тыдзень не ўжываў спіртнога, афіцэр КДБ узрадаваўся яшчэ больш.

— Ды тут усе падкупленыя. Мы раскрылі цэлую мафію. Дзіраўце хлопцы яшчэ і мундзіры для ордэна. А Загорскага ў паліклініку КДБ. Там зробяць праўдзівы аналіз.

Але калі і там доктар пацвердзіў, што міліцыянт цвярозы як шкло ў яго акулярах, кадэбэшнік зароў, што звар'яцелы бізон:

— Мы ж самі бачылі як гэты гад выдзьмуў дзве бутэлькі.

— Вашых сведчанняў замала, каб склеіць справу, — сумна адказаў доктар. — Прыйдзецца Загорскага адпусціць.

Хвілін праз пяцьдзесят Загорскі зноў завітаў у буфет.

— Толічак! — узрадавалася буфетчыца. — Адпусцілі цябе тыя злыдні. А я так пераймалася, так маркоцілася...

— Не было чаго, — хмура адказаў Загорскі. Я вынайшаў такую сістэму як браць хабар, што Эйнштэйн са сваёй тэорыяй адноснасці прызнаў бы інтэлектуальную паразу. Лепш давай грошы. Колькі там мы сёння накасілі.

— Як заўсёды, Толічак. І як заўсёды дваццаць адсоткаў мае.

Загорскі палічыў грошы, сунуў іх у кішэнь і папрасіў наліць каньяку. Але як толькі ўзяў у рот, скрывіўся і выплюнуў вадкасць на падлогу.

— Ты што мне наліла, дурная баба! — зароў ён. — Я казаў каньяку, а не гэтай зафарбаванай пад каньяк вады, якую я мушу піць літрамі штодзённа, каб так браць хабар, што ніхто не зможа гэтага даказаць. Не бачыш, што я ў такім стане, што мне трэба выпіць чагосьці сапраўднага.

# Ратаўнік басейна

Дзіцячыя наіўныя мары пра будучую працу вартыя надзвычай дакладнага і дэталёвага навуковага вывучэння. Дзеці ўспрымаюць работу як чарговую гульню. Толькі нашмат цікавейшую, чым забавы іх малагадовага веку, калі вечна заклапочаныя такой дурнотай як камунальныя выплаты ці што купіць на вячэру іх хмурыя бацькі нахабна абмяжоўваюць чыстыя і рамантычныя дзіцячыя жаданні. Дзеці мараць стаць касманаўтамі, міліцыянтамі, вайскоўцамі, ці нават амерыканскімі індзейцамі, наіўна мяркуючы, што гэта таксама прафесія. Іх мары — гэта па сутнасці правобраз нейкага зямнога раю. На жаль, дарослыя людзі чамусьці губляюць на рай усе надзеі і пачынаюць сваім дзеткам з маленства ўдалбеньваць у галовы, што жыццё вельмі цяжкая і нікому непатрэбная рэч. І што яны таксама нікому не будуць патрэбныя, калі не адмовяцца ад дзяцінства і не стануць з маленства думаць, якая ў іх некалі будзе пенсія. Калі гады пачынаюць браць сваё, а людзі чужое, маладыя юнакі і дзяўчаты пад папрокі ўсё тых жа бацькоў: „А мы табе казалі думаць раней!”, пачынаюць мітусліва шукаць свайго месца пад сонцам і канчаткова забываюцца пра нядаўнія перакананні, што свет зроблены для іх. Ды бываюць і выключэнні.

Алік Гартанюк не толькі спрабаваў жыць гуляючы, але і пераконваў у гэтым іншых. Прайшоўшы ўсе колы пекла на дзяржаўных працах, вытрымаўшы здзекі кіраўнікоў і падманы палітыкаў, што абяцалі працоўнаму класу даць такое жыццё, дзе не трэба працаваць, Алік паспрабаваў рэалізавацца як асоба ў кантрабанднай справе. З тае пары жыццё імкліва паляцела ўгару, як заяц ад лісы. Гартанюк сцвярджаў, што гэтая прафесія ёсць яго пакліканнем, і што кожны мусіць рабіць тое, да чаго мае здольнасці ад прыроды. А яго здольнасці да кантрабанднай справы былі як у маладога жарабца-мустанга сярод кабылак арабскай пароды.

Я вельмі шанаваў гэтага двухметровага бугая з арліным носам і вечна налітымі гарэлкай вачамі. Гэта быў першы грамадзянін Польшчы, якога я сустрэў упершыню едучы за мяжу. У той дзень яго, п'янага, абакралі на гродзенскім рынку. Таму ён упрасіў мяне сказаць ягонай жонцы, што грошы пакінуў у Беларусі, каб пазней купіць нейкі звышпрыбытковы тавар, бо Алікава жонка даўно развіталася з дзіцячымі марамі, была асобай прагматычнай, і пагражала мужу забаронай ездзіць за мяжу, калі не перастане піць. Маўляў, гэтая прафесія, вечна пры алкаголі, давядзе Аліка да згубы.

А вось дзеці цешыліся з бацькавай работы. Здадуць з раніцы бутэлькі, ды накупляюць сабе што хочуць. Жартавалі, што каб бацька не піў, то і хлеба не было б за што купіць. А так за здадзеныя бутэлькі хапае і на цукеркі.

Ды надышоў час, калі жонка азвярэла як ваўкалак ля замка Дракулы. Не пусціла яна больш мужа за мяжу, уладкавала праз знаёмых зноў на дзяржаўную працу — ратаўніком у беластоцкім басейне. Кажа, хай сядзіць на вышцы, ды назірае як дзеткі купаюцца. Вышэй ужо толькі чэрці скачуць, таму не будзе ў каго гарэлкі папрасіць. Ды пралічылася. Былыя калегі-кантрабандысты хутка даведаліся дзе шукаць Гартанюка, і пацягнулі туды свой вадкі тавар. Так, на тэрыторыі беластоцкага ба-

сейна, на ратаўнічай вышцы, паўстала самая вялікая ў горадзе кропка гандлю кантрабандным алкаголем.

Усё ішло як найлепей. Людзі тупаліся каля басейна, сунуліся на вышку. На першы погляд складвалася ўражанне, што гэта самае працавітае месца ў Беластоку. Але аднаго дня Алік перабраў. Паплыло ў яго вачах як пасля цэглы па галаве, і ён у стане летаргічнага сну паляцеў з вышкі галавой уніз, як каршун на мыш. А за ім паляцелі цэлыя, пустыя і недапітыя бутэлькі. У адно імгненне басейн ператварыўся ў мару рыбака — бутэлечкі плавалі як паплаўкі, ззяючы на сонцы бліскучымі закруткамі, а на самым дне, у куце дзіцячай воднай радасці прылёг утапенец. Ляжаў ціха, як у салодкім сне. Нават нагамі не дрыгаў.

Напалоханыя дзеці паднялі лямант, паскідвалі з сябе надуўныя колы і ратаўнічыя камізэлькі ды давай дбаць пра дзядзьку, які працаваў ратаўніком. Падняць з дна басейна стотрыццацікілаграмовую тушу было не так проста, але дзеці справіліся. А як Алік адчыніў вочы, пасля доўгага змагання за яго жыццё медыцынскіх спецыялістаў, ён убачыў перад сабой добрыя сяброўскія твары. Тут была і жонка, і знаёмыя кантрабандысты, і кліенты, што куплялі гарэлку, і нават дырэктар басейна.

— Алік, чаму ты сам не спрабаваў выплыць, — спытаўся апошні.

— Таму што кожны павінен займацца тым, да чаго мае здольнасці, — спакойна адказаў Гартанюк. — Я мушу займацца кантрабандай. Гэта маё. А біць рэкорды ў водным спорце — хай лепш мая жонка. Яна хоць трохі плаваць умее. А я нават не спрабаваў вучыцца.

# Хто „падставіў” Косцю Крываноса

Толькі я выйшаў з хаты, як мяне ледзь не збіла машына. Яна, невыносна для слыху, запішчала тармазамі і спынілася так блізка ад мяне, што падалося чую пульс шафёра. Але кіроўца не пераймаўся гэтай сітуацыяй. Ён, не звяртаючы аніякай увагі на мой белы ад жаху твар, радасна выскачыў з машыны і лётаў вакол яе як з ланцуга сарваўшыся. Барабаніў рукамі па бензабаку, нагамі па колах, і штосьці, захлынаючыся ад шчасця, тлумачыў. Да мяне паступова сталі вяртацца некуды адляцеўшыя ад страху зрок, слых і душа, і праз некалькі хвілін я мог ужо ўсё чуць і бачыць.

Перада мной вакол машыны танцаваў Косцік Крываноc. Ведаў я яго даўно. З таго дня, як яго выгналі з міліцыі (з яго слоў за чэснасць), ён пастанавіў займацца кантрабандай. Гэта быў вельмі вынаходлівы і вельмі эмацыйны хлопец. Усе яго прыдумкі, як лепш схаваць кантрабанду, суправаджаліся такім выбухам эмоцый, што здавалася ён атрымаў стопрацэнтныя гарантыі жыць дзвесце трыццаць два гады і сем месяцаў, увесь гэты час заставацца маладым, а пасля, незалежна ад таго як

жыў, патрапіць у рай. Яго эмацыйны стан заўсёды суправаджаўся бязмежным паглынаннем алкаголю, пры якім Крыванос сваім коштам паіў усіх сяброў. І паспрабуй толькі адмовіцца. Крыўды будзе да наступнага моманту разгулу эмоцый.

Увогуле Косцік амаль не ўжываў алкаголю. Ведаў, што гэтае зелле адбівае яму мазгі. Дурны тады рабіўся, як дзіравы бот з левай нагі. Таму злоўжываў беленькай толькі з дзвюх прычын: калі яго наведае муза вынаходніцтва, і калі яго прыдумка церпіць фіяска.

— Сёння стаўлю я! — безапеляцыйна заявіў Косця. — Мне неверагодна пашанцавала. Купіў я гэтую машыну, „форд-гранада" называецца. Іх ужо даўно не робяць. Палез глядзець, дзе ў ёй можна схаваць кантрабанду… І, о неба! Паглядзі які тут бензабак. Прытыкаецца да задняй сядушкі, таму на прастукванне ні адзін мытнік не вызначыць што там, бензін ці цыгарэты. Я ўжо перарабіў яго. Два літры бензіну ўлазіць, а рэшту закладаю цыгарэтамі. Ніхто не вызначыць. А зараз збірайся, паедзем адзначым.

— Ну то віншую, — адказваю я. — Толькі не трэба пра гэта крычаць. Мала які гад пачуць можа. Падставяць цябе як калодку пад сякеру. Зараз свет такі. Столькі развялося стукачоў-зайздроснікаў, адзіная жыццёвая мэта якіх — нашкодзіць бліжняму.

Ды дзе там. Крыванос і слухаць не стаў. Праз гадзіну, шчодра наліваючы ў шклянкі гарэлку, ён апавядаў пра сваё вынаходніцтва ўсёй кантрабанднай супольнасці. А назаўтра, ужо перайшоўшы на чысты спірт, наняў шафёра і паехаў выпрабаваць навінку на практыцы.

Гэта была няўдалая спроба. Кантрабанду знайшлі вельмі хутка. Нават не краналіся іншых месцаў. Адразу палезлі ў бензабак. Косцік у роспачы, у той жа дзень, залёг на дно бутэлькі. Кантрабандысты сталі шукаць стукача. Трэба ж даведацца, хто данёс. А то ўсіх выдасць.

Першым у спісе падазроных быў шафёр, які вёз Крываноса. Чалавек ён у асяродку кантрабандыстаў новы,

невядомы. Іншыя ўжо гадамі правераныя. Хлопцы доўга не думалі. Злавілі яго на вузкай гродзенскай вулачцы ды начысцілі лыч.

— Ах вы, сабакі! — абураўся той, выціраючы разбіты нос. — Як я мог данесці на Косцю, калі ён мой швагер. Родны брат маёй жонкі. Вы ў мяне яшчэ зямлю грызці будзеце, жывёлы! Хай толькі Косця са шклянкі выпаўзе. Ён вам усім пакажа. На каленях прабачацца будзеце.

Аргумент быў на карысць шафёра. Сапраўды, хто сваяку шкодзіць будзе. Ды і гарачы характар Крываноса быў вядомы. Кантрабандысты на ўсялякі выпадак папрасілі прабачэння адразу і зноў пачалі вылічваць хто гадзюка. Хутка спіс западозраных перавысіў колькасць саміх кантрабандыстаў. Але аніводзін дэдуктыўны метад прыдуманы намі не прыносіў поспеху. Хлопцы сталі не давяраць адзін другому. Замкнуліся ў сабе. Кожны кожнага баяўся.

— Далей так доўжыцца не можа, — кажа аднаго дня Юзік Сабалеўскі. — Хутка мы сваіх анёлаў-спадарожнікаў падазраваць пачнём. А наша праца патрабуе даверу. Трэба разабрацца, як і што.

— А хто супраць! — у адзін голас зараўлі хлопцы. — Толькі як гэта зрабіць. Крыванос па-ранейшаму купаецца ў гарэлцы, шафёра пакрыўдзілі. У каго спытаеш?

— У мытнікаў. Бачыш, двух з той змены не ведаюць як да Гродна даехаць. Давай падвязем. А там, глядзіш, можа што ўнюхаем.

Так і зрабілі. У машыне завялі размову. І як бы мала гэта нас цікавіць, але паколькі няма пра што гаварыць, спыталіся пра Крываноса. Мытнікі, як пачулі гэтае прозвішча, амаль са смеху не зайшліся.

— Гэта было ў маю змену, — кажа адзін. — Гляджу, спыніўся „форд-гранада". А з яго вылазіць такі п'яны і шчаслівы чалавек, нібы ў яго цешча з'ехала далёка і назаўсёды. Падлятае да нас і кажа, што такое месца знайшоў для кантрабанды — ні адзін мытнік не разга-

дае. І яшчэ сказаў дзе яно. Мы спярша думалі, што ён жартуе. А пасля глядзім, ён не арыентуецца з кім размаўляе. Пайшлі, праверылі, а там сапраўды кантрабанда. І што сама дзіўнае: гэты Крыванос быў „ніякі” — нічога не памятаў. Ні як да нас зайшоў, ні як расказваў пра сховішча ў машыне. Толькі як мы бак знялі, крыху працверазеў ды кажа: „Хто мяне падставіў? Нехта данёс, бо самі вы нізашто не здагадаліся б”.

# Залаты цягнік

Калі вы ў дзевяностыя гады дваццатага стагоддзя ні разу не ездзілі ў Польшчу цягнікам, які ў народзе з захапленнем называлі „спіртавоз”, то ніколі не зможаце належным чынам адзначыць кемлівасць кантрабандыстаў. Хіба толькі паверыце таму, што я напішу.

Як толькі адкрылася крама бязпошліннага гандлю алкаголем на гродзенскім вакзале, увесь запас алкаголю, які гаспадар крамы меркаваў прадаць цягам месяца, раскупілі за дваццаць пяць хвілін і восем секунд. Прайшлі гады, пакуль мытныя службы Польшчы зразумелі, як яго перавозілі праз мяжу гродзенскія хлопцы. І то, гэта адбылося выпадкова. З-за тэхнічных непаладак цягніка. Але пра гэта трошкі пазней.

Цягнік тады хадзіў з Гродна ў Беласток. Кантрабандысты праходзілі беларускую мытню, куплялі алкаголю ў „паміжмытнай” краме столькі, колькі яго там было, і цягнулі яго ў цягнік. Там яны адкручвалі ўсё, што адкручвалася, здымалі абшыўку, разбіралі столь, выкручвалі сядушкі, і ўсе пустоты, прадугледжаныя канструктарамі вагонаў для нейкіх, незразумелых звычайнаму чалавеку мэтаў, запаўнялі бутэлькамі з прыгожымі этыкеткамі. Квіткі куплялі толькі да Кузніцы. У мэ-

тах канспірацыі. Прайшоўшы польскі мытны кантроль, кантрабандысты выходзілі з цягніка, набывалі на кузніцкім вакзале квіткі ў Беласток, сядалі разам з польскімі пасажырамі зноў у гэты цягнік і па дарозе выцягвалі свой тавар. Большая частка гарэлкі прадавалася на месцы, у цягніку. Многія жыхары Саколкі і іншых вёсак толькі дзеля гэтага і заходзілі ў вагоны. Выпаўзалі адтуль ужо вясёлыя, з чырвонымі мордамі, падтрымліваючы адзін аднаго пад рукі. А польская паліцыя правярала ў пасажыраў з усходу торбы і ламала галаву, адкуль бярэцца гарэлка. І ніколі не здагадалася б, каб не адзін выпадак.

Было гэта неяк летам. Гарачыня невыносная. Кантрабандысты прайшлі кантроль беларускай мытні і, падышоўшы да любімай крамы, былі прыемна ўражаныя. Гаспадар „дуці-фры" нарэшце зразумеў, што гарэлкі купяць колькі будзе, і на гэты раз патроіў свае запасы. Хлопцы накуплялі яе столькі, што ледзьве дацягнулі да цягніка. Пахаваўшы яе там, вырашылі адзначыць кілішкам-другім інтэлект гаспадара крамы.

— Вып'ем за здароў'е гэтага чалавека, які паставіў краму з гарэлкай паміж беларускай і польскай мытнямі, — прапанаваў Яўген. — Гэта ж наш кармілец.

— І паілец, — дадаў, закурваючы цыгарэту, Віцька. — А таксама трэба выпіць за здароўе канструктараў гэтага цягніка. Гэта ж залаты цягнік. Дзякуючы яму зарабляем. Гэта ж тунель з алмазамі, эльдарада, залатыя прыскі, кландайк!

— І за тых, хто гэты маршрут прыдумаў, — падхапілі хорам астатнія. — І за рамонтнікаў, і за стрэлачнікаў, і за рабочых вакзалаў, і за нашых пакупнікоў...

Тосты адляталі як зубы ад кулака. Праз нейкі, даволі хуткі час, з далоняў п'яных кантрабандыстаў пазнікалі маленькія дарожныя кілішкі. Іх замянілі літровыя бутэлькі. Нават кандуктар, што запатрабаваў паказаць квіткі, замест іх атрымаў у рукі адкаркаваную літроў-

ку. А як вадкасці ў тым посудзе паменела напалову, ён ужо не патрабаваў доказаў аплаты праезду. Толькі прасіў, каб не курылі. Ды дзе там. За дымам ужо і кандуктара не было бачна.

Шкада, што яго не паслухалі. Не здарылася б тое, што здарылася. Вагон загарэўся. Нічога страшнага. Падгарэў трошкі, і ўсё. Патушылі хутка. Ніхто ад гэтага не пацярпеў. Але цягнік у Беласток не паехаў. Сумныя хлопцы сядзелі на вакзале ў Кузніцы і, папракаючы адзін другога, назіралі, як іх тавар разам з цягнікам накіроўваюць на запасныя пуці, каб праверыць ці не пашкодзіў чаго агонь.

— Бяда, — прастагнаў Яўген. — Гэтыя правяральшчыкі — не мытнікі. Яны вышэйшай адукацыі не маюць. Кансерваторыяў не канчалі. Затое маюць добры нюх, як у сабакі, і інтуіцыю, як у бабкі-шаптухі. Гатовы паспрачацца хоць з кім — знойдуць яны нашу гарэлку.

Гэта была трагедыя. Усе разумелі — не пабачаць яны свайго тавару, як уласнай патыліцы. А як з цягніка сталі далятаць п’яныя песні рамонтнікаў, зусім замаркоціліся. Адна толькі была ўцеха — рамонтнікі пілі за здароў’е кантрабандыстаў.

У той дзень на кузніцкай чыгунцы ніхто не працаваў. Паліцыя збірала работнікаў як грыбы пасля сляпога дажджу. Каго на рэйках знаходзілі, іншых каля пуці. Але большасць пазасыналі ў „залатым цягніку”. Казалі, што гэты цягнік цэлы тыдзень там стаяў без руху. Кіраўніцтва польскай мытні нібыта сваіх супрацоўнікаў туды вадзіла як у музей на экскурсію, каб навучыліся дзе кантрабанду шукаць. А яшчэ казалі, што менавіта пасля гэтага выпадку змянілі маршрут. Больш гэты цягнік у Беласток не пусцілі.

# Пятніца трынаццатага

Калі каму-небудзь даводзілася перасякаць мяжу на пачатку дзевяностых гадоў у пятніцу трынаццатага, то ён мог на свае вочы пераканацца, што кантрабандысты тых часоў былі народам даволі забабонным. Доўгія і нудныя, як прамовы савецкіх кіраўнікоў, чэргі кудысьці знікалі. Мала хто рызыкаваў у гэты дзень шукаць шчасця. Кожны меркаваў, што хутчэй нажывеш праблемаў на сваю дурную башку, чым здолееш нешта зарабіць.

Праўда, знаходзіліся і такія, хто на справу глядзеў больш прагматычна, не звяртаючы ўвагі на патаемнатаямнічыя запалохванні малаадукаваных бабулек. Максім Гіль быў з такіх. Ён ганарыўся дзвюма рэчамі. Першая, што паходзіў са старой праваслаўнай сям'і, для якой смех бацюшкі пра перажыткі паганскіх забабонаў быў большым аргументам, чым засцярогі баязлівых малаазумеючых рэлігійныя каноны калегаў. Другая, што ён кантрабандыст у сёмым калене. Маўляў, у яго крыві і генатыпе ад продкаў перададзена ніколі не падманваючая інтуіцыя, якая беспамылкова інфармавала калі трэба сунуцца на мяжу, а калі лепш перачакаць няўдалую пару ў якой-небудзь гродзенскай забягалаўцы, паставіўшы па куфлю піва двум-тром канчаным алкашам

з чырвонымі тварамі, сінімі насамі і рукамі, якія вечна трасуцца. Або свайму суседу мытніку, які па ўсталяванай беларускай звычцы паважаць суседзяў, заўсёды, перад тым як прапусціць без праверкі машыну Гіля, вітаўся з тым за руку. Максім ганарыўся сваёй прафесіяй і сваімі законанепаслухмянымі продкамі. Ён сцвярджаў, што яго славутыя прашчуры пачалі перавозіць кантрабандныя цыгарэты яшчэ да таго, як Калумб першы раз убачыў тытунь у амерыканскіх індзейцаў. А дарога з Гародні на Беласток была вузкай звярынай сцяжынкай, і ніхто не мог нават у жахлівым сне ўбачыць, што калісьці яе перасячэ ўзараная паласа з калючым дротам. Таму славутая кантрабандная біяграфія яго сям'і пачыналася яшчэ на старажытным шляху з варагаў у грэкі. І калі сёння ён, чалавек з настолькі жудаснай, нават для памежных рэгіёнаў рэпутацыяй, хоць на адзін дзень спыніць працэс пераробкі беларускага спірту ў грошы народа ЗША з-за нейкіх старадаўніх перажыткаў, такіх як баязлівасць пятніцы трынаццатага, то яго геніяльныя продкі пераварачваюцца ў трунах.

Руслан Зелянкевіч быў суседам славутага кантрабандыста і па сумяшчальніцтве яшчэ і звычайным інспектарам мытні ў першым калене, які абараняў на мяжы эканамічныя інтарэсы дзяржавы і падрабляў нявыплатай падаткаў ад атрымання дробных хабараў у выглядзе пляшкі гарэлкі ці блока цыгарэтаў. Гэтая добрадушэўная звычка выпіваць пасля працы за свае паслугі пляшку-другую з сябрамі супрацьлеглай прафесіі, нечакана ператварылася ў неабходнасць штодзённай ранішняй пахмелкі.

У гэты дзень ахвотныя наведаць адзін з гродзенскіх рэстаранаў мусілі гадзінамі соўгацца па горадзе ў пошуку вольных месцаў. Усе бары былі забітыя кантрабандыстамі. Выхадных дзён у людзей, што маюць гэтую работу з ненармаваным графікам, не так і шмат. Таму пятніца трынаццатага, калі наведванне мяжы лепш пакінуць памежнікам, звычайна выкарыстоўвалася дзеля паг-

лынання таго, што ў працоўныя дні лічылася таварам. А сучаснадумаючы Гіль з тае нагоды, што няма памежных чэргаў, меў надзею наведаць суседнюю краіну разоў пяць. Тым больш, што на мытні яму як заўсёды падаў руку сусед. Толькі нешта адразу пайшло не так.

— Гані машыну на яму, для спецагляду, — паміраючым голасам прастагнаў Зелянкевіч. Па перакошаным ад болю твары было бачна, што сёння мытніку яшчэ не давялося пахмяліцца. — Выбачай, але завітала нейкая праверка. Трэба паказаць, што я працую. А іншых машын няма. Не едзе сёння чамусьці ніхто.

Максімава нахваленая інтуіцыя нічога кепскага не западозрыла. Але, калі пераехаўшы мяжу, ён адкрыў адмыслова зробленае ў машыне сховішча для спірту, то брудная лаянка хлынула з яго горла як у грузчыка з таварнай станцыі Ласосна. Сховішча было пустое. Гіль разьвярнуў машыну і паляцеў шукаць помсты. Руслана на працы ўжо не было. Знайшоўся той у хаце, седзячы на канапе са шклянкай празрыстай вадкасці ў руках.

— Ты што гэта, брыда, суседа абкрадаеш? — прывітаўся яшчэ раз з мытнікам Максім. — Іншых няма, ці што?

— Не крычы. Мяне з-за тваёй гарэлкі з работы папёрлі, — спакойна адгукнуўся Зелянкевіч. Стан дзікага болю галавы і ламання касцей у яго плаўна, мінаючы звычайную чалавечую норму, пераходзіў у нірвану. — Сёння адзін ты швэндаўся паміж дзвюма славянскімі краінамі. Вось я і вырашыў пазычыць пару бутэлечак у цябе. А паколькі кантрабандыстаў не было, правяральшчыкі ўзяліся за мытнікаў. Знайшлі гарэлку і папрасілі мяне больш на працу не хадзіць. А чаму ніхто больш не ездзіў?

— Ды гэтыя дурні спалохаліся забабонаў. Сёння пятніца трынаццатага.

— Што ж ты мне раней не сказаў!? Прыдурак! І я работу не згубіў бы, і ты захаваў бы сваю гарэлку ды суседа мытніка ў дадатак. У народныя прыкметы трэба верыць.

# Сага пра сала

Першы раз я ўбачыў Толіка Гордзея, калі ён накладваў у свой старэнькі „запарожац" сала. Вось дзівак, падумаў я. Валачэ ў Польшчу, у беластоцкія вёскі прадаваць прадукт, якога там свайго не ведаюць куды дзець. Нават пашкадаваў яго тады. Ці ж ён здолее зарабіць, мяркую, хоць на дарогу. Каб я быў мытнікам, то хутчэй за ўсё выклікаў бы „псіхушку", каб падлячылі нейкага паўдурка з поўным багажнікам сала.

Другі раз мы сустрэліся недзе праз год. Толік рабіў тое самае, што і пры першай нашай сустрэчы, толькі замест „запарожца" стаяў „мэрседэс". І не такі ўжо стары. На той момант пра Гардзея ў асяродку кантрабандыстаў ужо хадзілі легенды. Вельмі спакойны, адукаваны, культурны. Куды б не паехаў і што б не рабіў — заўсёды мае пры сабе пару-другую кніжак. І не якіх-небудзь там забаўляльных раманчыкаў кшталту „Каханне на снезе ў летнім садзе", а штосьці такое як „Гісторыя філасофскай думкі першабытнага чалавека". Хлопцы яго паважалі. Сцвярджалі, што той упісаў у гісторыю беларускага кантрабанднага руху новую старонку. Салавую.

Толік ніколі нічога не прасіў. Наадварот. Дапамагаў іншым як мог. Паколькі сам не вазіў на продаж алкаго-

лю (ён нават яго не піў), то заўсёды прапануе перавезці некаму дазволеную норму. Хлопцы, каб аддзячыць, хацелі дапамагаць Гардзею з салам. Маўляў, можаш невялікімі кавалкамі ў нашыя машыны накідаць, каб на мяжы не чапляліся. Але той адмовіўся. Кажа, хай кожны сваім займаецца.

Некаторыя кантрабандысты, гледзячы як добра ў Гардзея ідуць справы, таксама паспрабавалі „падсесці" на сала. Ды не туды тое. Колькі прывезлі на рынак, столькі павезлі назад. Ніхто кавалачка не купіў. Ніхто ў іх бок не глянуў. А ў Гардзея праз гадзіну ўжо пустая машына.

Пасля таго як заходнія еурапейцы задурылі палякам галаву пра шкоднасць тлустай ежы, сала ў Польшчы стала таннейшым чым у Беларусі. І тады Толік стаў вазіць яго ўжо з Польшчы ў Беларусь. І зноў, сярод мноства гандляроў салам, Гардзей самы першы прадаваў сваё, і сама даражэй.

— Растлумач ты нам феномен свайго поспеху, — спыталіся неяк у яго хлопцы. — Колькі ты зарабляеш на тым сале? Які быў найбольшы прыбытак? Чаму табе так шанцуе?

Мы тады начавалі ў лесе, недалёка ад Крынак, што на Беласточчыне. Толік адклаў у бок кніжку, паглядзеў на зоркі, трохі бліжэй падсеў да вогнішча і распачаў свой аповед.

— Няма, хлопцы, аніякага феномена. Ды вы, я гляджу, слаба арыентуецеся, што гэта такое феномен. А скуль поспех? Ды проста любіць сваю работу трэба. Я люблю сала. У нас на Астравеччыне ўсе яго любяць. І не толькі есці, а як факт самога існавання гэтага прадукту. Я з-за сала нават на хахлоў злы. Нас, беларусаў, кожны сусед стараўся нечым абдзяліць. Палякі хочуць прысвоіць сабе Касцюшку, рускія сцвярджаюць што Дастаеўскі іхны. Літоўцы ўвогуле лічаць, што гэта яны на Грунвальдзе былі. А ўкраінцы замахнуліся на самае святое. Называюць сала сваім нацыянальным прадуктам.

А сапраўднага сала, на дзве далоні, як у нас на Астравеччыне нават у вочы не бачылі. Купляюць яго ў мяне, бо не кожная кабета са сваім дзіцём так няньчыцца, як я з салам. Я, перш чым даткнуцца да сала, дзесяць раз рукі памыю. Пасля акуратна яго пачышчу, парэжу роўненька. Усю душу ў гэты працэс укладаю. Закручу ў белае. А ў іншых што? Кавалкі няроўныя, нібыта сала рэзаў тупой бензапілой п'яны вар'ят. І ляжыць тавар на брудных ганучах. Ды і сам гандляр, нярэдка, стаіць з нямытымі лапамі, ды яшчэ смаркачы па мордзе размазаўшы. Хто ж у яго купіць тое сала? А найдаражэй я прадаў свой тавар аднаму міліцыянту. Было гэта зімой. Купіў я ў Беластоку сала і вязу праз мяжу. Не хацелі мяне прапускаць. Кажуць, нашмат больш нормы, каб яны пагарэлі са сваімі нормамі. Але як мытнік пабачыў, што я з любоў'ю тое сала перакладваю — злітасціўся. Прапусціў. Ды не паспеў я ад'ехацца ад мяжы, як нейкі міліцэйскі кантроль спыніў. Панараблівалі іх, кантроляў, не разбярэшся якія для чаго. Хутка ніхто працаваць не будзе. Усе толькі кантраляваць. Залез нейкі п'яны міліцыянт да мяне ў машыну і талдычыць, што такая колькасць сала — гэта кантрабанда. Будзе, маўляў, і мне, і таму хто мяне прапусціў. Каб цябе пярун забіў, думаю, каб цябе зямелька завярнула. Але маўчу. Вельмі таго мытніка стала шкада. Добры чалавек. Прапусціў без хабару. Толькі за чалавечае стаўленне да сала. Давай я адкупляцца. Можа, прапаноўваю, чым мяне караць, трохі сала вазьміце на закуску. А міліцыянту толькі гэта і хацелася пачуць. Скінуў ён рукавіцы, паклаў мне ў багажнік і давай здаровым нажом над салам здзекавацца. Кожны кавалак палавініць. І большую палову сабе ў машыну кідае. Так амаль усё і перакінуў. Аж слязу ў мяне выбіла. І не так таго сала шкада. Хай бы елі сабе на здароўе. Але ж так з ім абыходзіцца. Варочаць нямытымі лапамі, кідаць у брудную машыну. Каб вы задушыліся тым салам, думаю. Каб

яно вам папярок гарляка стала. Так я і прыехаў дахаты ў роспачы. Палез у машыну, каб забраць што засталося, гляджу, а міліцыянт свае рукавіцы забыўся. Узяў я іх, а там, бачу, нейкі патаемны кішэнь ушыты. Палез я туды, а там долары. Ды столькі, што сем разоў купілі б яны тое сала, што ў мяне забралі. Добра, думаю, накантралявалі кантралёры. Ну, а мне матэрыяльная кампенсацыя, што мусіў глядзець як над салам здзекуюцца, нібыта гэта не сала, а якіясь слімакі ці крэветкі, што дэлікатэсамі называюць. Ну вось, хлопцы, і ўся гісторыя, і ўвесь феномен. Проста, калі любіш тое, чым займаешся, то гэта заўсёды аплаціцца.

# Лідскія авантурнікі

Спатрэбілася тры дні чакання ў доўгай памежнай чарзе, каб лідскія хлопцы, Лявон, Сяржук і Мар'ян, зразумелі, што да запаветнага моманту перасячэння беларуска-польскай мяжы застаецца не менш тыдня.

— Так мы пяты не нагрэем, — заявіў у роспачы Лявон. — Тут мясцовыя кантрабандысты няведама што вырабляюць. Лезуць без чаргі, як міністр у бардэль, а ты стой тут аж да сканчэння свету. Трэба і нам спрабаваць штосьці мяняць.

— Палезлі і мы нахабна, як усе нармальныя людзі, — прапаноўвае Мар'ян. — Чаго нам звяртаць увагу на гродзенцаў, калі яны нас не заўважаюць. Робім морду плугам, прыкідваемся кучай смецця і наперад.

— Ага, глядзі, — не пагаджаецца Сяржук. — Дастанем па смаркачах і зноў станем у хвост чаргі. У гродзенскіх тут усё схоплена. Паўсюль знаёмыя. Ды іх тут значна больш чым нас. Мусім дзеіць не цвердалоба і шукаць ражна на свой азадак, а перамагчы гэтых самаўпэўненых цецерукоў інтэлектам.

Лявон з Мар'янам перакінуліся здзіўленымі позіркамі. Яны недзе чулі слова „інтэлект", ды нават ведалі, як ім здавалася, што яно значыць. Але пачуць гэта

з вуснаў Сержука не чакалі. Ды яшчэ вось так, проста, нібы той апавядаў пра прычыны непазбежнасці эканамічнага крызісу еўрапейскіх краін з-за павышэння коштаў акцый нафтавых кампаній Амерыкі. Лявон нават напужаўся. У галаве мільганула думка, што ў Сержука хутчэй за ўсё праблемы з мазгамі — перамёрз, хіба, на марозе.

— Можа не будзем нічога лішняга выдумляць, — прапаноўвае ён, — а проста падыдзем да міліцыянта, які кантралюе чаргу, і купім у яго талончык. І без праблемаў паедзем без чаргі. Многія так робяць. На гэтых талонах некаторыя зарабілі больш, чым жыд на золаце. Таму міліцыя з памежнікамі вечна варагуюць, якая служба павінна сачыць за парадкам і выдаваць талоны з нумарам у чарзе. Спекулююць тымі талонамі як хочуць. Прадаюць направа і налева. Бойкі за гэты прывілей дапаўзлі ажно да міністэрскіх кабінетаў. Вядома ж, прадаўцы талонаў дзеляцца са сваім начальствам. А аднойчы, распавядалі неяк слонімскія хлопцы, міліцыянты і памежнікі за права на валоданне тымі талонамі за зброю хапіліся. Амаль не перастралялі адзін аднаго.

— Вось! — радасна закрычаў Сяржук. — Вось што нам трэба! Купляем у міліцыянта талоны, ксерым іх, апранаемся ў міліцэйскія мундзіры і самі пачынаем тыя талоны прадаваць. Гэта тое, на чым і трэба зарабляць. І за мяжу ездзіць не трэба, дзерці свой пуп за пару смярдзючых златовак.

— Гэта авантура, — спалохаўся Мар'ян. — Зловяць і пасадзяць.

— Не смяшы мяне і не нервуй, — „супакоіў" яго Сяржук. — Ніхто нас не зловіць. Галоўнае, як мундзіры апранем, быць цвярозымі як ксёндз у нядзелю. Па-першае, іх талоны — звычайная папера з пячаткай. Зробім такую, што ніхто не адрозніць. А каб і злавілі нас, то што? Яны ж самі незаконна спекулююць тымі талонамі. Скандал ім непатрэбны. Адпусцяць нас і ўсё на гэтым.

На наступны дзень тры новыя „міліцыянты” пачалі гандляваць „талонамі”. Па дваццаць долараў за адзін. Людзі куплялі іх і ехалі за мяжу без чаргі. Хлопцы толькі паспявалі складваць грошы. Ні сапраўдныя міліцыянты, ні памежнікі не адрознівалі іх падробленых талонаў ад арыгіналаў. Толькі на трэці дзень нейкі кантрабандыст, купляючы квіток у сапраўднага міліцыянта, спытаўся, чаму ў таго талоны па трыццаць долараў, а ў міліцыянта на пачатку чаргі на дзесяць даляраў таннейшыя.

Праз паўгадзіны кантрабандысты на памежным пераходзе Брузгі — Кузніца назіралі дзіўную з’яву. Каля пятнаццаці міліцыянтаў, з ашалелымі ад злосці і нянавісці тварамі, „мясілі” трох сваіх калегаў. Білі іх нагамі, рукамі, палкамі і нават прыкладамі аўтаматаў. Шкода было тую тройку, але кантрабандысты не ўмешваліся. Палічылі, што міліцыя чагось не падзяліла між сабой. І хутчэй за ўсё прыбытку за „левыя” талоны.

Яшчэ праз гадзіну тры збітыя ў горкі яблык хлопцы, у падраных міліцэйскіх мундзірах, ехалі на машыне з Гродна ў Ліду.

— Казаў табе, што пападземся, — уздыхнуў адзін.

— І што? — адказаў іншы. — На нас усё зажывае як на сабаку. Затое зарабілі за гэтыя тры дні больш, чым за паўгода гандлярства.

— Што праўда, то праўда, — адгукнуўся трэці, прыкладваючы мокрую ганучу да разбітага носа. — Трэба яшчэ штосьці такое прыдумаць. На такіх авантурах, я бачу, найлепшы прыбытак.

# Парасончыкі для дурняў

— Дзе гэта на грошы ўзбіцца? — застагнаў у роспачы, седзячы ў коле сяброў ля начнога вогнішча Мікола Зязюля. — Працуеш, рызыкуеш, увесь час на нервах, а прыбыткі мізэрныя. Доля наша кантрабандысцкая нікуды не вартая. Ворагу не пажадаеш такую. А пакупнік стаў які разумны. Хоча купіць у цябе танней, чым ты сам набыў. Каб іх, гэтых разумнікаў, пярун пабіў. Дзе знайсці якога дурня, якому танны тавар можна было б усунуць па вялікім кошце. Хапнуць добрую касу адразу, ды рвануць куды адпачыць на мора.

— Не ты першы дурняў шукаеш, — хітра ўсміхнуўся Мішка Шлейцар. — Але наконт гэтага ёсць тры цікавыя прымаўкі. Адна ўкраінская. Яна сцвярджае, што няма такіх вар'ятаў, якія б'юць вокны ў сваёй хаце. Другая — наша, беларуская. Можа чуў калі: дурны, дурны, а сала любіць. Трэцяя належыць беларускім габрэям. Думаю, ніхто не сумняваецца, што яны людзі разумныя…

Хлопцы зацікавіліся той мудрасцю, а Зязюля нават настойваў, каб пачуць:

— Ну давай, адукуй нас.

— Ды вось неяк давялося выпадкова пачуць яе, — адказаў Шлейцар. — А гучыць тая мудрасць так: кож-

ны дурань — дурань на сваю карысць. Я нават мог бы вам цікавую гісторыю на гэтую тэму расказаць, але спаць пара.

— Якое там спаць, — загаласілі ў адзін голас сямёх кантрабандыстаў, што сабраліся на начлег ля ляснога агеньчыка. — Ноч доўгая. Давай, апавядай.

— Добра, раскажу, — пагадзіўся Мішка. — Толькі так сядзець і слухаць — камары заядуць. Прапаноўваю прапусціць па кілішку. Скідваемся на літроўку?

З гэтымі словамі ён дастаў з машыны бліскучую бутэльку гарэлкі, а рэшта прысутных палезлі ў кішэні па грошы.

— Гісторыя такая, — пасля трэцяга тоста няспешна пачаў расказчык. — Ведаў я аднаго хлопца, які збіраўся зрабіць бізнес на дурнях. Клікалі яго Косцік. Шукаў усё нейкі танны падроблены тавар, а прадаваў як фірмовы. Балазе, памежжа дапамагала. То з аднаго боку мяжы такі тавар з’явіцца, а на другім яшчэ не разнюхалі, што гэта ліпа. То з другога боку нешта прывабнае на рынак выкінуць. Так ён і нажываўся на недасведчанасці людзей. У яго ўся радня такая была — ашуканцы. Але ж заўсёды знойдзецца хтосьці больш хітры і спрактыкаваны...

Расказваў Мішка павольна, з вялікімі перапынкамі на тое, каб выпіць яшчэ кілішак. Усё падрабязна распавёў пра сям’ю таго хлопца і нават пра яго продкаў. Праўда, прыходзілася часта перапыняцца, каб агучыць чарговы сакавіты тост, бо аповед быў такі доўгі, што Шлейцару ўвесь час даводзілася лезці ў машыну па чарговую бутэльку. Але падпітыя кантрабандысты самі патрабавалі гэтага і з радасцю скідваліся на дабаўку. Прыемна так сядзець у лесе ля вогнішча... У добрай кампаніі, пад цікавы аповед...

— Вось і на гэтага ашуканца знайшліся мудрэйшыя. Неяк прывезлі кітайцы на гродзенскі рынак прыгожыя парасончыкі. Зразумела, што пра якасць гаварыць не

трэба, але лэйбы нашытыя ўсе фірмовыя. Ды і прыгожыя яны, парасончыкі, прывабныя такія. А кошт — як задарма. Скупіў Косцік усю партыю і давай прадаваць у Польшчы як фірмовыя. Навар разоў у трыццаць. А людзі не ведаюць што падробка, ды купляюць. А тут яшчэ шчасце падваліла. Прыпёрся нейкі дурань, ды купіў усе парасончыкі адразу. Косцік з тае радасці і грошы не праверыў. А як пайшоў у банк мяняць на долары, то трапіў адразу ў паліцэйскі пастарунак. Выявілася, што грошы фальшывыя. Ды такой кепскай якасці была падробка, што ў параўнанні з тымі грашамі кітайскія парасончыкі сапраўды фірмай здаваліся. Так што хлопцы — няма дурных. На гэтым не разбагацееш. Ну што, сябры, ужо раніца. Сонца падымаецца. Стаміўся я. Пайду спаць.

Уся вясёлая кампанія, акрамя Мішкі, пасмяялася і пачала збірацца на рынак. І тут Міколу Зязюлю як хобатам па галаве стукнула.

— Вось дзе гад, — выдыхнуў ён.

— Што здарылася? — пытаюцца хлопцы.

— Што-што? А вы не зразумелі. Мы п’яныя, не выспаныя, збіраемся на рынак сваю гарэлку прадаваць. Рызыкаваць будзем, працаваць, трэсціся, каб на паліцыянтаў не нарвацца. А Шлейцар спаць пайшоў. А чаму? Бо сваю ўжо прадаў. І каму? Нам, дурням, як байкі распавядаў. А мы, раскрыўшы хлябальнікі, слухалі і ў кішэні па грошы лазілі. Ведае ён, хіба, яшчэ адну мудрасць, чацвёртую — як на дурнях бізнес рабіць. Толькі нам, прыдуркам, яе не здрадзіў.

# Жарты лёсу

Пятрусь верыў у свой лёс. Хто яму наманіў пра шчаслівую зорку, якая можа не згасаць усё жыццё — невядома. Можа бабуля, што яго выхоўвала, не зусім ладзіла з галавой. А мо якая шаптуха-варажбітка чаго напрыдумляла. Толькі Пятрусь быў перакананы ў поспеху кожнай справы, за якую браўся. А на людзей, што сцерагліся бяды, глядзеў як дзіця на вар'ята. Ды яму сапраўды шанцавала. Асабліва на грошы. І ў латарэю неаднаразова выйграваў, і ўсё нейкія старыя сваякі яму спадчыну пакідалі. А як заняўся кантрабанднай справай, грошы пасыпаліся як спелыя сліўкі пасля ўдару аб ствол п'янай галавой. Ад таго, што Пятрусь вырабляў на мытні, іншыя аматары нелегальнага перавозу саракаградуснага тавару прыходзілі ў жах. Іх новы калега амаль не хаваў „вясёлага зелля". Прыкрые трошкі якой старой кашуляй і перавязе ўсім на дзіва. Ні беларускі мытнік, ні польскі, якраз там не праверыць, дзе гэта зараза ляжыць. І такімі колькасцямі за раз перавозіў, што другі за месяц не рызыкнуў бы.

Хлопцы яго папярэджвалі, каб не надта на лёс разлічваў. Маўляў, сёння лёс дасць у рукі, а заўтра дасць у плечы. Ды той і слухаць не хацеў. І да грошай так ставіў-

ся, нібы яны на яго кішэні намагнічаныя. Куды не шпурляні — усё адно вернуцца. Галоўнае, як казаў Пятрусь, іх у справу ўкласці. Грошы робяць грошы і ўсё на тым.

Ды не ўсё кату Масленіца. Пазычыў Пятрусь камусьці амаль усё што назбіраў. Спакусілі вялікія працэнты. А той чалавек рвануў некуды ў Канаду і адрас „забыўся" пакінуць. Няшчасны крэдытор спачатку знерваваўся, але вера ў свой шчаслівы лёс пацягнула яго на чарговую авантуру. Нейкія брытагаловыя хлопцы прыбытковую справу прапанавалі. Прыгнаць з Нямеччыны шалёна дарагі джып. І грошы далі. І на машыну, і на заробак. Самі ехаць яны не маглі. Іх не тое што на мытні, у прыбіральні арыштуюць, калі пазнаюць.

Пятрусь прыкінуў, што толькі на гэтай справе пакрые нядаўнія страты і з радасцю пагадзіўся. Але, калі на мытні сунуў руку ў кішэнь, дзе ляжалі грошы, каб перахаваць, збялеў як мядзведзь, які жыве на паўночным полюсе. Грошай не было. Першы раз у жыцці Пятрусь запанікаваў. Ён не ведаў што рабіць. Адно было напэўна — брытагаловыя не даруюць.

Пятрусь нервова перавярнуў усю машыну. Думаў, можа дзе грошы заваліліся. Некалькі разоў пераправерыў усе кішэні. Усё марна. Заставалася адно — падмануць брытагаловых. Балазе яны стаялі за шлагбаумам і за ўсім назіралі. План быў просты. Трэба было, каб мытнікі затрымалі Петруся, а брытагаловыя гэта ўбачылі. Тады можна будзе хоць нейкі час выйграць, сказаўшы, што грошы сканфіскавала мытня.

— Штосьці вы маю машыну няўважліва праверылі, — звярнуўся Пятрусь да мытніка. — А я кантрабанду перавожу. Вось пад гэтай курткай дзесяць бутэлек гарэлкі.

— Жартаваць будзеш у морзе, — не паверыў мытнік і дазволіў Петрусю ехаць далей.

— Ды што гэта такое, — кінуўся кантрабандыст да памежніка. — Хачу сам здаць кантрабанду, а мытня не дазваляе. І вы таксама. Няўжо не бачыце, што ў мяне

з пашпартам нядобра, — і ён сунуў руку ў кішэнь, каб кіпцюром пашкодзіць пашпарт.

— Ты што, вар'ят? — вылупіўся памежнік. — Усё з тваім пашпартам у норме. Я сам правяраў. Едзь, давай і не затрымлівай чаргу.

Пятрусь не мог паверыць сваім вушам. Яго праганялі за мяжу. Але было яшчэ нешта. Кудысьці прапаў пашпарт. У кішэні яго не было. Няшчасны добраахвотны здавальнік кантрабанды пасунуў руку глыбей і ўпершыню агледзеў, што кішэнь падзёрты. А там, за падкладкай пінжака, ляжалі і пашпарт, і грошы.

Пятрусь сеў у машыну і зарагатаў як гіена. Як жа ён мог так напалохацца, не паверыць свайму лёсу. Яго зорка працягвае яму свяціць. Трэба хутчэй ехаць.

— Не спяшайся, — раптам пачуў ён суровы голас начальніка змены мытнікаў. — Гэта ты той жартаўнік, што кантрабанду хоча здаць. Праверце яго хлопцы.

На гэты раз „хлопцы" знайшлі ўсё. І гарэлку пад курткай, і цыгарэты ў дзверках, і грошы пад падкладкай. А праз месяц, па складзенаму мытняй пратаколу, лысы суддзя прызнаў факт спробы нелегальнага перавозу праз мяжу грошай ды іншых тавараў і пастанавіў іх сканфіскаваць на карысць дзяржавы. А таксама забраць машыну і даць няшчаснаму кантрабандысту вялікі штраф.

Пятрусь выйшаў з зала суда дыхаючы праз раз. Але на гэтым яго беды не скончыліся. На прыступках стаялі два брытагаловыя хлопцы. Па іх тварах было бачна, што ім усё адно, хто і колькі забраў у Петруся грошай. Ім быў патрэбны іх джып.

# Памылка шантажыста

Казімір Казлоўскі вяртаўся дахаты вельмі няўпэўненай хадой. Імпульсы аб правільных кроках, якія дасылалі нагам мазгі, скажаліся праходзячы страўнік, дзе асела не менш за літр выпітага алкаголю. Казік вельмі весела адзначыў з сябрамі павышэнне па службе і зараз, прыкрываючы плашчом бліскучыя міліцэйскія пагоны з новай зорачкай, якая сведчыла, што з гэтага дня ён старшы лейтэнант, спяшаўся схавацца ад вачэй начальства за ўтульнымі дзвярамі ўласнай кватэры. Там невыносныя папрокі жонкі і цешчы наконт яго апухлага ад гарэлкі твару ніяк не маглі паўплываць на службовае становішча. Казлоўскі ўжо дацягнуўся да доўгачаканага пад'езда і нават падняў правую нагу, каб пераступіць парог, як за плячамі пачуў спакойны, упэўнены, але не прадказваючы нічога добрага голас:

— Яшчэ адзін крок і ўсе непрыемнасці, якія можна нажыць на міліцэйскай службе незаконна прадаючы кантрабандыстам талоны на праезд мяжы без чаргі, зваляцца табе на галаву проста з неба! Таму іх можна будзе лічыць Боскай карай!

Старшы лейтэнант не рызыкнуў наклікаць на сябе такі нябесны праклён. Ён паставіў правую нагу назад,

крышку падумаў, паспрабаваў прыкінуцца цвярозым і павярнуўся тварам да ўладальніка голасу. Перад ім стаяў мужчына гадоў трыццаці. Казік мог бы пабажыцца, што ніколі раней яго не бачыў і зараз не хацеў бы бачыць, але перспектывы нейкай там страшнай кары не натхнялі яго на спыненне размовы.

— А цябе, я так мяркую, неба паслала мяне ўратаваць, — робячы выгляд, што затрымаўся толькі для таго, каб закурыць, сказаў афіцэр міліцыі. — І ты за свае паслугі хочаш атрымаць кампенсацыю на дарожныя расходы з нябёсаў.

— Адгадаў з першага разу, — пагадзіўся новы знаёмы. — Я нават і не здагадваўся, што ў міліцыю часамі прымаюць разумных людзей. А што, калі табе адразу даць мне тры тысячы долараў, і я знікну з твайго жыцця як знікаюць ранішнія зоркі, нават не тлумачачы чаму ты мне вінен?

— А што, калі я выклічу зараз сваіх калегаў і цябе, з упрыгожваннямі на руках, яны бясплатна завязуць проста ў пекла?

— Тупейшая думка. А спачатку ты мне здаваўся дастаткова інтэлектуальным чалавекам. Калі ты паспрабуеш рэалізаваць свой бязмозгі план, то трапіш у гэтае пекла сам, хутчэй чым твая тоўстая жонка паспее цябе разбудзіць. Лепш сядай на лаўку і памяркуем, ці справядліва пабудаванае наша грамадства.

Казлоўскі пагадзіўся. Ён стараўся не паказваць, што дыхаць стаў як карась на сушы. А яго новы знаёмы, зручна разваліўшыся на лаве, працягваў даводзіць неабходнасць сваёй нябеснай місіі.

— Працаваў я кантрабандыстам. Работа не самая лепшая, але пракарміць сваю сцярвозную жонку і нашых дзетак-гультаёў так-сяк атрымлівалася. Ды вось аднаго разу на маёй дарозе з'явіўся ты. Можа памятаеш. Ты пераправерыў маю машыну пасля мытнікаў, напісаў рапарт, што я вёз не тое і не туды, і мяжа

для мяне зачынілася як дзверы сусветнага банка для жабрака з Лацінскай Амерыкі. З тае пары я боўтаўся па горадзе як бясполы воўк-гермафрадыт, каб знайсці хоць нейкі заробак. Але высветлілася, што я нічога рабіць не ўмею. Такія людзі могуць хіба што быць карыснымі толькі ў міліцыі, і я пачаў сваё расследаванне. Я перапісаў нумары ўсіх машын, якія чамусьці ездзяць толькі ў тваю змену, і чамусьці ўсе праязджаюць мяжу без чаргі. Я нават сфатаграфаваў, як ты бярэш у кантрабандыстаў грошы за талоны, як дамаўляешся са знаёмымі мытнікамі і памежнікамі, каб не правяралі патрэбных табе людзей, як камбінуеш розныя афёры з замежнымі грамадзянамі. Гэта для мяне было шокам. Я згубіў веру ў праваабарончыя органы. А жыць без гэтай чыстай веры невыносна. І тады я вырашыў звярнуцца да твайго сумлення. Можа ты падзелішся са мной незаконным прыбыткам і такім чынам урэгулюеш сацыяльную справядлівасць. Я ж цябе не прасіў правяраць маю машыну. Сам залез, таму сам ва ўсім і вінаваты. І прашу я за сваю непасільную працу ўсяго тры тысячы долараў. Роўна столькі, колькі я мог зарабіць за гэты перыяд, каб ты не сунуў свой доўгі нос у багажнікі чужых машын. А як не, то пастараюся твайму начальству давесці, што я лепшы следчы за цябе, бо ты ў мяне знайшоў нашмат менш парушэнняў, чым я ў цябе.

Казік, не гаворачы ні слова, паляцеў дахаты з хуткасцю цунамі. Праз хвіліну вярнуўся, сунуў шантажысту ў кішэнь грошы і хапіў таго за грудзі.

— А цяпер паслухай мяне. Я даў табе колькі ты прасіў і нават трохі больш. Каб меў на таксі, якое будзе вазіць цябе па коле, далёка ад маёй хаты. А калі ты яшчэ раз прыйдзеш па грошы, то я заплачу. Але не табе, а тым хлопцам, якія тваю галаву пакруцяць тры разы па гадзіннікавай стрэлцы, а пасля назад. Будзеш выглядаць як жывы, але толькі выглядаць.

Седзячы ў хаце, Казлоўскі ўвесь час стараўся ўспомніць, калі ён затрымліваў гэтага кантрабандыста. Але не змог. А кантрабандыст паклаў грошы ў кішэнь, сеў у таксі і дастаў нейкую паперу. Зверху быў надпіс „Спіс прозвішчаў і хатнія адрасы міліцыянтаў, што працуюць на мяжы". Ён выкрасліў прозвішча Казлоўскі і стаў гаварыць сабе пад нос.

— Не, гэта не ён. Я зноў памыліўся. Ужо які раз. Але нічога. Буду працягваць шукаць таго гада, што маю машыну правяраў. Ужо не так шмат у спісе засталося неправераных.

# Мытныя жарты

Той, хто лічыць, што ў супрацоўнікаў мытні бракуе пачуцця гумару, ні халеры не разумее ні ў гумары, ні ў спецыфіцы працы людзей з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй, якім кожны дзень даводзіцца капацца ў чужых рэчах, каб знайсці там што-небудзь карыснае для сябе. Такая работа негатыўна ўздзейнічае не толькі на настрой кантрабандыста, у машыне якога мытнік знайшоў на тры бутэлькі гарэлкі менш, чым той схаваў (а тых бутэлек усё адно няма), але і на стрэсавы стан самога ахоўніка эканамічных інтарэсаў дзяржавы. Бо, гледзячы на такія аб’ёмы тавару, якія ўвозяцца і вывозяцца праз яго працоўнае месца, з кожным днём мацнее перакананне, што ўсе людзі па абодва бакі мяжы нашмат багацейшыя, паспяховейшыя і перспектыўнейшыя за яго.

Прыгнечаны настрой старшага інспектара Анатоля Куца ўзмацняўся яшчэ з-за двух фактараў. Па-першае, яго страўнік, ныркі, пячонка, сэрца і душа патрабавалі пасля ўдалага ўчарашняга вечара пахмелкі. А гэта катэгарычна не супадала з поглядамі кіраўніка змены. Наадварот. Той, убачыўшы ў вачах Куца агонь інтэлекту, які дапамагае знайсці спіртное нават у сейфе свайго шэфа, пільна сачыў за дзеяннямі падначаленага. Пасылаў таго

працаваць то на ўезд, то на выезд, абы не стаяў на адным месцы. Другі фактар быў больш празаічны і менш варты ўвагі. Уначы, падняўшыся папіць вады, Анатоль убачыў, як каханая жонка лазіць па кішэнях яго мундзіра ў пошуках непрапітага. Прычым яна рабіла гэта з такім спрытам, што інспектар мытні шчыра пазайздросціў настолькі адпрацаванаму майстэрству. У іх на працы наўрад ці хто, нават за доўгія гады службы, спрактыкаваўся да такога прафесіяналізму.

Карацей, стан мытніка набліжаўся да крытычнага. Ён нават не правяраў машын. Задаваў банальнае пытанне: „Што везяце?" і, не правяраючы, ці праўду на гэты раз сказалі падманшчыкі-кантрабандысты, ставіў пячатку ды прапускаў машыну за мяжу. Чакаў аднаго — калі скончыцца самая доўгая ў яго жыцці змена.

Так бы ўсё банальна і завяршылася б, каб не Васіль Бондар. Пра Васіля казалі — дохлага падмане. Дзе не возьме падманам — то нахабствам. А дзе забракуе праўды — аджартуецца. І калі ён пачуў нічога не азначаючае сумнае пытанне Куца: „Што везяце?", адказаў з яхідна-жартаўлівай усмешкай:

— Ды нічога забароненага. Вязу толькі зброю ды наркотыкі.

Інспектар усміхнуўся. Прапусціў Васіля без праверкі. І нават пажадаў таму ў думках поспехаў. Ці часта пачуеш такі трапны жарт. Але, калі праз гадзіны чатыры, вяртаючыся назад, Бондар на тое ж самае пытанне Куца даў той жа самы адказ — мытнік пачырванеў як жаба, якая замест мухі праглынула ката. „Ніколі кантрабандыст, які хоць трохі сябе паважае, не адмочыць аднаго і таго ж жарту таму самаму мытніку, — у роспачы падумаў Куц, — і ніколі мытнік, у якога ёсць гонар за сваю прафесію, не даруе такога нахабства".

— Ага! Кажаш зброю ды наркотыкі? Добра, што прызнаўся. Гэта змякчыць пакаранне, бо па гэтым артыкуле кара вымяраецца не гадамі, а дзесяткамі гадоў. Да-

вай, паказвай, дзе схаваў, — абапёрся аб машыну кантрабандыста інспектар.

— Ды вы што, жарту не зразумелі? — збялеў Бондар.

— Якія жарты, — павысіў голас Анатоль. — Мы не на зборышчы блазнаў. Мяжа не церпіць жартаў. Не хочаш аддаваць кантрабанду сам, то знойдзем без тваёй дапамогі. Гані машыну на яму.

Як Васіль не прасіў, нічога не дапамагло. Куц разабраў машыну на часткі. Павымаў сядушкі, параскручваў дзверкі, нават прымусіў разбартаваць запаску. Невядома што яшчэ прыдумаў бы зрабіць з той машынай, каб не закончылася змена.

— Ну што, — паглядзеў на гадзіннік мытнік. — Падмануў ты мяне. Ніякіх наркотыкаў ды зброі ў цябе няма. Збірай свой самакат і знікай з маіх вачэй.

— Я ж пажартаваў, — агрызнуўся пакрыўджаны Бондар.

— Я таксама, — задаволена ўсміхнуўся Куц. — Настрой у мяне сёння такі. На гумар цягне. Сумна было мне, вось і павесяліліся.

Ён павярнуўся, каб пайсці, і толькі тады заўважыў за сваімі плячамі начальніка змены. Валасы ў мытніка падняліся як шыпы марской міны.

— За перавышэнне паўнамоцтваў і здзек з грамадзяніна нашай краіны, ты звольнены з працы, — адрэзаў начальнік.

— Вы што, жартуеце, — паглядзеў Анатоль на шэфа, як галодны сабака на гаспадара, які корміць ката свежым мясам.

— Яшчэ не ведаю, — адказаў той. — Заўтра скажу больш дакладна ці гэта жарт. Пагляджу які ў мяне будзе настрой. Можа будзе цягнуць на гумар, а можа не.

# Камерцыйны сакрэт

— Язык твой — вораг твой, — зацягнуўшыся шопаўскай цыгарэтай, купленай у краме паміж межамі Беларусі і Польшчы, якую парушальнікі мытных заканадаўстваў адразу дзвюх, толькі што згаданых краінаў, ласкава называлі „Наша доля”, павучальна заявіў Лявон Кот. — Вось, прыкладам, я. Нікому і ніколі не расказваю на чым будую свой неверагодна патрэбны кожнаму аўтамабілісту бізнес. Тое, што ў Гродне на „фольксваген-гольф” самыя танныя запчасткі — мая заслуга. Вось у цябе машына таксама гэтай маркі. Дык каб не я, ты ўжо даўно пайшоў бы па свеце з торбай. Абанкруціўся б, рамантуючы свой гнілы самакат, як капіталіст Сава Марозаў, фінансуючы камуністаў. Вы ўсе мусіце мне за гэта ногі цалаваць.

— Каб ты мяне падключыў да сваёй справы, я б цябе яшчэ і за калена ўкусіў бы, — адгукнуўся ўжо добра падпіты Стасік Каяла. — Але ж ты, пазашлюбны сукін сын, нават лепшаму сябру не гаворыш, як табе ўдаецца. А колькі мы разам шляхоў прайшлі! Што толькі за мяжу не вазілі! Ад барысаўскіх запалак, якія можна даваць нават дзецям для забавы, бо яшчэ нікому іх запаліць не ўдавалася, да лепшых гатункаў самаробна-

га спірту, які запальваецца сам, дастаткова толькі адкаркаваць бутэльку.

— Што праўда, то праўда, — пагадзіўся Кот. — Але ж такія рэчы найперш ад сяброў і хаваюць, бо ні бізнесу не будзе, ні сяброўства. Як кажуць нашыя мясцовыя габрэі: „Божа, уратуй мяне ад сяброў. З ворагамі я сам як-небудзь спраўлюся".

Ад гэтай мудрасці Стасік прыйшоў у такое захапленне, што на нейкі час нават перастаў настойваць на раскрыцці камерцыйнага сакрэту. Хлопцы налілі яшчэ па кілішку цешчынай самагонкі, вытрымалі плячамі поўны нянавісці позірк Лявонавай жонкі і Каяла зноў узяўся за сваё.

— Слухай, Лявон. Я ж твой кум. Малодшага твайго хрысціў. А зараз гэты пачварак, ідучы са школы, заўсёды звяртаецца да мяне: „Дай, хросны, закурыць. Толькі бацьку не кажы. А то колы ў машыне папрабіваю". Я частую яго цыгарэтамі, а то сапраўды што з машынай зробіць. Моладзь жа цяпер такая. Ды і люблю я гэтага неданоска. Сына твайго. І ўсю тваю сям'ю. А табе непрыгожа багацець і назіраць, як радня галадае. Бяры мяне ў справу.

Кот, ад ахапіўшага пачуцця гонару за малодшага сына, адкінуўся на спінку крэсла, пусціў у столь некалькі колаў цыгарэтнага дыму і на хвіліну задумаўся. З аднаго боку раскрываць камерцыйны сакрэт — справе нашкодзіць. Але з іншага гледзішча рамантычная натура Лявона патрабавала прызнання. Як у тых паэтаў. Сумна, прыдумаўшы такую прыгожую камбінацыю, не пачуць хоць ад каго-небудзь уздыхаў захаплення.

— Добра. Табе скажу. Толькі ані-ні. Нікому ні слова. А ты за тое, што камерцыйны сакрэт даведаешся, будзеш цэлы месяц мяне слухацца і дапамагаць у дробных справах. Паглядзеў я як людзі ганяюць з Захаду старыя машыны і прадаюць іх на запчасткі. Справа добрая, каб не „растаможка". Колькі плаціць прыходзіцца толькі за

тое, што перацягнуў машыну праз мяжу. А яе ўсё адно рэгістраваць нідзе не трэба. Доўга я думаў, як абысці гэтыя інструкцыі і перахітрыць тых даўнаў, якія іх прыдумваюць. А гэта аказалася проста. Здымаю беларускія нумары са свайго „гольфа", купляю за бясцэнак на Захадзе якога дабітага лама, вешаю свае нумары і еду праз мяжу як на сваёй машыне. І ні якой „растаможкі". Нават за транзіт плаціць не трэба. А цяпер бяры інструмент, здымі з „гольфа" нумары, акуратна закруці іх у паперу і прынясі мне. Заўтра зноў еду па машыну.

Удзячны Стасік так і зрабіў. А Кот, прымацаваўшы нумары да нагі скотчам, зранку пасунуўся па новага „гольфа". Акруціўся хутка. Усё было як найлепей. Купіў у немца амаль задарма машыну, павесіў нумары і рушыў дахаты. Толькі як за плячамі зачыніўся шлагбаум, а перад носам вырасла заклапочаная постаць беларускага мытніка, Лявон зразумеў, што нешта не тое.

— Ваша машына? — спытаўся мытнік, уважліва вывучаючы дакументы.

— Мая. А што колер не такі — не звяртайце ўвагі. Я яе перафарбаваў, а ў дакументы забыўся ўнесці змены.

— Я ніколі не гляджу на колер, — сурова адгукнуўся чыноўнік у сінім мундзіры. — Я нумары заўсёды правяраю.

У гэты момант штосьці ўжо падказвала Кату, што яго наму бізнесу прыйшоў бясслаўны канец. Ён, абліваючыся як восеньская жаба халодным потам, куляй выскачыў з машыны, кінуў позірк на яе спераду і цяжка ўздыхнуў. З бампера яму весела ўсміхаліся нумары машыны яго кума Стасіка Каялы.

# Усходні вектар

— Ды задаўбалі гэтыя ляхі! Дзяруць з нас тры скуры. А мы ўжо і па адной не маем. То хабар ім валачы, то паі да паўсмерці. Колькі можна цярпець? — пераймаўся Алесь. — Не паспеў з адным расплаціцца, другі паўзе па грошы. Мы хто? Кантрабандысты ці мафіёзнікі? Ці ведаеце, хлопцы, чым адрозніваецца кантрабандыст ад мафіёзі?

Хлопцы толькі паціснулі плячамі. Ніхто дагэтуль нават і не спрабаваў задумацца пра такое філасофскае пытанне. Жыццё ёсць такое, якое ёсць. Стаіць на мяжы нейкі паўдурак у мундзіры і ты мусіш яму заплаціць, каб правезці лішнюю літроўку спірту. А мафіёзі ён, ці проста паднявольны, які дзеліцца сваім нелегальным прыбыткам з начальнікам, цябе, папраўдзе, мала цікавіць. Такое жыццё. Не падмажаш — не паедзеш. Каб нешта знайсці, трэба спачатку нешта кінуць наперад.

—А я вам растлумачу, чым адрозніваецца звычайны бандыт ад мафіёзі, — не супакойваўся Алесь. — Бандыты дзеюць самі па сабе. У іх ёсць свой кодэкс гонару і пэўныя абавязкі перад бандыцкай супольнасцю. І ўсё на гэтым. А мафіёзі — гэта бандыты, якія маюць падтрымку і ахову дзяржаўных структур. У іх

не толькі няма аніякага кодэксу гонару, але і гонару зусім. Для іх важным ёсць толькі загад зверху. І яны яго мусяць выканаць. Адным словам — бюракратыя. Вось і тут яе развялі. Беларускаму мытніку заплаці, польскаму заплаці, а сабе застаецца дуля. Пара мяняць вектар дзейнасці.

— А што ты прапаноўваеш? — нясмела спытаўся Васька. — Мы ж, кантрабандысты, таксама народ трошкі незаконнапаслухмяны. Мусім дзеіць у тых варунках, якія ёсць.

— Мы?! — абурыўся Алесь. — Ды мы эліта! У нас гонар — найвышэйшы закон. Мы можам парушаць што хочаш. І законы дзяржаўныя, і законы свету злачыннага, і нічым не пераймацца. Бо мы жывём па законах сумлення. Амаль па Бібліі. Робім людзям толькі тое, што сабе жадаем. Вось ты, адмовіўся б, калі хтосьці прадаў табе гарэлку танней, чым у краме?

Аргумент быў сапраўды пераканаўчы. Хто табе адмовіцца ад таннейшага. Ды і адчуць вартасць сваёй прафесіі каму не даспадобы. Але Васька не супакойваўся.

— І што ты прапаноўваеш? — дамагаўся ён. — Можа, каб не даваць хабар, нам пайсці працаваць у калгас? Растлумач людзям, пра што ты тут распінаешся цэлую гадзіну?

— І растлумачу, — упэўнена заявіў Алесь. — Хопіць нам хабар гэтым сабакам даваць. Пара мяняць вектар дзейнасці на ўсходні. Там мытняў няма. Вязі ў Расію ўсё, што хочаш. Асабліва там добра купляюць золата. Бярэм у Польшчы золата на ўсе грошы што ёсць і сам чорт нам не брат.

Перспектывы разбагацець на золаце зацікавілі ўсіх. Ды і сапраўды абрыдла хабар даваць палякам. Каб хоць усё па-чалавечы было. А то дзяруць з цябе грошы, ды яшчэ з такім выглядам, што ласку табе робяць. Аб'ядналі мы свае капіталы, ды гайда па золата для маскалёў.

На беластоцкім рынку золата было тады больш, чым ва ўсіх золатакапальнях свету. Ды і ніхто нікога не падманваў. На працягу дзевяностых гадоў дваццатага стагоддзя не зарэгістравана аніводнага выпадку, каб замест золата падсунулі штосьці іншае. Мы накуплялі ланцужкоў і бранзалетаў ды рушылі, паціраючы рукі ад мяркуемага прыбытку, у Маскву. Мытняў на ўсходняй мяжы Беларусі сапраўды не было. Але, як толькі мы ступілі на перон беларускага вакзала ў Маскве, адразу зразумелі — мытні ў Расіі паўсюль.

Першы міліцыянт, які нам трапіўся на шляху, адразу запатрабаваў грошы. Яго не цікавіла хто мы, адкуль мы і чаго прыехалі.

— Хочаце ў Маскву — плаціце, — бессаромна заявіў ён, гледзячы паверх нас бескаляровымі маргалкамі, над якімі ззяла кукарда з двухгаловым арлом.

Плаціць нам справа звыклая. Але, калі перавозячы кантрабанду ў Польшчу, мы плацілі найбольш два разы, раз беларускаму мытніку і раз польскаму, то Расія нам паказала цуды вымагальніцтва. Грошы з нас здзіралі ўсе, хто меў уладу. Часамі здавалася, што каб гандляваць у Маскве, трэба даць хабар усім яе жыхарам. А іх жа там дзесяць мільёнаў. На ўсіх, калі разабрацца, фізічна не прывязеш столькі золата. А як мы перасталі даваць хабар, тлумачачы, што ўжо заплацілі, нас арыштоўвалі, прывозілі ў пастарункі, білі і гаварылі толькі адно слова — „Деньги!”. І нават, калі мы ўрэшце прызналіся, што мы кантрабандысты, але ўсё ў нас ужо забралі, нейкі міліцэйскі начальнік заявіў:

— А мне ўсё адно. Будзьце хоць кантрабандысты, хоць тэрарысты. Спярша заплаціце, а пасля рабіце што хочаце. Мяне гэта ўжо не цікавіць.

Вярнуўшыся ў Беларусь без грошай і тавару, мы спыталіся ў Алеся:

— Ну як табе ўсходні вектар нашай дзейнасці?

Той не зразу адказаў. Задумаўся. А пасля падмаргнуў левым вокам ды рассмяяўся:

— Аблупілі, хлопцы, нас да ніткі. Няма чаго туды больш сунуцца. У Расіі ніколі не будзе кантрабандыстаў. І таму мне іх шкода. Кантрабандыст толькі тады кантрабандыст, калі ёсць мяжа ды мытня. А як няма адной мяжы, то іх тады мноства. Кожны міліцыянт робіць сваю. А дзе няма кантрабандыстаў — ёсць толькі тэрарысты.

# Сабачая доля

Дзень быў надзвычай халодны. Вецер сыпаў снегам у вочы, залазіў пад вопратку, прадзьмуваў аж да касцей. Лепш вайна, чым такое надвор’е. З прывакзальнай гродзенскай крамы з касмічна непрыгожай назвай „Спутнік” выйшаў мужчына. Без шапкі, без пальчатак, расхрыстаны. Здаецца, ён не заўважаў настырных здзекаў надвор’я над людзьмі. З кішэні даволі саліднай, дарагой, але ўжо добра заношанай курткі тырчала толькі што купленая бутэлька гарэлкі. Позірк у мужчыны быў да болю сумны, патухлы, як у алкаголіка, якому доктар-сваяк сказаў: „Будзеш піць — здохнеш!”.

Мужчына падышоў да прывакзальнага шапіка, купіў гарачую курыцу-грыль, адну аднаразовую шклянку і прысеў на лаўку непадалёк ад чыгуначнага вакзала.

— Як жыць далей?! — спытаў ён у самога сябе, наліў поўную шклянку гарэлкі і раздзёр пакет з курыцай. — Вось жа доля сабачая!

Ды не паспеў ён замоўкнуць, як з-пад лаўкі вылез худы галодны сабака. Выгляд у яго быў мала аптымістычнейшы чым у чалавека. Трасучыся ад холаду, сабака з надзеяй глянуў у вочы чалавеку. Іх позіркі пера-

сякліся і абодва зразумелі — сам лёс звёў іх сёння, каб не дай Бог не загінулі ад роспачы.

Чалавек узяў курыцу, сунуў яе цалком сабаку ў зубы, а сам, зморшчыўшыся, нібы ў шклянцы была серная кіслата, выпіў, нічым не закусваючы, гарэлку. Сабака зразумеў, што забіраць курыцу ніхто не будзе, адышоўся недзе трохі далей чым на метра паўтары і, павесялеўшы, стаў набіваць страўнік курацінай. А чалавек пасля трэцяга кілішка зноў загаварыў. Толькі на гэты раз з сабакам.

— Ну што, небарака, замерз? Шкада што ты не п'еш. Дапамагае. Ад усяго. І ад холаду таксама. Хоць гэта і не самая вялікая бяда — холад. Шкада, не ведаю як цябе клічуць. Мяне Міхась. Са Смаргоняў я. Ніколі не быў там? А дарма. Горад прыгожы. Прыязджай калі-небудзь. Эх, праблемы ў мяне, сабачка. Працую я кантрабандыстам. Ужо даўно. Як перастаў працаваць смаргонскі трактарны завод. Недзе ж трэба браць грошы. Напачатку цялячыя скуры ў Польшчу вазіў. Добра зарабляў. Ды раскусілі мяне мытнікі. Перайшоў на спірт. Таксама добра было. Ды вось нейкая паласа пайшла чорная. На літоўскай мяжы злавілі, усё забралі. Потым злавілі нашыя. Амаль усе грошы на штраф пайшлі. Вырашыў легальным бізнесам заняцца. Што, думаю, вечна мне цягацца і баяцца? Ці я сабака? Прабач, хвастаты. Заплаціў я за дазвол і ганяў машыны з-за мяжы. Падаткі плаціў. Але ў канцы года мне яшчэ нейкі падатак налічылі. Ды такі, што ў мяне вочы на лоб палезлі. Стаю, як скамянелы дыназаўр. Не магу ніяк уцяміць. Як гэта падатак можа быць у некалькі разоў большы не толькі за прыбытак, але і за ўсе ўкладзеныя ў справу грошы. Карацей кажучы — застаўся з нічым. А тут дзеці нечакана падраслі. Спінагрызы. Усё больш і больш патрабуюць. З сынам яшчэ не так складана. Ён кажа, каб купіў яму камп'ютэр і адчэпіцца ад мяне на паўгода. А з дзяўчатамі — бяда. Дзве ў мяне. На танцы хочуць

апрануцца прыгожа. Жонка душыць як вяроўка на карку. Кажа, што іншыя дзеці ўсё маюць, а мае — дулю з макам. Вось і круціся як хочаш.

Чалавек наліў сабе яшчэ кілішак. Выпіў. Сабака ўважліва сачыў за кожным яго рухам. Здавалася, што ён разумее ўсё сказанае Міхасём. І нават больш. Усе праблемы гэтага кантрабандыста: і цяжар ягонай працы, і неўладкаванасць у жыцці, і страх за будучыню дзяцей. І нават жудасную метамарфозу таямнічага пераўтварэння некалі прыгожай мілай дзяўчынкі ў сённяшнюю сцярвозную бурклівую жонку Міхася. А калісьці тая, каб выйсці замуж за сённяшняга кантрабандыста, кінула нават вучобу ў Мінску, раўла горкімі слязамі што карова, у каханні прысягалася сем разоў на дзень. Не давала Міхасю праходу, аж пакуль не дамаглася свайго. Затое мае зараз чым папракаць. Маўляў, Міхась змарнаваў яе маладосць і мары. Як падмянілі ўсё адно.

— Не было ў мяне выйсця, — працягваў свой сумны аповед чалавек. — Вырашыў зноў нелегальшчынай заняцца. Пазычыў грошы ў добрых людзей і ў Польшчу з кантрабандай. Ды зноў не пашанцавала. Як кажуць — дзе тонка, там і рвецца. Спачатку злавілі палякі. І прасіў я іх, і маліў, бяду сваю расказаў шчыра, як бацюшку на споведзі. Ды дзе там. Тавар забралі, ды яшчэ штраф далі. На рэшту, што засталася, купіў я ў Польшчы золата. Хоць штраф адраблю, думаю. Ды на нашай мяжы мытніца папалася — звер у спадніцы. Усё забрала. Я ёй пра свае праблемы расказваю, думаю, можа зразумее. А яна смяецца толькі. Кажа, што мае праблемы — гэта яе прэмія. Засудзілі мяне і ўсё забралі. Яшчэ мушу штраф плаціць ды пазыкі аддаваць. Як я ў Смаргоні прыеду? Што дзецям скажу?

Сабака, адчуўшы эмацыйны выбух, боль і роспач у голасе чалавека, кінуў есці і прытуліўся таму да ног. Чалавек хацеў пачасаць сабаку за вухам, але пачуў за плячамі афіцыёзны тон міліцэйскага загаду.

— Што, п’ем у публічным месцы? — у адзін голас закрычалі, выскачыўшыя як чорт з балота два міліцыянты. — Грамадзянін, ідзіце з намі. Такое беспакарана вам з рук не зыдзе.

— Хлопцы, праблемы ў мяне... — хацеў пачаць зноў свой аповед Міхась.

— Нас вашыя праблемы не цікавяць, — перабіў яго міліцыянт. — А не хочаце ісці добраахвотна — пойдзеце пад прымусам.

Міліцыянты ў імгненне закруцілі Міхасю рукі. Сабака хацеў бараніць свайго карміцеля. Нават забрахаў. Але, як дастаў нагой па мордзе і дубінай па галаве, лёг ля недаедзенай курыцы і сумна сачыў, як людзі валакуць некуды па снезе свайго двухногага брата. Цяпер ужо сабака нічога не разумеў у паводзінах людзей. „Сабачая ў таго чалавека доля” — падумаў бы ён, каб сабакі маглі думаць. А можа і могуць? Хто іх, сабакаў, ведае.

# Мара кантрабандыста

— Кажуць, што ў кантрабандыста слязу не выдушыш. А я вось аднойчы заплакаў, — распачаў свой аповед за куфлем лідскага піва Грышка Гурыловіч з Гродна. Вакол яго за столікам таннага бара сядзелі пераважна маладыя хлопцы, якія меркавалі, што парушэнне мытнага заканадаўства адразу дзвюх суседніх краін для іх справа часовая. Што жыццё іх хутка наладзіцца і будуць яны заможнымі і паважанымі людзьмі. Скуль яны маглі ведаць, што занятак кантрабанднай справай захапляе чалавека мацней і хутчэй, чым гарэлка савецкага калгасніка. Ды і спадзевы на тое, што ў жыцці нешта зменіцца — юнацкая наіўнасць не падмацаваная аніводным рэальным фактам. А Грышка сярод іх адчуваў сябе як ветэран вайны на піянерскім сходзе. Яму на п'яную галаву вельмі хацелася штосьці расказаць гэтым смаркатым навічкам, падзяліцца з імі чымсьці набалелым, сентыментальным.

— Былі, хлопцы, і такія часы, — задумліва апавядаў Гурыловіч, — калі ні кантрабандыстаў, ні бізнесоўцаў у нас не было зусім. Пры саветах нельга было ні багацець, ні мяжу перасякаць. Адкуль таму кантрабандысту ўзяцца. Нават дзяцей хрысціць забаранялася. І гэта

найбольш мяне абурала. Вось і пайшоў я тады на мітынгі. Бел-чырвона-белы сцяг захаваў да цяперашняга часу. Мяне ў палітычных колах тагачаснай апазіцыі вельмі паважалі. Але я больш паважаў уласную свабоду і аніякая палітычная кар’ера мяне не вабіла. Лезці з галавой у той асяродак, дзе людзей называюць электаратам — ніколі не збіраўся. Таму як перамаглі мы саветаў... І не трэба з мяне смяяцца як кажу „мы”, бо я быў на плошчах сярод тых, хто прымусіў камуністаў адчыніць дзеля вас, дурняў, межы. І гэтым бізнесоўчыкам, якія зараз ходзяць задраўшы нос так, што дуляй не дастанеш, мы прымусілі даць дазвол займацца іх бізнесовай справай. І шмат яшчэ чаго дамагліся, чаго вы, бесталковыя паўдуркі, не шануеце.

Ну дык вось. Як толькі з беларускіх грошай знік профіль Леніна, я кінуў палітычныя замарочкі і стаў думаць чым мне заняцца. Пастанавіў стаць чэсным, сумленным бізнесоўцам. І так я захапіўся гэтай ідэяй, што не мог спаць. Мая мара пра будучыню, дзе я — паважаны грамадзянін, які сваёй працай зрабіў сабе дабрабыт і, плацячы падаткі, забяспечыў нармальнае існаванне іншым, не давала мне спакою. Але дзе ўзяць першапачатковы капітал? Хоць маё фінансавае становішча было не такім безнадзейным як эканоміка Рэспублікі Беларусь, грошай, каб адчыніць якую сур’ёзную справу, усё адно не ставала.

Мяне не вабіў шлях былых сакратароў камсамола і парторгаў, якія адразу перафарбаваліся ў дэмакраты і, карыстаючыся былымі наменклатурнымі сувязямі, пачалі прыватызоўваць усё, што не паспелі схапіць іх камуністычныя кіраўнікі. Абдзерлі гэты народ яшчэ мацней, чым калі былі пры ўладзе. Я шукаў адносна чэсныя шляхі набыцця грошай. Каб нічога не красці, нікога не крыўдзіць. Так і стаў кантрабандыстам. Гэта сапраўды быў аптымальны варыянт. Мытнае заканадаўства тады, што ў Польшчы, што ў Беларусі, мя-

нялася хутчэй, чым ты мог яго прачытаць. Тое, што можна везці праз мяжу сёння, заўтра і ўчора забаранялася. А ў грамадстве закупку нечага там у нас і продажу яго за мяжой не асуджалася, нават каб ты гандляваў танкамі. Вольная трактоўка мытнага заканадаўства ў той час нават падабалася людзям. І як яго было трактаваць па-іншаму, калі так з ім абыходзілася сама дзяржава. То сёння нечага нельга ўвозіць, то заўтра гэта ж нельга вывозіць.

Карацей, пачалі з'яўляцца першыя грошы. Гэта яшчэ больш надавала мне сіл ды аптымізму. Я амаль не спаў. Працаваў дзень і ноч. А ў перапынках на адпачынак будаваў планы пра адкрыццё сваёй справы.

І вось аднаго дня я зразумеў, што мая мара набліжаецца да моманту рэалізацыі. Грошы на нейкі дробны бізнес ужо былі. І планы былі. Мяркую, з'езджу ў свой апошні кантрабандны паход і хопіць з мяне. Пачну займацца выплатай сваёй дзяржаве падаткаў.

Гэты дзень памятаю як сёння. Чаргі на мяжы не было, мытнікі ні да чога не чапляліся. Мяжу пераехаў надзвычай удала. Развітаўся з бел-чырвона-белым беларускім сцягам, які ў той час лунаў на мяжы, бо быў дзяржаўным, прывітаўся з бела-чырвоным польскім і паехаў прадаць тавар. І ўсяго два тыдні адсутнічаў. А тут столькі зменаў. Рэферэндум, палітычныя змаганні… Адным словам тое, ад чаго я адышоў, каб рабіць бізнес. І, вяртаючыся дахаты, на той жа мяжы ўбачыў, што ў нас ужо іншы дзяржаўны сцяг. Гэта значыць і іншы падыход да ўсяго. Зразумеў, што прыйдуць новыя-старыя выканаўцы дзяржаўнай палітыкі, якія будуць гуртаваць людзей вакол калгасаў і дзяржаўных прадпрыемстваў. А людзі ўсё жыццё будуць марыць уцячы адтуль, будучы пры гэтым там дастаткова шчаслівымі. І што будзе зусім іншы бізнес, дзе з маёй марай няма месца. Сеў я на капот машыны і заплакаў. Першы раз у жыцці. Заплакаў па сваёй мары.

— Сумны аповед у цябе атрымаўся, — заўважыў хтосьці з маладых, як Гурыловіч замоўк. — Пасля такога неяк не хочацца быць кантрабандыстам.

— А ты і не будзь. А то гэта на ўсё жыццё, — уздыхнуў Грышка, скіраваўшыся на выхад з невялічкага гродзенскага бара. Пасля павярнуўся да анямелай кампаніі і дадаў: — Прывыклі вы да вясёлых аповедаў ад мяне. А ў жыцці кантрабандыста здараюцца і сумныя гісторыі.

# Змест

Ад аўтара ... 5
Хабар для паліцыянтаў ... 7
Добры ўчынак ... 11
Гонар кантрабандыста ... 14
У кожнага свой хлеб ... 18
Вясёлая забава ... 21
Добры знаёмы ... 25
Стрэльба ці малітва? ... 28
„Калека” ... 31
Парабак ... 34
У памежнай пастцы ... 37
Правільны падыход ... 40
Ашуканцы ... 43
Браты-акрабаты ... 46
Рэкламная драма ... 49
„Ашчадны” Сяржук ... 52
Манія вялікасці ... 55
Добрыя немцы ... 58
Скупасць і зайздрасць ... 61
Як пан, то і прапаў ... 64
Сіла братэрства ... 67
Навуковец-гандляр ... 71

Каханне кантрабандыста ..... 74
Бельска-Падляшскія жарсці ..... 78
Майстэрства хабару ..... 81
Ратаўнік басейна ..... 85
Хто „падставіў” Косцю Крываноса ..... 88
Залаты цягнік ..... 92
Пятніца трынаццатага ..... 95
Сага пра сала ..... 98
Лідскія авантурнікі ..... 102
Парасончыкі для дурняў ..... 105
Жарты лёсу ..... 108
Памылка шантажыста ..... 111
Мытныя жарты ..... 115
Камерцыйны сакрэт ..... 118
Усходні вектар ..... 121
Сабачая доля ..... 125
Мара кантрабандыста ..... 129